ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 46 (2832) • Пятніца, 12 лістапада 1976 г. • Цана 8 кап.

Мінск, 7 лістапада 1976 года. Святочная дэманстрацыя.

Фота В. ВІТЧАНКІ і Ю. ІВАНОВА. (БЕЛТА).

УПЭЎНЕНЫМ ПОСТУПАМ

Свята Вялікага Кастрычніка сёлета прыйшло на нашу Зямлю ў знамянальны час — у год XXV з'езда КПСС, які стаў выдатнай падзеяй сусветнага значэння, важнейшай вяхой па шляху нашай Радзімы да камунізму. Пастаўленыя партыяй задачы камуністычнага будаўніцтва, барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва выклікалі велізарны ўздым палітычнай і працоўнай актыўнасці савецкіх людзей. Небывалы размах атрымала сацыялістычнае спаборніцтва за перавыкананне планавых заданняў, за ўсямернае павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і паляпшэнне якасці работы. Ажыццяўленне рашэнняў з'езда стала галоўным, вызначаючым у дзейнасці партыі і ўсяго савецкага народа.

Усё гэта з асаблівай сілай знайшло адлюстраванне ў рашэннях кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, яркай, глыбокай прамове Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта нашай партыі таварыша Л. І. Брэжнева на Пленуме.

Пад яе ўражаннем, з радасным, прыўзнятым настроем, з песнямі выйшлі ў святочны дзень 7 лістапада на вуліцы і плошчы сталіцы мінчане.

Урачыстая і прыгожая Цэнтральная плошча горада-героя Мінска. У глыбіні яе — вялікае маляўнічае пано: У. І. Ленін выступае з браневіка ля Фінляндскага вакзала. На абодвух баках пано лічбы: «1917» і «1976». На будынках, якія выходзяць на плошчу, — гербы СССР і брацкіх саюзных рэспублік. Палымнеюць словы: «Ленінскім курсам да камунізму», «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — ударную працу!». На фасадзе Палаца культуры Белсаўпрофа чырванеюць стужкі з адлюстраваннем двух ордэнаў Леніна, ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Дружбы народаў, якімі Радзіма адзначыла доблесную працу і ратны подзвіг беларускага народа.

Уздоўж цэнтральнага сквера — партрэты Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса і У. І. Леніна, кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.

Набліжаецца пачатак урачыстасцей. На цэнтральную трыбуну падымаюцца таварышы П. М. Машэраў, А. Н. Аксёнаў, Ц. Я. Кісялёў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. Ф. Міцкевіч, Я. П. Нікулкін, М. Н. Полазаў, І. Я. Палякоў, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў, У. Е. Лабанок, Н. Л. Сняжкова, І. Ф. Якушаў, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, ваеначальнікі, кіраўнікі партыйных і савецкіх арганізацый Мінскай вобласці і сталіцы рэспублікі.

На плошчу выязджае камандуючы войскамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі генерал-палкоўнік тан-

(Заканчэнне на стар. 2).

УПЭЎНЕНЫМ ПОСТУПАМ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1).

кавых войск М. М. Зайцаў. Прыняўшы рапарт камандуючага парадам—начальніка Мінскага гарнізона, першага намесніка камандуючага войскамі ЧБВА генерал-лейтэнанта танкавых войск А. І. Семірэнкі, ён пачынае аб'езд падраздзяленняў воінскіх часцей, якія выстраіліся на плошчы і навакольных вуліцах. Камандуючы віншуе воінаў са святам Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У адказ гучыць шматгалосае «Ура!»

Закончыўшы аб'езд войск, М. М. Зайцаў падымаецца на ўрадавую трыбуну і гаворыць прамову. Ад імя і па даручэнню Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і ўрада рэспублікі ён вітае і віншуе салдат, сержантаў, прапаршчыкаў, афіцэраў і генералаў, працоўных чатырыжды ардэнаноснай Савецкай Беларусі, жыхароў горада-героя Мінска з 59-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Расказаўшы аб поспехах працоўных рэспублікі ў выкананні заданняў першага года дзесятай пяцігодкі, аб тым велізарным палітычным уздыме, які панае ў войсках ЧБВА, камандуючы падкрэсліў, што воіны акругі ў адзіным баявым страі слаўных Узброеных Сіл нашай краіны будуць і надалей настойліва авалодваць зброяй і баявой тэхнікай, удасканальваць сваё воінскае майстэрства, павышаць баявую гатоўнасць.

Сваю прамову камандуючы заканчвае здравіцамі ў гонар 59-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, гераічнага савецкага народа і яго доблесных Узброеных Сіл, у гонар Камуністычнай партыі Савецкага Саюза—выпрабаванага авангарда савецкага народа, які будуе камунізм.

З краю ў край па плошчы перакатваецца магутнае «Ура!», зліваючыся з урачыстай мелодыяй гімнаў Савецкага Саюза і Беларускай ССР. Грымяць гарматныя залпы.

Пачынаецца парад войск Мінскага гарнізона. Каля трыбун, чаканячы крок, праходзяць воіны розных родаў войск. Вецер развявае чырвоныя сцягі. На многіх з іх — баявыя ордэны, якімі адзначана мужнасць салдат і афіцэраў, што ішлі ў бой пад гэтымі святынямі ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны.

З любоўю і захапленнем глядзяць мінчане і госці сталіцы Савецкай Беларусі на мужных воінаў, на магутную зброю, даверaную ім народам.

Пасля ваеннага парада пачынаецца святочная дэманстрацыя працоўных сталіцы Савецкай Беларусі. Па плошчы ідзе калона ветэранаў ленінскай партыі. Загартаваныя ў бітвах за ўладу Саветаў, за рэспубліку рабочых і сялян, яны заўсёды на пярэднім краі барацьбы за камунізм.

Яркай, маляўнічай калонай уступае на Цэнтральную плошчу калектыў аднаго са старэйшых у рэспубліцы прадпрыемстваў — завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Станкабудаўнікі ўсім сэрцам успрынялі словы таварыша Л. І. Брэжнева аб неабходнасці закончыць 1976 год па-ўдарнаму. За дзесяць месяцаў забяспечаны прырост выпуску станкоў на 11,7 працэнта, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам у саюзнай галіне.

Сярод тых, каму прадастаўлена права ісці ў першых радах дэманстрантаў,— і шматтысячны калектыў камвольнага камбіната. Камвольшчыкі справай адказваюць на адно з важнейшых патрабаванняў партыі — працаваць лепш, працаваць больш эфектыўна, з максімальнай аддачай.

З трыбун цёпла вітаюць прадстаўнікоў аднаго з перадавых калектываў сталіцы — вытворчага швейнага аб'яднання імя Крупскай. Тут умела выкарыстоўваюць рэзервы павелічэння ў гэтым пяцігоддзі выпуску тавараў народнага спажывання, робяць усё магчымае для рашучага паляпшэння якасці вырабаў, памятаючы словы таварыша Л. І. Брэжнева аб крайняй важнасці гэтага пытання як у сацыяльных, так і ў эканамічных адносінах. Прадпрыемства выпускае першагатунковай прадукцыі звыш 90 працэнтаў ад агульнага аб'ёму.

Аб працоўных поспехах, шырока разгорнутым сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі дакладваюць партыі, Радзіме калектывы станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава, мотавелазавода, заводаў халадзільнікаў, «Эталон», вытворчых аб'яднанняў «Гарызонт», «Камсамолка», «Камунарка».

Савецкія людзі цалкам і поўнасцю падтрымліваюць выпрацаваную XXV з'ездам КПСС праграму далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў. На шматлікіх лозунгах, транспарантах — палымяныя словы брацкага прывітання працоўным краін сацыялістычнай садружнасці, якія разам з савецкім народам ідуць у першых радах барацьбітоў за мір і сацыяльны прагрэс на зямлі.

На плошчу ўступае калектыў прыборабудаўнічага вытворча-тэхнічнага аб'яднання імя У. І. Леніна — адзін з правафланговых барацьбы за далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці работы. Па выніках мінулага квартала прыборабудаўнікі заваявалі другое прызавое месца ва ўсесаюзным спаборніцтве сярод прадпрыемстваў галіны. На чале спаборніцтва тут, як і ва ўсіх працоўных калектывах горада, ідуць камуністы. Яны паказваюць прыклад згуртаванасці і маналітнасці, творчых адносін да справы, прыклад дзяржаўнага падыходу да вырашэння вялікіх і малых задач на вытворчасці.

І зноў транспаранты, чырвоныя палотнішчы, на якіх словы баявых Кастрычніцкіх Заклікаў ЦК КПСС. Ідуць студэнты—будучыя інжынеры і ўрачы, педагогі і эканамісты, артысты і мастакі. У сценах ВНУ яны рыхтуюцца стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, актыўнымі ўдзельнікамі камуністычнага будаўніцтва.

Дастойны ўклад у поспехі мінчан у гонар 59-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ўнеслі флагманы беларускай прамысловасці—аўтамабільны і трактарны заводы. З першых дзён пяцігодкі аўтамабілебудаўнікі працуюць па-ўдарнаму. На прадпрыемстве асаблівая роля ў барацьбе за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, паляпшэнне якасці прадукцыі адводзіцца сацыялістычнаму спаборніцтву. Найбольшае пашырэнне сярод рабочых і служачых атрымала спаборніцтва па асабістых творчых планах, у якім удзельнічае каля 12 тысяч чалавек.

Над калонай рабочых і служачых Мінскага трактарнага завода імя У. І. Леніна — лозунгі, маляўнічыя пано, якія расказваюць аб выдатных дасягненнях калектыву. На першы план сваёй работы, як таго запатрабаваў кастрычніцкі Пленум ЦК КПСС, трактаразводцы ставілі і ставяць барацьбу за эфектыўнасць работы і якасць прадукцыі. У мнагалюдным калоне ідуць ветэраны працы, перадавікі вытворчасці — тыя, хто ўзначальвае барацьбу за выкананне высокіх сацыялістычных абавязацельстваў. Член ЦК КПСС, слесар-інструментальшчык, Герой Сацыялістычнай Працы Яўген Іванавіч Клімчанка, вярнуўшыся з кастрычніцкага Пленума ЦК нашай партыі, заклікаў усіх сваіх таварышаў зрабіць творчую, эфектыўную працу нормай кожнага рабочага. Сам ён вырашыў асабістую пяцігодку выканаць датэрмінова, за тры з палавінай гады. Заклік знатнага працаўніка знайшоў гарачы водгук. На прадпрыемстве ў радах правафланговых — цэлыя калектывы.

Прысутныя на трыбунах вітаюць калектыў Акадэміі навук БССР. Прыклады творчай садружнасці беларускіх вучоных з прамысловымі прадпрыемствамі наглядна пацвярджаюць словы Леаніда Ільіча Брэжнева аб тым, што навука становіцца сёння непасрэдная прадукцыйнай сілай грамадства. За дзесяць месяцаў гэтага года практычнае прымяненне знайшло вялікую колькасць распрацовак з эканамічным эфектам каля 30 мільёнаў рублёў.

Аб сваіх працоўных справах рапартуюць рабочыя і служачыя заводаў ацяпляльнага абсталявання, падшыпнікавага, маторнага, тонкасуконнага камбіната, скургалантарэйнай фабрыкі імя Куйбышава, чыгуначнікі і аўтамабілісты, будаўнікі і авіятары.

Маляўнічым і як заўсёды захапляючым было шэсце фізкультурнікаў нашай сталіцы, прадстаўнікоў спартыўных таварыстваў, чые выхаванцы прынеслі сусветную славу савецкаму спорту. Савецкія спартсмены горача дзякуюць Камуністычнай партыі за бацькоўскія клопаты аб развіцці масавага фізкультурнага руху.

Святочнае шэсце мінчан вылілася ў незабыўную хвалюючую дэманстрацыю любві і адданасці мінчан, усіх працоўных Беларусі Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду, іх гатоўнасці аддаць усе сілы барацьбе за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, за датэрміновае выкананне грандыёзных планаў пяцігодкі, за новыя поспехі будаўніцтва камунізму ў нашай краіне.

БЕЛТА.

ДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ АДКРЫЦЦЯЎ

Год XXV з'езда КПСС быў плённым для артыстаў тэатра імя Янкі Купалы. На суд гледача яны прадставілі пяць новых спектакляў. «Пратакол аднаго пасяджэння», «Эшалон», «Навальніца», «Святая прастата», «Гульня з кошкай», — гэтыя спектаклі атрымалі шырокае прызнанне. Дзесяткі вызных спектакляў і канцэртаў паказалі сёлета купалаўцы ў гарадах і вёсках рэспублікі, перадавалі радасць адкрыццяў тысячам людзей. Узмацнілася творчая садружнасць артыстаў тэатра з рабочымі Мінскага ордэнаў Леніна і Кастрычніцкай Рэвалюцыі трактарнага завода імя У. І. Леніна і працаўнікамі Маладзечанскага раёна.

Пра гэта ішла размова на справаздачна - выбарчым партыйным сходзе тэатра купалаўцаў. Дакладчык З. Браварская, а таксама С. Бірыла, В. Белахвосцік, П. Дубашынскі, Ю. Авяр'янаў, Л. Давідовіч, М. Яроменка, М. Захарэвіч, А. Рынковіч, Л. Рахленка, І. Міхалюга, якія выступілі ў спрэчках, гаварылі пра поспехі артыстаў тэатра за справаздачны перыяд, пра пошукі і знаходкі калектыву ў стварэнні вобраза нашага сучасніка. На сходзе выступілі намеснік міністра культуры БССР С. Пятровіч і інструктар Мінскага абкома КПБ П. Саковіч.

Прынята разгорнутая пастанова, вызначаны асноўныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Абраны новы склад партыйнага бюро тэатра. Яго сакратаром выбраны В. Белахвосцік, намеснікамі — С. Бірыла і П. Дубашынскі.

ЗАПРАШАЕ НЕСЦЕРКА

Ля ўваходу ў гэты не зусім звычайны музей стаіць скульптурная фігура Несцеркі, выразаная з дрэва. Народны герой як бы запрашае паглядзець тое, што вякамі стваралі беларускія ўмельцы. У залах музея народнай творчасці, які адкрыўся ў Бабруйску, сабраны старадаўнія самабытныя вырабы з дрэва, керамікі, саломкі, народнае ткацтва, тут жа прадстаўлена сучасная мэбля, зробленая ў старым беларускім стылі.

Свае лепшыя работы прыслалі ў Бабруйск вядомыя народныя ўмельцы В. І. Гаўрылюк з Брэста, К. Г. Арцеменка з Магілёва, М. М. Пушкар з Мазыра і іншыя. Усяго у залах прадстаўлена звыш двухсот экспанатаў.

Такі музей—першы ў Беларусі. Стварылі яго выкладчыкі, майстры і навучэнцы мастацкага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 15. Ён будзе добрым навучальным цэнтрам будучых майстроў народнай творчасці, якіх рыхтуе вучылішча.

КУЛЬТУРНАЯ ХРОНІКА

У ДОМЕ НАСТАЎНІКА

Адбыліся першыя заняткі педагогаў горада ў студыі выяўленчага мастацтва, якая адкрылася ў Мінскім Доме настаўніка. Тут створаны і працуюць дзве студыі, сем гурткоў, клуб аматараў драматычнага мастацтва, ідуць заняткі ў школе сучаснага бальнага танца, рыхтуе новую праграму хор настаўнікаў.

ДЛЯ ЮНЫХ ЛЕНІНЦАЎ

Адну з вуліц Наваполацка ўпрыгожыў будынак Палаца піянераў. На першыя заняткі юных гаспадароў запрасілі больш чым трыццаць гурткоў мастацкай і тэхнічнай творчасці, дзіцячая спартыўная школа, лялечны тэатр. Да паслуг піянераў — багатая бібліятэка.

На тэрыторыі палаца пабудавана цяпліца, дзе юнаты змогуць прымяняць на практыцы атрыманыя ў школе веды.

ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ

Самадзейныя артысты агітбрыгады Рагачоўскага раённага Дома культуры атрымалі права ўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе. За шырокую прапаганду рашэнняў XXV з'езда КПСС, удзел у камуністычным выхаванні працоўных і высокае выканаўчае майстэрства агітбрыгадзе прысвоена ганаровае званне — народная.

ЗВІНЯЦЬ ЦЫМБАЛЫ

У Ляхавіцкай музычнай школе адкрыты новы клас. У ім юныя таленты пазнаюць «сакрэты» ігры на цымбалах.

Педагогі школы ўдзяляюць вялікую ўвагу народным інструментам. У Навасёлкаўскім філіяле, дзе першыя крокі ў музыку робяць дзеці хлебаробаў калгаса «Новы шлях», паспяхова працуе клас домры. Ігры на нацыянальных інструментах вучаць і ў іншых філіялах Ляхавіцкай музычнай школы.

БЕЛТА.

ТАЛЕНТАЎ ЯРКІХ ШМАТКОЛЕРНАСЦЬ

ДА АДКРЫЦЦЯ ФЕСТЫВАЛЮ «БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ»

Па добрай традыцыі ў лістападзе на беларускую зямлю прыходзіць маляўнічае свята песні, танца і музыкі — Усесаюзны фестываль «Беларуская музычная восень». З 14 па 24 лістапада ў канцэртных залах сталіцы, у сельскіх клубах будуць гучаць мелодыі народаў нашай краіны, у цэхах заводаў і навуковых лабараторыях, на фермах і новабудоўлях адбудуцца творчыя сустрэчы майстроў мастацтваў з працоўнымі.

Аб праграме фестывалю і аб яго маршрутах карэспандэнт БЕЛТА Я. Гарэлік гутарыць са старшынёй аргкамітэта, міністрам культуры БССР Ю. М. МІХНЕВІЧАМ.

У ГЭТАГА свята кароткая, але багатая, яркая біяграфія. Дзве папярэднія сустрэчы з паўпрэдамі мастацтва з многіх саюзных рэспублік пакінулі добры след у памяці тысяч аматараў сімфанічнай і камернай музыкі, народнага танца і песні, опернага і балетнага мастацтва. Фестываль пацвердзіў свой аўтарытэт высокімі эстэтычнымі вынікамі, ён стаў сур'ёзнай творчай справаздачай майстроў мастацтваў краіны перад працаўнікамі Беларусі.

Кожны год у яго арбіту ўключаюцца ўсё новыя калектывы і выканаўцы з розных саюзных рэспублік, што дае магчымасць нашым слухачам і гледачам лепш пазнаць шматнацыянальнае савецкае мастацтва.

Сёлета ў рамках свята мы сустрэнемся з пасланцамі Расійскай Федэрацыі, Украіны, Узбекістана, Таджыкістана, Арменіі, Грузіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Масквы і Ленінграда, іншых культурных цэнтраў краіны. Дарогі фестывалю прывядуць іх практычна ва ўсе раёны рэспублікі, у самыя аддаленыя пасёлкі і вёскі.

Вызначаны шэфы большасці творчых калектываў, якія ўдзельнічаюць у свяце. Імі сталі Мінскі аўтамабільны і трактарны заводы, камвольны камбінат, аб'яднанні «Беларускалій», імя Крупскай і «Гарызонт», Брэсцкі электралямпавы завод, іншыя буйныя прадпрыемствы і гаспадаркі, БДУ імя У. І. Леніна.

— Пазнаёмце, калі ласка, з некаторымі ўдзельнікамі фестывалю.

— З задавальненнем. Тым больш, што творчая біяграфія кожнага з іх багатая значнымі дасягненнямі і знамянальнымі падзеямі. Аматараў сур'ёзнай музыкі чакаюць сустрэчы з праслаўленым Акадэмічным сімфанічным аркестрам Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі, які пакарыў сваім непаўторным мастацтвам публіку многіх зарубежных краін. Таленавітым музыкантам аднолькава ўдаецца выкананне складаных твораў рускай і сусветнай класікі, твораў выдатных савецкіх кампазітараў.

«Баян» — так у гонар старажытнарускага песняра-казачніка назвалі свой калектыў маскоўскія музыканты. Галоўнай сваёй мэтай яны лічаць прапаганду рускіх народных інструментаў, заха-

Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ СССР У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ 1976 ГОДА

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР, разгледзеўшы прапановы Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР, пастанаўляюць прысудзіць Дзяржаўныя прэміі СССР 1976 года:

1. **Аляксееву** Міхаілу Мікалаевічу, пісьменніку,—за раман «Ивушка неплакучая».

2. **Ахмедаву** Абдуле Рамазанавічу, заслужанаму архітэктару Туркменскай ССР, кіраўніку работы, **Сапараву** Сапару Нурмурадавічу, інжынеру-будаўніку, **Даніельянцу** Мушэгу Ішханавічу, заслужанаму будаўніку Туркменскай ССР, майстру комплекснай брыгады, — за архітэктуру будынка Туркменскай Дзяржаўнай бібліятэкі імя Карла Маркса ў г. Ашхабадзе.

3. **Бердзенішвілі** Мерабу Ісідаравічу, заслужанаму мастаку Грузінскай ССР,—за помнік у гонар 30-годдзя Перамогі Савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (г. Марнеулі).

4. **Буніну** Андрэю Уладзіміравічу, доктару мастацтвазнаўства, заслужанаму дзеячу навукі РСФСР, **Саварэнскай** Таццяне Фёдараўне, кандыдату архітэктуры, — за кнігу «Гісторыя горадабудаўнічага майстэрства».

5. **Гельману** Аляксандру Ісаакавічу, аўтару сцэнарыя, **Мікаэляну** Сяргею Герасімавічу, рэжысёру, **Чумаку** Уладзіміру Гаўрыілавічу, аператару, **Ляонаву** Яўгену Паўлавічу, народнаму артысту РСФСР, **Самойлаву** Уладзіміру Якаўлевічу, народнаму артысту РСФСР, **Ургант** Ніне Мікалаеўне, народнай артыстцы РСФСР — выканаўцам роляў,—за мастацкі фільм «Прэмія».

6. **Дунаеву** Уладзіміру Паўлавічу, **Зорыну** Валянціну Сяргеевічу, доктару гістарычных навук, заслужанаму работніку культуры РСФСР — аўтарам сцэнарыяў, **Лісаковічу** Віктару Пятровічу, рэжысёру, **Іванову** Анатолю Дзмітрыевічу, **Серабракову** Дзмітрыю Георгіевічу— аператарам, — за цыкл тэлевізійных дакументальных фільмаў «Праграма міру ў дзеянні»; **Калошыну** Анатолю Аляксандравічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў РСФСР, аўтару сцэнарыя і рэжысёру-аператару, **Кавалёву** Анатолю Гаўрылавічу, аўтару сцэнарыя, **Качаткову** Аляксандру Сцяпанавічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў РСФСР, **Мікошы** Уладзіславу Уладзіслававічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў РСФСР, **Сярову** Георгію Антонавічу—аператарам,—за дакументальны фільм «Цяжкія дарогі міру».

7. **Зульфіе** (Ісраілавай Зульфіе), народнаму паэту Узбекістана, — за кнігу вершаў «Радкі памяці» і цыкл «Вясёлка».

8. **Канчэлі** Гіе (Георгію) Аляксандравічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў Грузінскай ССР, кампазітару,—за сімфонію № 4 (памяці Мікеланджэла).

9. **Красаўскасу** Стасісу Альгірда, заслужанаму дзеячу мастацтваў Літоўскай ССР, мастаку, — за цыкл гравюр «Вечна жывыя».

10. **Кугульцінаву** Давыду Мікітавічу, народнаму паэту Калмыцкай АССР,—за кнігу вершаў «Покліч красавіка».

11. **Лазараву** Віктару Мікітавічу, доктару мастацтвазнаўства, члену-карэспандэнту Акадэміі навук СССР (пасмяротна),— за кнігі: «Візантыйскі жывапіс», «Старажытнарускія мазаікі і фрэскі», «Старыя італьянскія майстры», «Старыя еўрапейскія майстры».

12. **Малдабасанаву** Калыю, народнаму артысту Кіргізскай ССР, кампазітару і дырыжору, **Сарбагішаву** Урану, народнаму артысту Кіргізскай ССР, балетмайстру, **Чакоевай** Рэйне, народнай артыстцы Кіргізскай ССР, **Такамбаевай** Айсуле, заслужанай артыстцы Кіргізскай ССР — выканаўцам ролі Талганай,—за балет-араторыю «Мацярынскае поле» ў Кіргізскім Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета.

13. **Мурадзяну** Саркісу Мамбрэевічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў Армянскай ССР, мастаку,—за карціны: «Перад світаннем», «Пад мірным небам».

14. **Пятрову** Андрэю Паўлавічу, народнаму артысту РСФСР, кампазітару, **Касаткінай** Наталлі Дзмітрыеўне, заслужанай артыстцы РСФСР, **Васілеву** Уладзіміру Юдзічу—рэжысёрам-пастаноўшчыкам, **Тэмірканаву** Юрыю Хатуевічу, народнаму артысту РСФСР, дырыжору, **Мурыну** Аляксандру Рыгоравічу, народнаму артысту РСФСР, хормайстру, **Марозаву** Уладзіміру Міхайлавічу, народнаму артысту РСФСР, выканаўцу ролі Пятра Першага, — за оперу «Пётр Першы» ў Ленінградскім Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета імя С. М. Кірава.

15. **Хачатурану** Карэну Сурэнавічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў РСФСР, кампазітару, **Маёраву** Генрыху Аляксандравічу, балетмайстру, **Яроменку** Канстанціну Андрэевічу, дырыжору, **Касменку** Яўгену Уладзіміравічу, заслужанаму артысту Украінскай ССР, **Смаргачовай** Людміле Іванаўне, заслужанай артыстцы Украінскай ССР — выканаўцам роляў,—за балет «Чыпаліна» ў Кіеўскім Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета імя Т. Р. Шаўчэнкі (прэмія за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей).

16. **Хігруку** Фёдару Савельевічу, заслужанаму дзеячу мастацтваў РСФСР, рэжысёру-пастаноўшчыку, — за мультыплікацыйныя фільмы: «Фільм, фільм, фільм...», трылогію аб Віні-Пуху, «Востраў», «Дару табе зорку».

17. **Эміну** Геворгу Рыгоравічу, паэту,—за кнігу вершаў «Век. Зямля. Каханне».

18. **Эшпаю** Андрэю Якаўлевічу, народнаму артысту РСФСР, кампазітару,—за кантату «Ленін з намі» (на вершы У. Маякоўскага) і Другі канцэрт для фартэпіяна з аркестрам.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС
Л. БРЭЖНЕЎ

Старшыня Савета Міністраў СССР
А. КАСЫГІН

У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

АДРАСУЕЦЦА ЮНЫМ

У Доме літаратара адбыўся сход секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры, на які былі запрошаны драматургі, крытыкі, рэжысёры і акцёры тэатраў, прадстаўнікі Міністэрства культуры БССР, Міністэрства асветы БССР, работнікі Беларускага тэлебачання і радыё. З дакладам «Беларусная дзіцячая драматургія і яе выхаваўчая роля» выступіла кандыдат мастацтвазнаўства Т. Арлова. Яна гаварыла аб тым, што творчыя работнікі рэспублікі і, у прыватнасці, тэатр і драматургі закліканы больш актыўна вырашаць праблемы, звязаныя з выхаваннем юнага грамадзяніна Краіны Саветаў, дапамагаць яму заняць дастойнае месца ў радах будаўнікоў камунізму. Вось чаму так важна сёння плённае супрацоўніцтва беларускіх пісьменнікаў з тэатрамі рэспублікі. Можна нагадаць нямала станоўчых прыкладаў калі, напрыклад, на сцэне тэатра юнага гледача, тэатра лялек і іншых калектываў былі пастаўлены спектаклі для дзяцей і юнацтва па творах І. Шамякіна, А. Махнача, П. Макаля, А. Вярцінскага, Ул. Мехава, В. Віткі і іншых аўтараў. А стварэнне спектакля, як вядома, гэта перш за ўсё калектыўная творчасць драматурга і тэатра. Своеасаблівым штабам, творчай лабараторыяй, дзе ўдумліва і пастаянна працуюць з драматургамі, якія пішуць для дзяцей і падлеткаў, з'яўляецца ў нас тэатр юнага гледача.

Дакладчык і прамоўцы, што ўдзельнічалі ў абмеркаванні надзённага пытання, закраналі праблемы ўзаемаадносін драматурга з тэатрам, інсцэнізацыі лепшых твораў прозы і паэзіі, стварэння сучаснай казкі. Гаварылася пра неабходнасць аўтарам і тэатрам вывучаць патрабаванні юнай аўдыторыі, яе спецыфіку. Ішла гаворка пра пашырэнне рэпертуару тэатра юнага гледача і «дарослых» тэатраў з тым, каб мастацтва плённа выконвала ідэйна-выхаваўчую місію. У паняцце «дзіцячая сцэна» ўваходзяць і такія элементы, як перадачы для дзяцей па радыё і тэлебачанню, сувязі памiж прафесіянальнымі калектывамі і самадзейнымі гурткамі. І тут аналіз становішча абапіраўся на канкрэтныя прыклады.

У абмеркаванні даклада ўдзельнічалі прадстаўнікі радыё і тэлебачання А. Чарнушэвіч і А. Мацюкевіч, пісьменнікі А. Вольскі, В. Вітка, А. Махнач, Э. Агняцвет, К. Губарэвіч, А. Васілевіч, П. Кавалёў, заслужаны артыст БССР А. Ляляўскі і настаўнік школы № 29 Мінска У. Кірзнер.

Падсумаваў гаворку намеснік міністра культуры БССР С. Пятровіч і сакратар праўлення СП БССР Б. Сачанка.

ГОСЦІ З ГДР

У сувязі з выстаўкай дзіцячай кнігі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў Мінску Беларусь наведалі нямецкія пісьменнікі Гізела Карау і лаўрэат Нацыянальнай прэміі Герхард Хардэль.

Госці азнаёміліся з выдатнасцямі беларускай сталіцы, выступілі перад школьнікамі ў Палацы піянераў.

У Саюзе пісьменнікаў рэспублікі нямецкія сябры мелі гутарку, у якой прынялі ўдзел старшыня праўлення СП БССР М. Танк, сакратары А. Вярцінскі, Б. Сачанка, адказны сакратар Ул. Лінскі, пісьменнікі Э. Агняцвет, В. Вітка, А. Гардзіцкі, П. Макаль, А. Рыбак, Я. Семяжон.

Мінск наведаў таксама і быў прыняты ў СП БССР пісьменнік з ГДР Бенно Плундра.

Г. ЛЕСІК.

ПРЭМ'ЕРЫ СЕЗОНА

Спектаклем «...Забыць Герастрата!» па п'есе Г. Горына адкрыў свой дваццаць трэці сезон Гомельскі абласны драматычны тэатр.

Бліжэйшая прэм'ера калектыву — «Энергічныя людзі» В. Шукшына, завяршаецца таксама работа над пастаноўкай п'есы швейцарскага пісьменніка і драматурга Ф. Дзюрэнмата «Суддзя і яго кат».

Калектыў пачаў падрыхтоўку да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Юбілею прысвячаюцца дзве новыя работы — спектакль «Меч і крыж» па п'есе ўкраінскага пісьменніка М. Стадніка і інсцэніроўка трэцяй часткі рамана «Людзі на балоце» народнага пісьменніка БССР І. Мележа.

ванне багатых музычных традыцый народа. Рускі камерны аркестр «Баян» — лаўрэат Міжнароднага конкурсу, ён з поспехам выступаў у многіх гарадах краіны і за рубяжом.

Багаты паслужны спіс у камернага аркестра дзяржаўнай філармоніі Латвійскай ССР. Ён пабываў у гарадах і вёсках усіх саюзных рэспублік, удзельнічаў у многіх буйных міжнародных музычных фестывалях і конкурсах.

Можна сказаць шмат цёплых слоў аб квартэце імя М. Глінкі — лаўрэаце міжнароднага конкурсу, адным з вядучых камерных калектываў краіны.

Харавое мастацтва на фестывалі прадстаўляюць такія выдатныя калектывы, як Акадэмічны рускі хор Саюза ССР пад кіраўніцтвам Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР прафесара А. В. Свешнікава, Дзяржаўны паўночны рускі народны хор. Высокая выканаўчая культура, самабытнасць, вельмі багаты рэпертуар здабылі гэтым калектывам добрую славу далёка за межамі нашай краіны. Створаны ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны Рускі хор Саюза ССР прайшоў цікавы творчы шлях — ад выканання папулярных песень да складаных твораў класікі.

Паўночны рускі народны хор, які адзначыў у гэтым годзе свае саракагоддзе, пераможца многіх фестываляў і агляду. Самабытнасць, непаўторнасць яго мастацтва, нацыянальны каларыт здабылі яму прызнанне і любоў шырокай глядзельнай аўдыторыі.

З далёкага Ташкента да нас прыязджае Заслужаны ансамбль народнага танца Узбекістана «Бахор». Маляўнічай мовай танца дзяўчаты расказваюць аб багацці ўзбекскай зямлі, аб таленце і працавітасці яе народа. Кіруе калектывам праслаўленая танцоўшчыца, народная артыстка СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР М. Тургунбаева.

Вельмі цікавы самабытны вакальна - харэаграфічны ансамбль рубабістак з Таджыкістана. Цікава, што сярод першых твораў, уключаных у пачатковы рэпертуар калектыву больш чым трыццаць гадоў таму назад, была папулярная беларуская песня «Бывайце здаровы». Цяпер праграма выступленняў ансамбля ўключае сольныя, вакальныя, танцавальныя і інструментальныя нумары, дуэты, шматгалосыя хоры і танцавальныя сюіты.

Цяперашні фестываль знамянальны ўдзелам у ім многіх выдатных выканаўцаў. Вакалісты — народныя артысты СССР Е. Серкебаеў і Л. Іманаў, народныя артысты рэспублік К. Сартбаева, Э. Канява, Н. Тугушы, С. Данілюк, інструменталісты — лаўрэаты міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў — А. Слабадзянік, Е. Навіцкая, А. Крамараў, К. Геаргіян, Б. Васіляўскас і іншыя выступяць у дзесятках гарадоў і вёсак рэспублікі.

— Чым парадуе «Беларуская музычная восень» аматараў эстрады?

— Удзелам у ёй раду цікавых калектываў і выканаўцаў. З Ташкента да нас прыязджае вакальна - інструментальны ансамбль «Яла», аснову творчасці якога складаюць узбекскія народныя мелодыі ў арыгінальнай эстраднай апрацоўцы. Зноў сустрэнуцца нашы слухачы з ансамблем «Вана Тоамас» а Таліна і «Смерычкай» з Чарнавіц, якія прымалі ўдзел у папярэдніх фестывалях.

Ленінградскі вакальна-інструментальны ансамбль «Мелодыя» вось ужо больш чым дваццаць гадоў з нязменным поспехам выступае на сцэне. Яго творчая біяграфія складвалася пад дабратворным уплывам лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага артыста СССР, кампазітара В. Салаўёва-Сядога. Калектыў быў першым выканаўцам многіх яго твораў.

У канцэртах фестывалю выступяць таксама такія майстры эстрады, як народны артыст РСФСР Э. Хіль, заслужаныя артысты рэспублік І. Кабзон і М. Кадрану.

— Некалькі слоў аб удзеле ў фестывалі беларускіх майстроў мастацтва...

— Як заўсёды, ён будзе вельмі прадстаўнічым. Цікавыя праграмы падрыхтавалі Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і Мінскі камерны аркестр, Акадэмічная харавая капэла і Дзяржаўны народны хор рэспублікі, народны аркестр БССР імя І. Жыновіча, ансамбль танца БССР, папулярныя ансамблі «Песняры», «Харошкі», «Чараўніцы».

У канцэртах выступяць салісты — лаўрэат міжнароднага конкурсу А. Дзедзік, заслужаныя артысткі БССР Н. Багуслаўская і В. Шутава, лаўрэаты міжнародных конкурсаў піяніст В. Шацкі і скрыпач Р. Нодэль.

— Якія асаблівасці, што адрозніваюць сёлетняе свята ад папярэдніх, вы маглі б выдзеліць?

— Першае і галоўнае — гэта тое, што яно прысвячаецца 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Гэта надае яму асаблівую значнасць і накладвае на ўдзельнікаў вялікую адказнасць за змест і якасць выступленняў.

Другая важная асаблівасць фестывалю — актыўны ўдзел у ім многіх зарубежных калектываў і выканаўцаў. З Парыжа да нас прыязджае французскі камерны аркестр, з Познані — папулярны польскі дзіцячы калектыў — хор хлопчыкаў «Шпакі». Польскую эстраду будзе прадстаўляць вядомы спявак Чэслаў Немен, а югаслаўскую — маладзёжны ансамбль «Код».

Па колькасці ўдзельнікаў і маштабах намячаемых мерапрыемстваў цяперашні фестываль — самы прадстаўнічы. Яго праграма прадугледжвае правядзенне 350 канцэртаў і творчых сустрэч, у якіх будуць заняты звыш паўтары тысячы майстроў мастацтва.

Упершыню ў гэтым годзе ўстаноўлены памятныя прызы розных устаноў і арганізацый за лепшую праграму песеннага і танцавальнага мастацтва, лепшую сімфанічную, камерную або эстрадную праграму, лепшую новую камсамольскую песню і іншыя.

Мы верым, сказаў у заключэнне Ю. М. Міхневіч, што маршруты фестывалю зноў стануць дарогамі дружбы і брацтва савецкіх народаў, што ён стане яшчэ адной яркай старонкай у летапісу савецкага шматнацыянальнага мастацтва.

БЕЛТА.

ЗЯМНОГА НЕПАКОЮ АБУДЖЭННЕ

МНЕ здавалася, што добра ведаю і гэтага цудоўнага чалавека, і яго паэзію. Але перачытаў кнігі «Росы на коласе», «Прага крыла» і адчуў, што ў нечым памыляўся, бо сапраўдны талент пры кожнай новай сустрэчы раскрываецца нейкай іншай, раней не заўважанай гранню.

М. Лужанін — паэт надзвычай сучасны. І гэта заўважаецца не толькі па тым, што ён вельмі ўважлівы да надзённых пытанняў нашай рэчаіснасці. Паняцце сучаснасці тут больш шырокага, больш унутранага плана. Сучаснасць М. Лужаніна — гэта актыўная пазіцыя пісьменніка-камуніста, грамадзяніна, які, гаворачы словамі Р. Гамзатава, адказны за ўвесь свет.

Пра што б ён ні пісаў — пра родную Беларусь, ці пра далёкую Амерыку, дзе «б'ецца ў бераг пенная затока горам перасоленай вады», і «слаўны горад Вашынгтон, жыць — жыве, а болей дрэмле», а «надгробкі прэзідэнтаў зліваюцца ў адну прамую рысу...», ён заўсёды выступае чалавекам цвёрдых ідэйных перакананняў і адкрытага сэрца.

Паэт смела паглыбляецца ў самую сутнасць жыццёвых з'яў, яго вершы, асабліва з цыкла «Няблізкая вандроўка», гэта сапраўдныя ўзоры грамадзянскай, публіцыстычнай лірыкі. Кожны верш насычан роздумам, глыбокай развагай, імкненнем прыгледзецца да тамашніх параддкаў, спасцігнуць заканамернасць усёй той капіталістычнай мітусні, калі «равуць пажарныя сірэны, трывожаць ноч па сто разоў», калі «наўкол шумяць людскія штормы, людскія хвалі б'юць наўкруг», калі «за чубы хапаюцца як след». Тут нельга не пагадзіцца з Ул. Гніламёдавым, які ў «Полымі» (№ 4, 1974) пісаў: «Гэта, бясспрэчна, адзін з самых лірычных рэпартажаў, прывезеных нашымі паэтамі з-за мяжы».

Перабольшвання тут няма. Вершы, напісаныя за мяжой, — гэта боль сэрца, споведзь душы. У двух—трох радках — цэлая карціна, цэлая дзея. Калі б вершам прысуджалі Знак якасці, думаю, што «Замест прамовы» быў бы ўдастоен яго адразу.

Адзіны ёсць зямны ўладыка,
Каго шаную, не таю,
Ён—гэта мой народ вялікі,
Яму служу, яго пяю.

М. Лужанін з тых паэтаў, хто пра вядомае, традыцыйнае можа заўсёды сказаць пасвойму, хораша і непаўторна.

Так, шмат напісана вершаў пра Янку Купалу. І ўсё ж Купаліяна будзе няпоўнай, калі не нагадаць лужанінскі цыкл «Па дарогах Купалы».

Поруч быў, а стаў, мае сябры,
Звонкай песняй, грозной
бліскавіцай,
Белым параходам на Дняпры,
Самай спеўнай вуліцай сталіцы.
Станьце ў ратны шэраг,
песняры!

Пад гэтым апошнім у падборцы пяцірадкоўем дата: 1962—1968. За гэтыя гады паэт прысвяціў Купалу восем вершаў. Калі ўлічыць яго ашчаднасць да слова, гэта нямала.

Цыкл успрымаецца як кампазіцыйна разгорнуты, напісаны памяццю сэрца, гімн вялікаму сыну беларускай зямлі.

Натхнёна гучыць у творчасці М. Лужаніна антываенная тэма. Да дзённіка «Праз вайну» патрэбна дадаць паэму «Матчын дом», у якой аўтар умела уплятае ў тканіну твора фальклорныя матывы.

Радуе, што талент паэта раскрыўся яшчэ адной істотнай рысай. Паэма з усмешкай, як яе называе аўтар, «Сілівонавы прыгоды» захапляе гумарам: то па-народнаму дасціпным, лагодным, то, як лязо брытвы, вострым, з'едлівым.

За кожнай страфой лужанінскіх вершаў б'ецца гарачае сэрца паэта-публіцыста, чалавека неспакойнага па характару, чалавека-грамадзяніна, якому ніштo не чужое на зямлі. Таму так хораша і замілавана захапляецца ён роднымі краявідамі, таму так хочацца яму любоў гэтую перадаць іншым.

Паэт прызнаецца: «Маё за мяне не дапіша ніхто». Гэта не поза, а разуменне сваіх магчымасцей і ў той жа час упэўненасць, што слова тваё чакаюць.

Хочацца верыць, што праз некаторы час я зноў вазьму са сваёй кніжнай паліцы зборнікі вершаў «Росы на коласе» і «Прага крыла». Вазьму, каб напісаць на іх тытульных лістах словы: «Прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР». Яны заслугоўваюць такой высокай адзнакі.

Уладзімір КОБРЫН,
загадчык аддзела народнай адукацыі і культуры газеты «Мінская праўда».

М. Лужанін. Росы на коласе. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

Прага крыла. Паэзія. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1974.

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА КНІГІ Максіма ЛУЖАНІНА «РОСЫ НА КОЛАСЕ» І «ПРАГА КРЫЛА»

Ул. Гніламёдаў. «Шматграннасць». «Дружба народов», 1974, № 10.

Ул. Гніламёдаў. «Шматграннасць». «Полымя», 1974, № 4.

М. Лазарук. «І крыла дужэе ўзмах...». «Літаратура і мастацтва», 1974, 20 снежня.

А. Марціновіч. «З вышыні неспакойнага веку». «Мінская праўда», 1974, 8 сакавіка.

Р. Яўсееў. «Кожнаму слову іспыт!...» «Беларусь», 1975, № 4.

ЭКЗАМЕН

ПЕРШЫ зборнік апавяданняў Генрыха Далідовіча «Дажджы над вёскай» быў прыхільна сустрэты і высока ацэнены і чытачамі, і крытыкай. Што гэты поспех не быў выпадковым, яскрава сведчыць другая кніга «Цяпло па першацвет», у якой прысутнічае ўсё лепшае, што было ў папярэдняй. Гэта і вострае адчуванне сучаснасці, і глыбокі роздум над яе надзённымі праблемамі, і здольнасць аўтара пранікнуць у душу сваіх герояў, і яго ўменне ўзяць з народнай моўнай і ў творы. Гэта правільна, што Я. Колас, як адзначае М. Лазарук, паэтызаваў працу настаўніка. Але ж гэта не перашкаджала яму таксама бачыць у асяроддзі настаўніцтва і людзей тыпу Саханюка. І хіба Павел Мікалаевіч не з'яўляецца нашчадкам Андрэя Лабановіча? Нездарма ж ён перад пачаткам свайго настаўніцкага шляху перачытвае трылогію «На ростанях». Ён загадзя рыхтуецца надоўга захоўваць у сваёй душы агонь прафесіянальнага і грамадзянскага гарэння.

Праўда, і ён перажыў нямала сумненняў і расчаравання. Найперш прыйшлося перадольваць адчуванне закінутасці, якое ахапіла яго, калі ён пасля сталіцы апынуўся ў глыбінай вёсцы. Нямала збянтэжыла Паўла Мікалаевіча і нежаданне часткі яго выхаванцаў вучыцца, адзнакі непавагі некаторых бацькоў да настаўніка.

Усё гэта магло адштурхнуць ад педагагічнай працы, як некаторых слабавольных маладых людзей. Аднак такога не здарылася з Паўлам Мікалаевічам. Ён праявіў самаадданасць і самаахвярнасць, якія, на думку яго старэйшага калегі Алеся Трахімавіча, так патрэбны маладому педагогу. Гарачае жаданне прывіць вучням цікавасць да свайго прадмета, імкненне разабрацца ў актуальных праблемах школы, арганічнае непрыняцце паказухі, што асабліва выявілася ў паводзінах героя ў час праверкі школы — і дало яму магчымасць абараніць дыплом «на смеласць, сумленнасць, цярплівасць, настойлівасць».

Праўдзіва расказаў герой аб сваім асабістым жыцці, у прыватнасці, аб сваіх узаемаадносінах з маладой настаўніцай Ларысай.

скарбніцы найбольш важкае і вобразнае слова.

Асаблівай увагі заслугоўвае аповесць «Усё яшчэ наперадзе». Апавяданне ў ёй вядзецца ад імя галоўнага героя, маладога настаўніка Паўла Мікалаевіча, І трэба сказаць, што гэта — вельмі шчырая споведзь, у якой праўдзіва расказана пра першыя месяцы працы ў сельскай васьмігодцы.

Мы лічым, што М. Лазарук у артыкуле «Школа, літаратура, пісьменнік» («Полымя, 1976, № 5) дарэмна папракае Г. Далідовіча (побач з іншымі маладымі аўтарамі) у нібыта прыземленым, празаічным паказе настаўніцкага жыцця, у тэндэнцыі «здрабнення» фігуры настаўніка. Наадварот, найбольшую вартасць аповесці мы бачым у тым, што пісьменнік паставіў свайго героя ў рэальныя жыццёвыя ўмовы, сутыкнуў яго з рэальнымі людзьмі, сярод якіх ёсць і далёка не ідэальныя, накшталт дырэктара Івана Сямёнавіча, завуча Міхася Рыгоравіча, або настаўніка Уладзіміра Пятровіча, які цынічна кпіць з гарачага імкнення працаваць сумленна...

Усё гэта, на жаль, ёсць у жыцці, і таму не можа не быць

Г. Далідовіч. Цяпло на першацвет. Аповесці і апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976.

СЛОВА ПРА МАЛОДШАГА ТАВАРЫША

КРОК НОВЫ, УПЭЎНЕНЫ

Нядаўна выйшла з друку кніжка апавяданняў Аляксандра Паскробышава «Жывы пярсцёнак». Гэта ўжо трэці зборнік маладога пісьменніка. Як і папярэднія, ён напісаны для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Жыве аўтар каля прыгожага возера Нарач, працуе ў санаторыі. Яго ўжо ведаюць сотні адпачываючых як цудоўнага масажыста, а многія школьнікі — як цікавага апавядальніка. Піша ён шчыра і проста, з вялікай любоўю да людзей і прыроды, з веданнем жыцця і псіхалогіі дзяцей.

Апісанне прыроды ў яго кароткае, лаканічнае, выразнае: «Возера. Слаўкава возера, самае што ні ёсць лепшае ў свеце: то бурлівае — зранку, то соннае — увечары». А як хораша раскрыта душа малога хлопчыка Слаўкі, які прыціскае да грудзей зняможаную птушку, што ляцела з выраю і ўпала ў чаротнік. «Зараз качка ў дзедавых руках — уявіў сабе Слаўка. І сам быццам адчуў, як спуджана калоціцца стомленае сэрцайка птушкі».

Такая ж любоў да жывога праяўляецца ў апавяданні «Як Слаўка ратаваў верабейчыка». Птушанё ўпала з-пад застрэшка ў карыта з вадою, і ўздрыгвала мокрым цельцам. «Нічога, зараз я цябе пасаджу ў гняздо», супакойваў Слаўка шэры жывы камячок».

З тактам, з педагагічным падыходам умее аўтар пажартаваць. Вароны ўкралі стары дзядзькаў капялюш, паклалі яго ў комін і звілі ў ім гняздо. Калі ж дзядзька Цімох знаходзіць сваю згубу ў коміне, дык не грозіць качаргою крыклівым птушкам, а просіць Слаўку прыладзіць дзе-небудзь між галін стары капялюш, каб у ім гняздзіліся вароны.

У апавяданні «Падвёў шызы» апісаны выпадак, калі дзеці, зганяючы з застрэшка галубка, разбілі шыбу ў акне, як яны хаваліся ў крапіве, апякліся і ўрэшце зменшылі сваю віну прызнаннем дзядзьку Хведару, што яны незнарок разбілі шкло.

Павага да старых паказана ў апавяданні «Яблыкі пад грузавіком», абарона сябра — «Як Слаўка казла ўтаймаваў», а апавяданне «Звычайны выпадак» вучыць любіць і берагчы грамадскае дабро.

Малодшыя школьнікі адкрыюць для сябе шмат невядомага. Многія, як і Слаўка, зробяць на сваёй палічцы невялічкі музейчык, разложаць там розныя шышкі. Яны даведаюцца, што яшчарка зімою згортваецца ў пярсцёнак і засынае, а ў цяпле вясною зноў робіцца шустрай, імклівай і пацешнай («Жывы пярсцёнак»).

Хочацца нагадаць А. Паскробышаву, што ён узяўся за нялёгкую працу. Літаратура для дзяцей вымагае ад аўтара пастаннай вучобы, працы над сабою, неразрыўнага кантакту са сваімі чытачамі, вялікай працы над мастацкім словам.

Кніжка «Жывы пярсцёнак» — смелы і ўдалы крок наперад маладога пісьменніка, чалавека цяжкага лёсу. Ён у маленстве страціў зрок. Цяпер піша на машынцы, не можа сам чытаць і таму яму неабходна няспынная дапамога.

Ул. Караткевіч па-сяброўску падтрымаў А. Паскробышава і на грамадскіх пачатках адрэдагаваў яго кніжку. Прыемна, што і іншыя літаратары падтрымліваюць сувязь з маладым аўтарам, дапамагаюць яму ў нялёгкай працы.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ.

У «БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ»

Серыя «Бібліятэка беларускай паэзіі», якую выпускае выдавецтва «Мастацкая літаратура», нядаўна папоўнілася двума новымі зборнікамі. У адзін з іх увайшло ўсё лепшае са спадчыны Францішка Багушэвіча. «Ён быў выразнікам перадавых дэмакратычных сіл Беларусі,— піша ў прадмове В. Чарняўская, — быў першым спеваком народа, знітаваны з ім усімі сваімі спадзяваннямі на лепшую будучыню, першы паэт, які ўзняў голас пратэсту супраць нечалавечых умоў, у якіх знаходзіўся беларускі народ».

Чытачы пазнаёмяцца і з кнігай Канстанцыі Буйло Яе творы — гэта сапраўдныя песні любві свайму народу, а верш «Люблю наш край...» стаў своеасаблівым гімнам роднаму краю.

І. ПАЎЛЮКОЎСКІ.

ВЫТРЫМАНЫ

Каханне — гэта тая песня, якую кожны спявае па-свойму. Яно не было «каханнем з першага позірку». Як прызнаецца герой, спачатку Ларыса яму не падабалася, ён не заўважаў яе на працягу ўсёй вучобы ў інстытуце. Аднак сумесна працуючы з ёй у школе, Павел усё больш і больш адкрываў у дзяўчыне шчырасць, працавітасць і дбайнасць, непрымірымасць да фальшу і крывадушша. І таму нельга не верыць, калі ён прызнаецца: «Я душою, усім сэрцам адчуў, што не магу без Ларысы, што мне трэба быць з ёю... Нечакана ўбачыў я, што яна і прыгожая, і разумная, і добрая, і здзівіўся, чаму я раней не мог гэтага разгледзець». Але разам з радасцю кахання ён адчуў і яго цяжар, вялікую адказнасць за лёс другога чалавека.

Радуе лаканічнасць пісьменніка, яго ўменне пісаць вобразна, з падтэкстам. Вось характэрны прыклад. Дырэктар школы Іван Сямёнавіч, асудзіўшы ў размове з калегамі сучасную моладзь за яе, на яго думку, адмоўныя якасці, стаў апранацца. Ён «зняў з вешалкі сваё доўгае, да самых костачак, паліто, зусім старое, з абцёртым яблінялым каўняром. І вушанцы яго было гадоў болей, як мне». І чытачу адразу становіцца бачна, што яго погляды такія ж устарэлыя, як і вопратка.

Праўда, сустракаюцца і старонкі невыразныя, якія нагадваюць трафарэтны газетны нарыс, як, напрыклад, апісанні першага званка ці пасяджэння педсавета школы. У значнай ступені гэта з'яўлясцца вынікам таго, што аповесць была новым жанрам для Г. Далідовіча. Як паказалі ўжо яго ранейшыя творы, талент аўтара жывіцца пераважна тым, што непасрэдна ім убачана і перажыта.

Але выкарыстаўшы, у прыватнасці, свае ўражанні ад школьнага жыцця ў трыцціху «Настаўнікі», пісьменнік істотна не абнавіў іх і таму міжвольна быў вымушаны паўтарыцца ў паасобных месцах аповесці. Так, размовы Паўла Мікалаевіча з вучнямі і бацькамі нагадваюць аналагічныя размовы завуча Логвіна...

У творах Г. Далідовіча мы знаходзім нямала разнастайных замалёвак восені. Але нават і ў гэтым ён паўтараецца. Вось пачатак аповесці: «Нечакана і незаўважна прайшла пара высокага светлага неба, яркага сонца, празрыстых белых воблакаў; набеглі халодныя сіберныя вятры, нагналі нізкіх і цяжкіх хмар...». Але нешта падобнае мы ўжо чыталі ў апавяданні «Ліст да Олі» (дарэчы, першага друкаванага твора пісьменніка): «Жнівеньскаю парою было высокае сіняе неба, яркае сонца, і, здавалася, яшчэ далёка да пякучых сіберных вятроў, нізкіх цяжкіх хмар і зацяжных халодных дажджоў».

Хаця гэтыя паўтарэнні не засланяюць усяго лепшага, што ёсць у аповесці, аднак наяўнасць іх можа быць сімптомам небяспечнай для пісьменніка схільнасці да творчага застою, супраць якога адным з самых дзейсных сродкаў з'яўляецца няспынпае ўзбагачэнне веданнем жыцця.

Па-ранейшаму Г. Далідовіч найбольш упэўнена адчувае сябе ў жанры апавядання, пра што сведчыць і трыцціх «Цяпло на першацвет», на нашу думку, самы дасканалы твор кнігі. Ён захапляе і сваім лірызмам, і цёплым гумарам, і тонкай перадачай прыгажосці прыроды. Пісьменнік паставіў перад сабой нялёгкую задачу: праз дзіцячае ўспрыманне ўзнавіць паасобныя малюнкі жыцця заходнебеларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады — і справіўся з ёй. Асабліва хочацца адзначыць трэцюю частку — «Крычаты», у якой мы бачым зараджэнне — не, яшчэ не кахання, а першай узаемнай сімпатыі хлопчыка і дзяўчынкі, што азарыла іх дзяцінства незвычайным святлом. Нездарма ж Стасік у час ад'езду Камці з жалем адчувае, «як штосьці вялікае, дарагое, моцнае выплывае з яго душы».

Раскрыццю складанага свету інтымнага жыцця, узвелічэнню кахання як найвялікшай чалавечай каштоўнасці прысвечаны астатнія творы. Алена Пятроўна з апавядання «Жнівеньскія ліўні» толькі цераз шмат гадоў зразумела сваю вялікую віну перад Сяргеем Карачуном за тое, што ў маладосці, жартуючы, яна абудзіла ў ім да сябе каханне, а пасля і пасмяялася з яго.

У апавяданні «Асенняе лета» знаёмімся з настаўніцай Вольгай Пятроўнай. Нягледзячы на свае сорак гадоў, яна адчувае сябе маладой і здольнай кахаць. І таму, зразумела, ў яе не можа не ўзнікнуць непрыязнасць да свайго мужа, які з галавой уцягнуўся ў прозу жыцця і перастаў заўважаць і яе хараство, і яе маладосць.

Менш удалася аўтару аповесць «Юля». Яна пабудавана на супрацьпастаўленні асабістых лёсаў дзвюх сяброўак Юлі і Анькі. Аднак ні першы, ні другі не паказаны з дастатковай пераканаўчасцю. Узаемаадносіны Юлі з яе мужам Генадзем выступаюць перад намі ў крытычны момант: Генадзь паверыў плёткам пра здраду яму Юлі, што і прывяло да разрыву іх сумеснага жыцця.

Тут, як бачым, фактычна няма сур'ёзнага канфлікту, а ёсць прыкрае непаразуменне. Да таго ж у творы не раскрыты ні складанасць пачуццяў, ні іх развіццё. Яны як бы застылі на адной кропцы. Юля, якая не адчувае за сабой ніякай віны, па-ранейшаму кахае Генадзя, а той адчувае ўсю пустэчу свайго жыцця без Юлі.

Аповесць заканчваецца досыць трафарэтна. Як раней няшчасце з Юляй паспрыяла іх збліжэнню, так і зараз няшчасце з Генадзем паклала канец іх часоваму разладу. Іншы канец мае сямейная гісторыя Анькі. Яна кідае свайго мужа, які забяспечыў ёй матэрыяльны дабрабыт. Аднак гэта з'яўляецца нечаканасцю, асабліва, калі ўспомніць, як Анька выхвалялася перад Юляй сваім добрым жыццём і (што самае важнае) навучала яе, «як лепей і крыху хітрэй жыць». Наўрад ці такія людзі, падкія да лёгкага жыцця, адмовяцца ад яго па сваёй ахвоце.

Другая кніга — вельмі адказны экзамен для маладога аўтара. Яна найперш выяўляе, наколькі сур'ёзнай пісьменніцкай заяўкай быў яго дэбют. Г. Далідовіч вытрымаў гэта выпрабаванне. Але зборнік «Цяпло на першацвет» адначасова паказаў і тыя цяжкасці, што яму патрэбна будзе пераадольваць у далейшым.

Мікола ЕРМАЛОВІЧ.

СЯРОД КНІГ

ЗГАДАНА ПЕРАЖЫТАЕ

Серыя выданняў аб партызанах і падпольшчыках Беларусі, якія ў гады фашысцкай акупацыі не скарыліся ворагу, а змагаліся з ім, прыбліжаючы дзень перамогі, папоўнілася яшчэ адной хвалюючай кнігай — «Партизанское междуречье», якая выйшла ў Маскве ў выдавецтве палітычнай літаратуры. Аўтар яе, актыўны ўдзельнік барацьбы народных мсціўцаў, спачатку камісар аднаго з атрадаў, а потым камандзір былой партызанскай брыгады імя Дзмітрыя Гуляева, Уладзімір Кірылавіч Якавенка праўдзіва расказвае пра тых, з кім разам змагаўся з ворагам.

На старонках кнігі шмат гаворыцца і аб выдатных партызанскіх кіраўніках — В. І. Казлове, Д. Ц. Гуляеве, і аб радавых партызанах і падпольшчыках.

Гэтае выданне лагічна прадаўжае зборнік мемуараў Ул. Якавенкі «На акупіраванай зямлі», які раней выходзіў у Мінску. Аўтар дапоўніў успаміны новымі эпізодамі, шырока выкарыстаў архіўныя матэрыялы і дакументы, што дало магчымасць паказаць партызанскі рух на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі больш маштабна і шырока.

Герой Савецкага Саюза былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі, камандзір партызанскага злучэння Р. Мачульскі ў пасляслоўі «Аб гэтай кнізе і яе героях» дае такую ацэнку мемуарам: «Партизанское междуречье» — праўдзівы расказ аб сіле духу савецкіх людзей, аб іх мужнасці, аб подзвігу народа, узначаленага партыяй». **Б. САКОЛЬСКІ.**

ТЭАТРАЛЬНЫ ЛЕТАПІС БЕЛАРУСІ

З'ЯЎЛЕННЕ на паліцах нашых кніжных магазінаў двухтомніка «Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі» — падзея ў культурным жыцці рэспублікі ўжо хоць бы таму, што такое выданне першае ў беларускім тэатразнаўстве і адно з нямногіх у гісторыі шматнацыянальнага савецкага тэатра. Выдадзеныя «Вышэйшай школай» два тамы прызначаны перш за ўсё для студэнтаў тэатральных ВНУ. Акрамя тэкстаў першакрыніц, кароткіх, але ёмістых прадмоў да іх і энцыклапедычна дакладных каментарыяў да кожнага раздзела, цікавых самі па сабе, кнігі даюць уяўленне аб працэсе развіцця драматургічнага жанру літаратуры і сцэнічнага мастацтва.

Што і казаць, студэнты атрымалі неацэнны падарунак, які дазваляе ім без асаблівых цяжкасцей пазнаёміцца з многімі тэкстамі, якія да гэтага знаходзіліся ў розных, часта маладаступных выданнях, і з архіўнымі матэрыяламі, якія да гэтага не публікаваліся.

Аўтарам, складальнікам і рэдактарам тэкстаў, доктарам мастацтвазнаўства А. В. Сабалеўскім праведзена вялікая работа па адбору і сістэматызацыі таго велізарнага матэрыялу, які паслядоўна ўзнаўляе гісторыю беларускага тэатра і драматургіі, пачынаючы з даўніх часоў і да нашых дзён. Пазнаёміўшыся бліжэй з матэрыяламі, сабранымі ў «Хрэстаматыі», пачынаеш разумець, што перад табою не проста вучэбны дапаможнік, які дае магчымасць адчуць жывую гісторыю беларускага нацыянальнага тэатральнага мастацтва.

Першы том, прысвечаны дарэвалюцыйнаму тэатру, адкрываецца тэкстамі абрадавых гульняў, якія выконваліся на народных святах у старажытныя часы. Менавіта ў карагодах і гульнях мы знаходзім першыя элементы тэатральнага народнага відовішча, з якіх пазней узнікала такая яркая і да гэтага часу не зусім вывучаная з'ява, як народная драма, а яна з'явілася ў сваю чаргу папярэднікам сучаснага тэатра. Упершыню чытач атрымлівае магчымасць пазнаёміцца з поўнымі тэкстамі інтэрмедый школьнага тэатра. Гэты факт значны, бо драматургія і асабліва інтэрмедыі школьнага тэатра пазней сталі багацейшай крыніцай для беларускай прафесіянальнай драматургіі, у асаблівасці для п'ес, заснаваных па фальклорнай аснове.

У раздзеле «Батлейка», акрамя тэкстаў батлеечных відовішчаў, А. Сабалеўскі прапануе дакументальныя матэрыялы, якія дапамагаюць лепш зразумець гісторыю ўзнікнення і асаблівасці батлеечнага відовішча.

Прафесіянальная драматургія сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзяў прадстаўлена імёнамі пісьменнікаў В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каганца, Я. Купалы, Я. Коласа і іншых аўтараў. Самымі цікавымі ў гэтых раздзелах з'яўляюцца матэрыялы, здавалася б, не хрэстаматыйнага характару — успаміны сведкаў, нарысы тэатральнага жыцця, рэцэнзіі таго часу. Уся гэтая падборка мае асаблівую паэтычную танальнасць, яна дазваляе больш ярка і выразна ўявіць уздым нацыянальнай самасвядомасці, грамадскага і тэатральнага жыцця ў перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі.

Другі том хрэстаматыі прысвечаны савецкаму перыяду беларускага тэатра. Ужо ў першыя паслярэвалюцыйныя гады пачынаецца імклівае развіццё нацыянальнага тэатральнага мастацтва і драматургіі. Драматургія 1917—1922 гадоў прадстаўлена імёнамі В. Галубка, Ц. Гартнага, М. Чарота і іншых пісьменнікаў. Вельмі цікавыя раздзелы, прысвечаныя найбольш значным дзеячам нацыянальнага тэатра — Е. Міровічу, Ф. Ждановічу, В. Крыловічу. Матэрыялы кораткі, але вельмі каларытна характарызуюць вобразы людзей, якія шмат зрабілі для стварэння і станаўлення беларускага тэатра ў савецкі перыяд.

У кнігу ўвайшлі ўрыўкі з лепшых драматычных твораў, а таксама цікавы фактаграфічны матэрыял, які дае вычарпальную карціну дзейнасці беларускіх тэатраў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Найбольш поўна пададзены ў «Хрэстаматыі» драматургія і тэатр пасляваеннага часу. У гэтых раздзелах чытач мае магчымасць пазнаёміцца з цэлай галерэяй выдатных майстроў беларускай сцэны — К. Саннікавым, Б. Платонавым, Г. Глебавым і іншымі. Падборка матэрыялаў пра іх вельмі ўдалая.

Ды і само слова «хрэстаматыя» не зусім поўна вычэрпвае значэнне гэтага выдання; хутчэй за ўсё яго можна было б назваць мастацкім летапісам, які аднаўляе шырокую гістарычную панараму беларускага тэатра ад яго вытокаў да нашых дзён.

Уяўляецца значным той факт, што неўзабаве пасля выхаду ў свет «Хрэстаматыя» стала амаль бібліяграфічнай рэдкасцю, што, напэўна, сведчыць аб каштоўнасці гэтага выдання не толькі для студэнтаў тэатральных ВНУ, але і для шырокага кола людзей. Выдадзеная на добрым паліграфічным узроўні, якая нясе каштоўную інфармацыю ў галіне беларускай культуры, «Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі», без сумнення, стане настольнай кнігай для тых, хто абраў служэнне беларускаму тэатру справай усяго свайго жыцця. А для таго, каб з гэтай кнігай магло пазнаёміцца больш шырокае кола чытачоў не толькі Беларусі, але і іншых саюзных рэспублік, ужо цяпер паўстае пытанне аб яе перавыданні.

Я. ВОЛКАЎ,
Л. КАТРАНЖЫ,
П. БЫКАЎ,
выпускнікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута.

Ч а с

Час! Не прыходзь да мяне з лёгкім поступам,
Абяцанкаю птушкі ў бары,
Бо на свеце жыве ціхім россыпам
Тое шчасце, што ўмее дарыць
Скарб надзей, веры скарб і магутную
Недзе ў пошуме людскім красу,
Што змывае ў паходзе пакутную
Перажыткаў людскіх паласу.

Часу крок — цяжкі крок і няўрымслівы
Ад малюткіх да волатных сіл.
Ён узброен сусветнымі мыслямі —
Шчасцем-дарывам, хто б ні прасіў.

Заклік часу мы чуем нястомлены —
Кожны дзень нам ісці і хацець —
Разбіваць ланцугі паняволеных
І ў Сусвеце зарой харашэць.

Пільна ўслухаліся зоркі
У стогны вялікай ракі...

Слухай, затужаны Горкі, —
Гэта пяюць бурлакі.

Думы пад зор карагоды
Ужо расквіталі, як мак, —
Споўняцца... З песняй свабоды
Царская рухне турма!

Зорнае неба над Волгай,
Рускіх прастораў туга
Цяжкай пустыннай дарогай
Слалася даль, як смуга.

. . . . . .

Стаў на абрыве надволжным
З шэрым плашчом на плячы
Рускай зямлі падарожны
З заклікам: «Русь, не маўчы!»

Зорнае неба над Волгай,
Зорная дума ў глушы
Стала крылатаю, вольнай,
Гімнам народнай душы.

Аб Горкім

Піліп ПЕСТРАК

Далягляд

А мне ізноў чагосьці нестае.
Здаецца, сонца свеціць, як штодня,
Ды толькі ранак весні настае —
Мне мроіцца за лесам вышыня.

І сэрца раптам сціснецца ў тузе,—
Па далечы, растане у смузе,
Па справах, што вяршацца без мяне,
Па новай, шчэ не стрэчанай вясне.

Прыходзіць найтурботная з трывог!
Што там за марывам, за далеччу дарог!

Я піў яе, як хмельнае віно, —
З усмешкай гаспадыні заадно.

Здаўна там кожны шчыры гаспадар
Калодзеж аздабляе, бы алтар,
Напіўся — і найлепшая з кабет
Выходзіць, каб падзякаваць табе.

Глыток тае крыштальнае вады
Прагоніць стому, збавіць ад бяды, —
Калі з аздобай конаўку ў расе
Смуглянка-малдаванка паднясе...

Ідуць гады — ды ў памяці заўжды
Глыток малдаўскай чыстае вады.

Успамін пра Малдавію

Анатоль ШАЎНЯ

Якія дзівы ўстануць прада мной
За вышынёй, за часам, за вясной!

Ці здзейснішся на гэтым рубяжы,
Або надзеі толькі міражы,
І зноў эпоха у тваім акне
Экспрэсам гулкім міма прамільгне!

Ды веру: за сінечаю бароў
Ёсць мужны край герояў і сяброў.
Чакае там мяне КамАЗ ці БАМ,
Якім я песню лепшую аддам...

Я ўсе набыткі-скарбы скінуць рад,
Каб толькі быў той светлы далягляд!

Хвала жывой калодзежнай вадзе!
Такой салодкай я не піў нідзе.
Дзе я ні еду, дзе я ні іду —
Малдаўскую прыгадваю ваду.

Яна адметны мае смак і пах
У розных хатах, вёсках і краях.
То грае ўся вясёлкай на губах,
Бы ў дзеўчыны усмешка у вачах,

У Малдавіі чароўнай, дзе спрадвек
Гасціннасцю быў слаўны чалавек,

Калінoўскі

Народны хор турбот жыццёвых
Зноў патрабуе і гудзе
І — гінуць хісткія высновы,
Што білі — пугай па вадзе.

Мудрэц шаптаў: жыві са страхам,
Ён сам загіне, свет стары...
Ляцяць тэорыі ўсе прахам,
Ляцяць нагамі дагары!

І адраджаецца свавольны
І вечны вольніцы закон,
І зноў шуміць хурал застольны,
Бы ў час дзядоў, здаўна-здавён.

Тут за старэйшыну — Сумленне
Вяршыць апошні правы суд,
І — нікнуць страхі і сумненні
Прад тварам Праўды і Пакут.

Уладзімір ПРАВАСУД

У ДРУЖБЫ ЁСЦЬ СВАЕ ЗАКОНЫ...

●

Пачатак свой рака звычайна
Бярэ з крынічкі пад гарой,
Што прабіваецца адчайна,
Каб стаць шырокаю ракой.

Пакуль жа ручайком нясмела
Бяжыць яна суцішна ўдаль.
Ці празвінела, ці прапела —
Яе не чутна што амаль.

Але яна жыве, імкнецца,
Наперад праразае шлях,
Паміж кустоў і дрэў віецца,
Бяжыць наўпросткі па палях.

І ручайкоў збірае мноства,
Што звоняць, весела пяюць,
І тыя з шчодрасцю сяброўскай
Ваду сваю ёй аддаюць.

Яна дужэе, прыбывае
І ўдалячынь бяжыць — цячэ...
Яна ўжо не крынічка тая,
Але і не рака яшчэ.

Яна ракой тады бывае,
Калі няхай не параход,
А хоць бы лодку падымае,
На зыбкіх хвалях чыстых вод.

І клопат у ракі іначы:
Не толькі браць, не толькі мець,—
Але за ўсё другім аддзячыць,
Ды і самой не памялець.

●

У дружбы рук заўсёды многа
(Не цэнім гэта іншы раз),
І кожная — табе падмога,
Каб падтрымаць у цяжкі час.
Бывае, збіўся ты з дарогі,
Ну, заблудзіўся, ну, зачах —
Спяшаць сябры на дапамогу,
Каб вывесці цябе на шлях.
Чым могуць, тым дапамагаюць,
Даюць апошняе — бяры!
Нічым нідзе не дакараюць,
Калі сапраўдныя сябры.

●

Скурыўшы пуд ці два махоркі,
Апаражняем капшукі.
Нам не патрэбны адгаворкі,
Віляние ў розныя бакі.
І нам няма чаго баяцца,
Што з крыўдай можа хто пайсці —
Мы можам суткамі спрачацца,
Каб толькі ісціну знайсці.
І ў гэтых пошуках нястомных
За даллю адкрываем даль.
Яны ніколі не надломяць,
А загартуюць дружбы сталь.

●

У дружбы ёсць свая аснова,
Праверана з веку ў век:
Невыпадковасць, выпадковасць
Яе ніколі не парве.
У дружбы ёсць свая патрэба,
Якой ніяк не абмялець:
Адчуць душой, што другу трэба,
І на паўслове зразумець.
У дружбы ёсць свае законы,
Яны няпісаны нідзе.
Як добра адчуваць штодзённа,
Што побач друг з табой ідзе!

●

Бывае, што пакрыўдзіш друга —
Не так мо зразумеў, сказаў...
І ўжо табе, прызнацца, туга —
Назад бы словы ўжо забраў.
І у руках работа стыне,
І не заплюшчыш ў сне вачэй...
Кінь прэч, браток, сваю гардыню,
Ідзі да друга і хутчэй.
Ён зразумее ўсё, даруе,
Як дараваў ужо не раз.
Як проста ўсё, хоць час віруе,
І як складана ўсё падчас.

«Жыццё пражыць» — назва майго новага рамана пра студэнтаў, бо гаворка ідзе аб выбары юнакамі свайго месца ў грамадстве, аб адказнасці перад людзьмі, перад Радзімай. У аснову твора я ўзяў перажытае, уласныя назіранні — было з чаго — тры гады вучыўся ў педвучылішчы і чатыры ў педінстытуце.

Я імкнуўся стварыць кнігу, патрэбную моладзі.

Аўтар.

ЗРАНІЦЫ і ў поўдзень была адліга, і на старт студэнты выйшлі пад вечар. Праводзіліся курсавыя лыжныя спаборніцтвы.

Група «А» пайшла першай. Уперадзе групы Кастусь. Яго атлетычная постаць вабіла сваім хараством і сілай. Ён ішоў размашыстым шырокім крокам.

— Для мяне гэта справа звычайная,— ідучы на спаборніцтвы, сказаў Кастусь аднакурснікам, калі яны пачалі ўспамінаць лыжныя прабегі ў школе, у калгасе. — Пад Масквой і на Сахаліне, дзе мне два гады давялося служыць, зімой ледзь не кожны дзень я рабіў вылазкі на лыжах.

— О! Дык ты тут нас усіх абгоніш!— занепакоіліся хлопцы.

— Не палохайцеся. Не заўсёды я першым прыходзіў. Былі мацней за мяне. Хаця ўмовы прабегу ў нас былі зусім іншыя, — адказаў Кастусь.

— Чым яны могуць быць іншыя? — здзівіўся Віктар. — На лыжах усюды аднолькава. Шуруй і шуруй.

— Што ты! Ніякага параўнання, — адказаў яму Кастусь. — На Сахаліне, помню, пры саракаградусным марозе ў поўнай баявой з сопкі на сопку ішлі. А тут што? Тут, бачу я, адна забава. Прагулачка...

— Праўду Кастусь сказаў, што прагулачка будзе. Глядзіце, якое поле роўнае! Як вялізная прасціна! — усклікнуў Алесь, калі яны выйшлі на старт.

Алесь ішоў другім за Кастусём. Яшчэ на першым кіламетры ён адстаў ад Кастуся на некалькі інтэрвалаў і зараз вельмі шкадаваў, што пры ўсіх пахваліў поле. Як ні стараўся Алесь, каб дагнать Кастуся і ісці за ім ушчыльную — нічога не выйшла.

Шчокі Алеся пашчыпваў мароз, што к вечару пачаў мацнець. Сіняватыя клубкі пару, якія выдыхаў Алесь, адсопваючыся, на марозе таялі, знікалі непрыкметна.

Уперадзе над лесам вісела вялікае малінавае сонца.

«Калі б ішоў і ішоў так, здаецца, спаткаўся б з сонцам за лесам»,—падумаў Алесь. Ён аглянуўся назад. За ім на адпаведнай адлегласці бег Мікола.

Віктар ішоў чацвёртым. Стартаваў ён нехаця і першы кіламетр прайшоў без асаблівага напружання.

Барацьба за першынство рэзка набывала тэмп. Віктар пачуў блізка за сабой шоргат лыжаў. Ён азірнуўся і ўбачыў, што заднія лыжніцы пачалі абганяць адна другую. Ліда Хвашчынская, якая ішла за ім, таксама мерылася абагнаць яго. «Не паддамся! Не з таго дзесятка, каб дзяўчына ды абагнала мяне!» — раззлаваўся Віктар і напружыў сілы. З кожным крокам ён больш і больш уваходзіў у азарт і нарэшце памчаў так шпарка, што неўзабаве дагнаў Міколу. «Кастуся не дагоніш, а гэтых субчыкаў абганю», — рашыў Віктар і хутчэй выдыхнуў чым сказаў Міколу: «Уступі дарогу». Мікола паслухмяна сышоў з лыжні.

Алесь азірнуўся і, напружваючы ўсе сілы, пайшоў шпарчэй. «Давай паспаборнічаем з табой, дружа», — зласнавата ўсміхнуўся Віктар і подбегам рушыў уперад...

У гэтым адзінаборстве мелі значэнне хвілі. «Паскорыць тэмп, не сарвацца з лыжні», — думаў кожны. Віктар усё бліжэй і бліжэй падыходзіў да Алеся.

— Налягай, дружа! А то на пяты сяду! — крыкнуў Віктар Алесю.

Алесь пайшоў размашыстым шырокім крокам, як Кастусь.

«Чорт вазьмі, нялёгка мне будзе з табой справіцца. Ідзеш, як пішаш», — пападумаў Віктар, гледзячы на вузкія плечы Алеся.

Віктар напружваў свае сілы да апошняга, ды Алесь зноў аддаляўся ад яго.

«І тут вывучка трэба. Супраць мяне Алесь слабец, але абагнаць яго цяжка.

Алесь СТАВЕР

Нападзенне сяброўства

Што значыць спрактыкаваны... Ды абагнаць яго трэба, — як бы ні было», — са злосцю падумаў Віктар і, выбіваючыся з сіл, рушыў шпарчэй.

Алесь азірнуўся яшчэ раз і ледзь не спыніўся ад нечаканасці. Ён быў збянтэжаны выглядам Віктара. Твар Віктара быў чырвоны, як бурак, вушанка ссунута на патыліцу, вейкі і валасы пабяліў іней. Ад Віктара валіў пар, нібы з паравога катла.

«З ног звалюся, але абганю цябе», — падумаў Віктар, сустрэўшыся з позіркам Алеся.

Вочы Віктара засцілаў салёны пот, рукі і ногі дранцвелі. Ён не адчуваў цяжару лыж і кійкоў. У галаве ў яго была толькі адна думка: «Абагнаць Алеся!»

Як праз туман, Віктар бачыў, што Алесь ідзе ўжо ўшчыльную за Кастусём, што Кастусь пайшоў яшчэ шпарчэй, што пікетчыкі аж прысядаюць ад захаплення, гледзячы на гэта яраснае спаборніцтва.

«Сілёнка ёсць... — акінуўшы кароткім позіркам Алеся і Віктара, падумаў Кастусь. — Курс маладога байца здалі б на «выдатна»...

Кастусю давялося таксама цяжка. Па праўдзе кажучы, ён не чакаў, што будуць такія ярасныя прэтэндэнты на першынство. Кастусь таксама ішоў на ўсю сілу. Убачыўшы фініш, ён нават занепакоіўся, каб на самым канцы дыстанцыі не абагналі яго.

Калі наблізіліся да фінішу, Віктар сабраў астаткі сіл і, задыхаючыся, рынуўся ўперад... Ён бачыў, што студэнты махалі рукамі і штосьці крычалі. Але слоў іх Віктар не разабраў. Сэрца яго ледзь не вырывалася з грудзей, кроў пульсавала так шпарка, што яму калола ў скроні, пазакладала вушы, нібы хто іх пазатыкаў ватай.

Узяты ў абцугі, — спераду Кастусём, ззаду Віктарам — Алесь прымяніў усе прыёмы хадзьбы на лыжах, што навучылі яго ў педвучылішчы. Ён выбіваўся з сіл. «Відаць, Віктар паставіў мэту абагнаць мяне... — думаў ён. — Не здамся!.. А ну яшчэ налегчы». Але праз хвіліну Віктар абагнаў яго.

Усе трое ўвачавідкі прыбліжаліся к фінішу...

Першынство на курсавых лыжных спаборніцтвах сярод юнакоў заваяваў Кастусь Дубянец.

Калі спаборніцтвы былі закончаны і падведзены вынікі, пераможцам выдалі грашовыя прэміі.

Былі прэміяваны Алесь і Віктар.

***

Як заўсёды, першым прачынаўся дзяжурны па пакоі. Сёння надышла чарга дзяжурыць Алесю Зарачанскаму. Вельмі не хацелася яму вылазіць з-пад цёплай коўдры, але ён вымушаны быў устаць раней сяброў. Збегаў памыўся, прынёс з кубавой чаю, паснедаў.

Міжволі ў памяці Алеся паўсталі падзеі ўчарашняга дня... Нялёгка далася яму прэмія. Яшчэ і зараз гарэлі рукі, ногі з цяжкасцю згіналіся ў каленах. Алесь прыгадаў, як пасля спаборніцтваў студэнты шумнай гурбой вярталіся ў інтэрнат. Па дарозе доўга гаварылі пра Кастуся, пра яго спартыўны імпэт. Успаміналі і Віктара. І яго хвалілі таксама. Алесь успомніў, як, прыйшоўшы ў інтэрнат, ён з Міколам падкінулі Кастуся на «ўра». Затым добрага паўвечара гаварылі аб спаборніцтвах, пасля рыхтаваліся да заняткаў і спаць леглі даволі позна.

Стараючыся не разбудзіць сяброў, Алесь дастаў з шафы прас, разаслаў ца стале коўдру і старанна выпрасаваў касцюм. Павесіўшы касцюм на спінку крэсла, прыбраў сваю пасцель.

Гадзіннік паказваў палову сёмай. Пачатак заняткаў у 8 гадзін. Хадзьба да інстытута займала 20 мінут.

— Пад'ём! — бадзёра гукнуў Алесь і ўключыў радыё.

Як салдаты, Кастусь і Мікола ўскочылі з ложкаў і пачалі хуценька апранацца. Застаўся ляжаць толькі Віктар. Скурчыўшыся, накрыты з галавой, ён сіпла хрыпеў. Учора была яго чарга дзяжурыць, але на гэта ён не звярнуў ніякай увагі. Ні раніцой, ні вечарам не падмёў у пакоі. Не заслаў нават і свой ложак, які заставаўся такім вельмі часта, нягледзячы на патрабаванні Кастуся.

Пасля спаборніцтваў Віктар пайшоў у горад і вярнуўся ў інтэрнат апоўначы. Зараз у яго быў самы сон.

Хоць Алесь ніколі не трымаў крыўду і ніколі не помсціў нікому, але ўчарашняя крыўда на Віктара не праходзіла і зараз. Гэта ж якраз перад самым фінішам Алесь пачуў ззаду воклич «Уступі дарогу!» Ён саскочыў з лыжні і ўбачыў, як ганарыста, з выглядам пераможцы прайшоў міма яго Віктар.

На курсавых лыжных спаборніцтвах Віктар заняў другое месца.

«З-за цябе я на трэцяе выйшаў», — з абурэннем падумаў Алесь.

— Гэ-эй! Хопіць храпець! — штурхануў ён Віктара ў плячо.

Віктар расплюшчыў пухлыя павекі і, маўкліва зірнуўшы на хлопцаў, пачаў смачна пазяхаць і да хрустаў у суставах пацягвацца.

Кастусь і Мікола пілі чай. Пазяханне і пацягванне Віктара прыкра падзейнічала на апетыт Кастуся. Кастусь кісла зморшчыўся.

— Ты чаму ўчора ў пакоі не падмёў? —з абурэннем спытаў ён Віктара.

Віктар маўчаў. Ён насупіў бровы, пяцярнёй прычасаў валасы і маўкліва пачаў апранацца.

— Ты што? І гаварыць з намі не хочаш? — сурова глянуў на яго Кастусь.

— Пайшлі вы к чорту! — абурана адказаў Віктар і шпарка падаўся ва ўмывальнік. Вярнуўшыся адтуль, ён апрануўся, напяў на ўскудлачаную галаву шапку, выпіў ледзь не паўграфіна вады і, не снедаўшы, пайшоў.

Калі постаць Віктара прамільганула ў акне, звяртаючыся да сяброў, Кастусь сказаў:

— Хлопцы усе, як хлопцы, а ён дык выключэнне нейкае... І сягоння ад яго перагарам несла. Гэта да добрага не давядзе. Не! Больш цярпець так нельга! Ён зусім не шманае на нас. Дзе бадзяецца?

— Тэарэтычна, усе мы самастойныя людзі, а, фактычна, з Віктарам трэба нешта рабіць, — разважыў Мікола.

— А што? Што рабіць? — нахмурыўся Кастусь. — Ці каб яго маці пісьмо напісаць?

— Я думаю, пісаць няварта,—запярэчыў Алесь.—Маці можа не паверыць нам. Ды й непрыгожа такой пісанінай займацца.

— А ён прыгожа робіць? — з дакорам глянуў на яго Кастусь.—Я хачу, каб вы правільна зразумелі мяне, хлопцы. Супроць Віктара я нічога не маю. Толькі не магу бачыць, што чалавек ідзе не ў той стэп.

— Фактычна, у яго маюцца на гэта нейкія прычыны,—зазначыў Мікола.

— Штосьці не ладзіцца ў яго... — пагадзіўся Кастусь. — Вось мы прыехалі з канікул, здаровыя, бадзёрыя. А ён, як зайшоў у пакой—я спалохаўся. Цёмны, як хмара. Нейкая муха дома яго ўкусіла... Хай бы ты, Алесь, спытаў. Ці, можа, ён табе расказваў?

— Не, нічога не гаварыў, — адказаў Алесь. — Нешта пасля канікул пачаў утойвацца. А распытваць, лезці ў душу чалавека я не магу.

— А бачыць, як сябра марнуецца, можаш? Эх, ты... — зноў з дакорам зірнуў на яго Кастусь. — Не, хлопцы. Неяк трэба перавесці Віктара ў іншы настрой...

— Фактычна, трэба яго нечым заняць, — падказаў Мікола.

— О! Гэта ідэя! — падтрымаў думку Міколы Кастусь. — У інстытуце столькі гурткоў розных. Ты, Мікола, у спевакі падаўся. Алесь у літаратурны гурток ходзіць. Я ў спартыўнай секцыі. Трэба й Віктару хоць чым заняцца.

— Трэба-то трэба... — заклапочана прамовіў Алесь. — Але вы не знаеце яго характару. Калі ён сам не загарэўся, дык ты яму хоць кол на галаве цяшы—ні ў які гурток не пойдзе.

Кастусь задумліва пратупаў па пакоі, і, звяртаючыся да Алеся і Міколы, спытаў:

— Дык што вы параіце?

— Трэба падумаць... — адказаў Мікола і зірнуў на наручны гадзіннік.— А зараз я раю, хутчэй бегчы ў інстытут, каб не апынуцца на адной дошцы з Віктарам.

— Гэта ты праўду сказаў, «фактычна»,—усміхнуўся Кастусь.

Кастусь і Мікола таропка апрануліся і, захапіўшы з сабой кнігі і канспекты, пайшлі на заняткі. Дзяжурны заўсёды пакідаў пакой апошнім. Алесь закончыў падмятаць, сабраў смецце і вынес на двор, высыпаў у спецыяльную скрыню. Вярнуўся ў пакой, выключыў радыё, склаў кнігі ў партфель і хацеў апранацца, як раптам яго ўвагу прыцягнуў непрыбраны Віктараў ложак.

«Ах, трэба было прыбраць, — раздражона падумаў Алесь. — Але часу няма, на заняткі спазняюся. Ды ўвогуле—чаму я павінен яго койку прыбіраць? Што я лакей яму, ці што? У самога рукі ёсць. Хай не лянуецца. Любіць на чужым карку ў рай ехаць. Няма дурных».

Алесь хуценька апрануўся, схапіў партфель, замкнуў пакой, аддаў вахцёрцы ключ і пабег у інстытут.

З думак Алеся не выходзіў Віктар. Неяк і шкада было Віктара і адначасова Алесь адчуваў у душы непрыязнь да яго.

За час зімовых канікул Алесь шмат перадумаў пра свайго сябра, пра яго характар. І хоць па-ранейшаму быў ветлівы да Віктара, але былой даверлівасці да яго не меў: у душы паэта адбыўся якійсьці пералом. Штосьці незразумелае для Алеся было ў характары Віктара, і ён лічыў за лепшае быць асцярожным у сяброўстве з ім.

Пасля заняткаў у сталовую ці ў інтэрнат яны, як і раней, часцей за ўсё ішлі разам. Але потым іх дарогі разыходзіліся. Алесь ішоў у гарадскую бібліятэку рыхтавацца да заняткаў, Віктар—у інтэрнат адпачываць або спаць. Вечарам Алесь вяртаўся дадому, а Віктар адпраўляўся да Марыські. І часта прыходзіў ад яе аж пад раніцу.

— Што ж гэта вы, сябры-тапорыкі,—адзін ад другога насы адварочваеце?—спытаў Кастусь Алеся, калі пасля лыжных спаборніцтваў Алесь адказаўся ад прапановы Віктара пайсці замачыць прэмію.

— Нічога не адварочваем. Як сябравалі, так і сябруем. Проста няма ў мяне сёння настрою выпіць,—адказаў Алесь, адчуваючы сэрцам, што Кастусь сказаў праўду.

— Ты мне вачэй не затуманьвай. Я, брат, бачу. Я ведаю, што такое сяброўства,—сказаў Кастусь. — У мяне ў партызанах сябра быў...—задумліва прамовіў Кастусь. — Няма яго... Загінуў ён пад Бягомлем у блакаду... От гэта быў сябра... Такога толькі раз у жыцці можна сустрэць...

«Цікава. Што за сябра быў у Кастуся, — падумаў Алесь, узыходзячы на ганак інстытута. Спытаю сёння. Трэба, паслухаць аб сапраўдным сяброўстве і самому навучыцца выбіраць сяброў».

Алесь паспеў распрануцца і ўзысці па трэці паверх, як зазвінеў званок на лекцыю.

Зайшоўшы ў аўдыторыю, Алесь адразу адшукаў вачыма Віктара. Віктар задумліва сядзеў за трэцім сталом. Алесь шпарка прайшоў міма яго і сеў за апошні стол.

У другім семестры Алесь і Віктар вельмі рэдка садзіліся разам. Неяк атрымалася гэта само сабой.

«Адкалоўся ад мяне... І сёння не сеў побач, хоць і месца ёсць. Ну й ліха з табой, — падумаў Віктар, зірнуўшы на Алеся, калі пачалася лекцыя. — Я за табой ганяцца не буду. Гэта не Мікола, што Рая гатова пляваць на яго, а ён стараецца заўсёды сесці побач з ёй або недалёка ад яе, стараецца дагадзіць ёй. А чаго ўжо так разам усюды тырчэць, як Кастусь з Лідай?.. Усюды ходзяць разам, як засватаныя. Усе ў інстытуце ведаюць, што яны пакахаліся. К чаму гэта?»

Пасля заняткаў Віктар да Алеся не падышоў. Таропка апрануўся і кудысьці знік.

Алесь з Кастусём і Міколам паабедалі ў буфеце і накіраваліся ў інтэрнат—рыхтавацца да семінарскіх. Ішлі моўчкі, кожны думаў пра сваё.

— Слухай, Кастусь, нечакана азваўся Алесь. — Ты аднойчы ўспамінаў пра свайго партызанскага сябра. Раскажы нам пра яго. Я, можа, пра яго верш напішу.

— Не люблю я кранаць раны былыя. Тым больш яшчэ дзеля якіх там вершаў, — адказаў Кастусь. — Але пра свайго баявога сябра раскажу... Спецыяльна для Алеся. Каб ён ведаў, што такое сяброўства. — Кастусь задумліва ўздыхнуў. — Прозвішча яго было Арлёнаў. Сын пагранічніка. Бацькі яго ў першыя дні вайны каля Брэста загінулі... — Кастусь памаўчаў. — Ён вельмі любіў спяваць «Арлёнак, Арлёнак, ляці вышай сонца...» Мы так і звалі яго Арлёнкам... Мы з ім у роце разведчыкаў былі. Яго ўся брыгада ведала... І любілі яго ўсе партызаны. Адчаяны быў. Прарывалі блакаду, дык ён заскочыў у бліндаж і ўсіх фашыстаў ва ўпор з аўтамата пахлопаў. Вырваліся з акружэння, пайшлі мы з ім у разведку. Падпаўзлі блізка да варожага гарнізона і Арлёнак кажа мне: «Я прабяруся бліжэй, разведаю ўсё, можа, і языка падчаплю, а ты ляжы тут. Калі мяне заўважаць, будзеш прыкрываць адход, а загіну—сягай у атрад і далажы камандзіру аб усім, што мы бачылі...» Гэта надвячоркам было. «Чакай,—я кажу яму.—Спямнее,—разам падпаўзем. Цяпер заўважыць могуць...». «Не,—адказвае Арлёнак. — Двайм горш. Можам удваіх загінуць, а разведданыя хто ў атрад занясе? Калі я адзін загіну, ты жыць будзеш. А ў палон я ім не здамся».

Пацалаваліся мы, як браты, і знік Арлёнак у кустах. Ляжу я, прыслухоўваюся. Раптам чую: «Хальт!» І страляніна. Я адразу зразумеў: Арлёнак на варожы акоп напароўся. Прыўзняўся я і бачу паўзе да мяне ранены Арлёнак. Махае мне рукой і крычыць: «Бяжы, Косця, у атрад, а я прыкрываць буду». Пастаяў я ў перашучасці з мінуту, а потым падаўся да лесу. Азіраючыся, бачу: Арлёнак таксама адступае і адстрэльваецца. А фашысты лезуць, як сляпні. Жыўном Арлёнка ўзяць хацелі... Выбег я на ўскраек лесу, спыніўся. Бачу: акружылі фашысты Арлёнка. І раптам узняўся ён ва ўвесь рост, кінуліся гады да яго, а ён узняў гранату і шахнуў сабе пад ногі... Уся зямля скалыхнулася ад выбуху... Больш дзесятка гадаў укакошыў... І Арлёчка не стала... Не стрымаўся я, разануў з аўтамата па тых свалачах, што падбеглі да месца выбуху. Яны заўважылі мяне—і за мной. А ўскраек лесу, відаць, імі заміраваны быў. Некалькі гадаў знячэўку наляцела на свае міны. Не ведаю, як гэта я прайшоў удала... Шаргануў я яшчэ разы са два з аўтамата—і ў атрад. Замітусіліся фашысты і з гадзіну потым палілі з усіх відаў зброі па тым лесе, адкуль я страляў.

Прынёс я разведданыя ў атрад, расказаў камандзіру пра Арлёнка... Выстраіў камандзір партызан, паведаміў усім, як загінуў Арлёнак. Ох і раззлаваліся хлопцы.

— Адпомсім за Арлёнка? Вядзі нас адразу ў бой! — крычалі яны камандзіру.

Зрабілі мы ўначы налёт на гарнізон—ушчэнт разбілі гадаў...

Але Арлёнка няма...

Ён быў старэй за мяне на тры гады, але гэта было стальное сяброўства. Мы з ім апошні глыток вады ў блакаду дзялілі...

— А ў вас з Віктарам што за сяброўства?—Кастусь уважліва паглядзеў на Алеся. — У першым семестры дык хоць разам ад вучобы адлынвалі. А цяпер, відаць, і ў гэтым разышліся.

— Пра Арлёнка можна цэлую паэму напісаць...—задумліва прамовіў Алесь.

— Іменна! — пацвердзіў яго думкі Мікола. — Фактычна, з такімі сябраваць трэба!

Сёлета ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіць з друку новая кніга Рыгора Бярозкіна «Звенні» — аб узаемадзеянні рускай і беларускай паэзіі, аб станаўленні і развіцці творчай індывідуальнасці.

Прапануем увазе чытачоў урывак з раздзелу кнігі, прысвечаны праблеме мастацкага гістарызму ў творчасці Максіма Багдановіча.

Рыгор БЯРОЗКІН

СКАРЫНА, ПІСАР І НЕБА

ПЕРАЧЫТАЕМ вядомы Багдановічаў верш «Безнадзейнасць» (з цыкла «Старая Беларусь»), датаваны, прыкладна, тым самым часам, што гістарычныя творы Купалы:

Скарына, доктар лекарскіх навук,
У доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры.
Яны спрыяюць! Час! З рухавых рук
Скарыны п'е адвар пан земскі пісар хворы.
І ўраз пабачыў ён, што ізумруд
У пярсцёнку залатым на пальцы штось імгліцца,
Што блеску ў ім няма...
І з болем тут
Ён зразумеў, што ўжо к жыццю не вараціцца.

Кожная нацыянальная паэзія раней ці пазней ажыццяўляе пераход ад рамантычна-інтуітыўных «праглядаў» гісторыі, ад пошукаў аналогій у мінулым да сапраўды рэалістычнага гістарызму. У беларускай паэзіі гэты пераход звязаны першнаперш з імем Максіма Багдановіча, аўтара твораў накшталт «Безнадзейнасці».

Аляксандр Блок гаварыў пра рамантызм: ён «выклікае ў нас уяўленне аб нечым высокім, аб такім стаўленні да жыцця, якое перавышае наша штодзённае стаўленне».

Купалавы адносіны да мінулага таксама «нештодзённа»-ўзнёслыя, адносіны **генія** (у рамантычнай трактоўцы гэтага паняцця як вешчуна і прарока), і «продак», «першы» — яго папярэднік і дрататып.

Багдановіч жа дае ўсім нам і кожнаму з нас паасобку адчуванне **роўных** магчымасцей пазнаць і зразумець гісторыю: вось так, маўляў, і не інакш бачым мінулае, і я, паэт, і ты, чытач, — не сказаць пасрэднасці, проста звычайныя людзі, кінутыя ў свет з яго таямніцамі жыцця і смерці, і там, у мінулым, нас таксама чакаюць людзі, якія пазналі гатоўнасць «свабодна, самому пастаяць за ўласны ўчынак і ягоныя вынікі» (Гегель).

Што такое «Безнадзейнасць»? Першы, па сутнасці, твор беларускай паэзіі не ўвогуле аб рамантычным продку — аб рэальнай гістарычнай асобе, аб чалавеку, які вызначыў сваёю дзейнасцю цэлую эпоху ў развіцці айчыннай культуры.

Паэт бярэ Скарыну ў малатыповым, прыватным ракурсе: выдатны вучоны, выхаванец Падуанскага універсітэта, аўтар першага для ўсходнеславянскіх народаў царкоўна-астранамічнага календара, «сочыць зоры», як сярэднявяковы лекар-астролаг. Абраны паэтам ракурс сутыкнуў абумоўленыя гісторыяй тыпы культур, увасобленыя ў адным чалавеку, і аўтар неўпрыкметку дазваляе нам здагадацца, што гарачы прыхільнік і знаўца «астрономии или звездочети» Скарына і тут, у лекарскай сваёй пазіцыі, стараецца выпытаць у зор нешта большае за няшчасную пісараву планіду.

Для рамантыка Купалы мінулае — не канкрэтызаваная аналітычнай мастацкай думкай сфера падання і песні, якая жывіла паэта настроямі высокай годнасці і пратэсту супроць сучаснага яму жыцця.

Агульнага сэнсу «Безнадзейнасці» не ўспрымеш, не адкрыўшы культурна-псіхалагічнага «шыфру» кожнай канкрэтнай дэталі.

Ізумруд на пальцы пісара: ад старажытных егіпцян ішла традыцыя звязваць з кожным знакам Задзіяка пэўны каштоўны камень. Лічылася, што такі камень зберагае чалавека, які нарадзіўся пад гэтым знакам, і што ізумруд умее прадказваць будучыню таго, хто яго носіць.

Пацыент Скарыны, «доктара лекарскіх навук»,—пісар, важная службовая асоба ў Вялікім княстве Літоўскім, не раўня нейкаму валасному пісарчуку часоў Багдановіча.

Паэт мысліць паняццямі **той** эпохі, унікаючы анахранізмаў, характэрных для рамантычных стыляў. (Нагадаем пушкінскую крытыку «дум» Рылеева іменна за вольнае абыходжанне з гістарычнымі фактамі, падагнанымі пад сучаснасць).

Скупыя матэрыяльныя падрабязнасці ў Багдановіча лакалізуюць дзею, прывязваюць яе да рэальных гістарычных і бытавых абставін. Вежа — фрагмент тыповага архітэктурнага пейзажу. «Доўгая вопратка» на Скарыне — мантыя (дарэчы, яна ўдала «нарошчвае» яго і фізічна, і духоўна).

Псіхалагічная сітуацыя наглядна, як у рэалістычным жывапісе альбо ў тэатры, паглыбляецца прасторавай кампазіцыяй, прадуманай мізансцэніроўкай: Скарына стаіць, і яго дэталягляды — неба, зоры; пісар (хворы) сядзіць, і ягоны ўзровень — каменьчык у залатым пярсцёнку...

Мінулае для Багдановіча (і гэта ўжо відаць з «Безнадзейнасці») — чыста часавая катэгорыя, пэўны, акрэслены ўласным зместам культурна-гістарычны кантэкст. Прадметы і рэчы ўваходзяць у гэты кантэкст і займаюць месца ў ім адпаведна сапраўдным сваім маштабам і месцу, якое яны займалі ў рэальным часе і асяроддзі, адпаведна стылю і рытму сваіх уласных гістарычных пазіцый і паводзін.

Багдановічаў перапісчык, што «прыгожа літары выводзіць... устаўляючы паміж іх... чырвоную страку» і «ўсякімі цвятамі, розпакалёрнымі галоўкамі звяроў і птах... пакрашае... шматфарбныя застаўкі і канцоўкі», — фігура гістарычна тыповая і ледзь не дакументальна дакладная. Тагачасны перапісчык разглядаў сваю працу як мастацтва, а вялікія літары былі сапраўды малюнкамі пераважна алегарычнага зместу.

Алегарычны вобраз аленя з верша «Кніга», «герой» працытаванага Багдановічам старажытнага псалтыра («як той алень шукае крыніцы чыстай, так шукаю бога я») — вобраз таксама тагачасны, цалкам абумоўлены тыпам рэлігійнай маралістыкі — сярэднявякоўя. «Алень імкнецца да крыніцы не толькі дзеля таго, каб напіцца вады, але і каб падаць прыклад любові да бога» (Д. С. Ліхачоў). У гэтым алені захавана разам з тым і непасрэдная пачуццёвасць прадмета, яго гістарычная чысціня і «наіўнасць», душэўна асвоеныя сучасным чалавекам, гатовым рухацца далей: «Як вее свежасцю яе (кнігі. — **Р. Б.**) краса жывая! Як радасна далей спяшыць душа мая!»

Ды і сам «партрэт» старадаўняй кнігі беззаганна дакладны. «Псалтыр, пакрытую няжорсткай, бурай кожай, я ўзяў і срэбныя засцёжкі адамкнуў...» Пакрытыя скурай дошкі-вокладкі сцягваліся металічнымі зашчапкамі.

Строга дакументаваны ўзрост кнігі, і перапісчык, і месца яе нараджэння: «...Кнігу гэтую раб божы, дзяк Гапон, дзеля душы спісаў у месце Ваўкавыску ў рок сем тысяч сто васьмы з пачатку дзён».

Сапраўды мастацкі **вобраз** прадмета, твора матэрыяльна-духоўнай культуры, успрыятага лірычна. Вобраз Кнігі!

Храналагічна далёкае і зжытае гістарычна Багдановіч спыняе граматычна-цяперашнім часам. Летапісец і перапісчык, Скарына і ткачыхі — персанажы, даступныя нашаму простаму ўспрыманню, як завершаныя рэальнасці.

Вулканічнае, эмоцыяй і натхненнем выплаўленае слова Купалы змывала межы эпох, і мэта такога слова — не **вобраз** часу, а **перажыванне** ўсіх часоў, іх рамантычная «беспрыпыннасць», што «толькі ў песні ажыве». Такімі словамі не пішуць прозы з яе імкненнем да сацыяльна-бытавой канкрэтнасці і «дыялагізаванай сістэмай вобразаў «моў», стыляў... свядомасцей» (М. Бахцін).

Слова Багдановіча, прынамсі, у гістарычных яго творах,— неадымная частка і элемент пэўных культурна-бытавых уяўленняў, клетачка сацыяльнага і бытавога ўкладу ў тым сэнсе, як гаварылі пра слова Пушкіна лепшыя яго даследчыкі (В. У. Вінаградаў, напрыклад). І менавіта такое слова, каб раскрыцца найбольш, настойліва шукала сустрэчы з прозай.

Цудоўнае Багдановічава «Апавяданне аб іконніку і залатару...» (1914) астаецца ўзорам сапраўды мастацкай стылізацыі, моўнага і стылявога прыпамінання даўніны.

Абразок, мініяцюра, па сутнасці, «Апавяданне...» пазначана вельмі каштоўнай эпічнай якасцю: умельствам аўтара тлумачыць — і не вульгарна, тонка і на сюжэтна кароткім абсягу — перажыванні і ўчынкі «прыватнай» асобы аб'ектыўнай сацыяльна-бытавой заканамернасцю, узятай як рыса (хай і другарадная), як штрых эпохі.

Дробязь, не вартая, здавалася б, увагі будзённая падрабязнасць: два «мудрыя і красамоўныя» чалавекі, іконнік Якубовіч і залатар Корж, гадзіну-другую вядуць «бяседу», «мёд цёмна-бурштынавы смакуючы...» Багдановічу спатрэбілася не брага, не піва, а іменна мёд, бо «тады ж мяшчане віленскія з ласкі яго каралеўскай міласці і прывілей атрымалі, каб тры дні штогод перад святам нараджэння Ісуса Хрыста мёд варыць вольна, ні капшчызны, а ні васковага да скарбу не плоцячы». Дробная бытавая дэталь без усякай натугі прыўзняла заслону над сацыяльна, юрыдычна і рэлігійна рэгламентаваным грамадствам.

Сур'ёзную падставу меў У. І. Пічэта, калі яшчэ ў 1922 годзе адзначаў: «Вынік беларускае літаратуры і культуры, па думцы М. Багдановіча, ёсць яўленне агульнаеўрапейскага парадку, а не выключна толькі мясцовага».

У «Апавяданні аб іконніку і залатару...» гэты агульнаеўрапейскі характар мясцовай культуры падкрэслены самою тэмай размовы, якую вядуць Корж з Якубовічам: «Сальватор Роза, майстар умелы... да нашага краю з зямлі Італійскай прыехаўшы, абразы на мурах цэркваў полацкіх з вучнямі сваімі малюе, старыну ў маляванні гэтым рухаючы, а навіны ўводзячы».

Постаць слыннага ў свеце «італійца», рэальнага Сальватора Розы храналагічна ўдакладняе час — сярэдзіна XVII стагоддзя, — калі жылі, працавалі і рупіліся аб «размнажэнні дабра паспалітага» народжаныя рэалістычным вымыслам Багдановіча вядомыя ў Вільні і Полацку Якубовіч і Корж.

Мала сказаць, што «Апавяданне аб іконніку і залатару...» напісана **пра** старажытных беларускіх майстроў-рамеснікаў; яно напісана самою фактураю, самім матэрыялам іх рамяства-мастацтва: «Фарбамі кволымі на дашчэчках кляновых, гладка выструганых і крэйдаю загрунтаваных», «фарбаю трохграшовай ад золата ўгорскага, у агні пяць разоў ачышчанага».

Паколькі слова Багдановіча—пластычна-сэнсавае ўвасабленне канкрэтнага тыпу культуры, то варта паэту гэтае слова і звязаны з ім круг асацыяцый перанесці на «цяпершчыну», на сучаснасць, каб адразу матэрыялізаваўся, набыў прадметную форму надзвычай дарагі паэту матыў гістарычнай памяці.

Багдановіч піша пра «места», пра сучасную яму Вільню ламбардаў, пакгаўзаў, паравозаў:

Успамяні, маё сэрца, даўнейшыя дні!
Па загаду бурмістра усе, як належа,
Зачынілі ўжо вокны, загасілі агні...
Варта вулкай прайшла...
І не спім мы адны—
Я ды чорны нажан, што шнуруе ля вежы.

(«Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!»).

Рэалізаваная ў слове, і толькі ў слове, памяць пра «мінуўшыя дні» (пар. «Апавяданне аб іконніку і залатару...»: «Але ўжо ноч настала, і варта па вулках ішла, усім загадываючы, з наказу пана войта, агні гасіць і дзверы зачыняць») зрабілася **лірычнай** эмоцыяй чалавека, які добра адчувае жывую сувязь часоў.

Калі ў прыведзеным віленскім вершы матыў пераемнасці проста матываваны эмоцыяй («ўспамяні, маё сэрца...»), то ў другім, пра касцёл св. Анны, даўніна, і ўжо не штодзённа-практычная, а ідэйная і духоўная, «прарастае» як бы і незалежна ад свядомага аўтаравага намеру, аб'ектыўна, дзякуючы самому факту свайго спецыфічнага бытавання словам у фондах нацыянальнай мовы.

«Як лёгка да гары, як красна ўзносіць вежы ён свае! Іх очэрк стройны ў небе ясна ізломам строгім устае», — гэта пра славуты гатычны помнік у Вільні. «Паняцце красы абазначаецца тэрмінамі «стройна», «красна», — пішуць гісторыкі беларускай эстэтычнай думкі Э. Дарашэвіч і Ул. Конан, пачынаючы свой аналіз аж з беларускага варыянту воінскай аповесці «О побоище Мамая», дзе «князи Бълоозерскии зъ своими полками стройно ъхали», а другі князь «Москву реку перевезся на красном перевозъ...».

Купала, звяртаючыся да старажытнага пісьменства, чэрпае з яго перш-наперш пафас патрыятычнага подзвігу і адпаведныя гэтаму пафасу гучнасць, цвёрдасць, узнёсласць. Багдановіч — прыгожае, эстэтычную ацэнку, парадак, **меру**.

Купалаву даўніну **чуе**ш, быццам тыя грымоты акутага металам воіна ў адной з яго гістарычных паэм. Багдановічаву, апрадмечаную ў бронзе, дрэве і камені, **бачыш**.

Цікава з гэтага пункту погляду параўнаць два пераклады аднаго ўрыўка са «Слова аб палку Ігаравым» — Купалаў і Багдановічаў.

Купала, перакладаючы «Песню пра князя Ізяслава Полацкага», астаецца ў асноўным блізкі да арыгіналу: «Адзін ён жамчужную з храбрага цела выпусціў душу праз ажарэлле». Прапушчана слова «залатое» («злато ожерелье»). Багдановіч якраз акцэнтуе якасны эпітэт і наогул матэрыяльны **выраб**, прадмет, паслабляючы валявое, пафаснае напружанне фрагмента: «Ураніў самотна з цела ён душу ўдалую цераз пацерку на шыі, цераз залатую».

Хацеў гэтага Багдановіч ці не, але за плячыма ваякі моўчкі вырастае майстар, творца «красных» рэчаў. За Ізяславам Полацкім — ягоны зямляк і сучаснік, свабодны рамеснік Лазар Богша, аўтар славутага крыжа Ефрасінні...

Так, Янка Купала і Максім Багдановіч ішлі рознымі **творчымі** шляхамі, але мэта ў іх была адна: сцвердзіць нацыянальна-самабытны характар беларускай літаратуры, выпрацаваць найбольш адэкватныя яе зместу (хоць і неаднолькава трактаваныя) паэтычныя формы, вобразнасць, стыль.

Прынцыпы Купалавага гістарызму асацыіраваліся з прынцыпамі рамантыкаў, у прыватнасці рускіх рэвалюцыйных рамантыкаў пачатку мінулага стагоддзя.

Практыка Багдановіча прымушае звярнуцца да бессмяротнай практыкі і тэорыі Пушкіна і ўвогуле да праблемы пушкінскага ўплыву на класічную беларускую паэзію. Іменна там, па блізкіх да Пушкіна шляхах творчага пранікнення ў **сацыяльную** сутнасць гістарычных падзей і з'яў, чакае нас сустрэча з лепшым у спадчыне Багдановіча, у прыватнасці з такім шэдэўрам, як «Слуцкія ткачыхі».



Медсястра.

РАДАСЦЬ СУСТРЭЧЫ

У КАРЦІНАХ Л. Шчамялёва, яго партрэтах, пейзажах, нацюрмортах фарбы нібыта напоены сокамі зямлі. Іх рытм поўны меладычнасці, пластыка —своеасаблівасці. Гэта яго фарбы, яго рытм, яго пластыка, якія не зблытаеш з іншымі.

У свет, створаны жывапісцам, уваходзіш радасна і лёгка. Гэты свет адкрыты і ўсхваляваны, мужны і празрыста чысты. Людзі ім адзначаны спакойнай прыгажосцю, сканцэнтраванасцю, паглыбленасцю роздумаў «пра час і пра сябе». Мастак асэнсоўвае рэчаіснасць і дае ёй другое жыццё, адлюстроўваючы на палатне ў фарбах свае адносіны да навакольнага свету, свой роздум, свой настрой, сваю прыхільнасць, сваю любоў.

Шматлікія паездкі па краіне, сустрэчы з людзьмі знаходзяць шматграннае адлюстраванне ў творчасці Л. Шчамялёва. Вачамі мастака глядач убачыў Прыбалтыку і Запаляр'е, Крым і Арменію, Узбекістан і гарады Паволжа, Карэлію і Дагестан, і, вядома, родную Беларусь, якую ён носіць заўжды ў сваім сэрцы.

«Я аб'ездзіў амаль усю рэспубліку, — гаворыць Л. Шчамялёў. — Пабываў у многіх вёсках і гарадскіх пасёлках, на калгасных таках і на фермах. Толькі сёлета мне ўдалося добра і шмат папрацаваць на Міншчыне: у Ракаве, Івянцы, Валожыне. Пісаў у Прылуках і Траскаўшчызне, пабываў у Віцебску і Полацку».

Творчыя паездкі мастака — не выпадковыя эпізоды ў яго жыцці, без іх немагчыма яго мастацтва. Без іх немагчымы і тыя палотны, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне на ўсесаюзнай і міжнароднай арэне.

Л. Шчамялёў улюбёны ў сваю рэспубліку, у яе прыроду, у яе зямлю, у яе людзей. Ён шукае цудоўнае ў простых людзях, багатых вопытам пражытых гадоў або першым зззяннем юнацтва. Заўсёды яго героі пэўных і яркіх характараў. Умела абагульняючы вобразы, мастак узнімае іх да вышыні тыповага, знаходзіць у іх асаблівасці знешняга і духоўнага аблічча свайго народа. У гэтым сэнсе характэрнай з'яўляецца карціна «Сёстры», якая расказвае пра тры нялёгкія і непадобныя чалавечыя лёсы. Гэтыя жанчыны, кожная са сваім роздумам і ўспамінамі, учарашнія сялянкі, а сёння—гараджане, аб'яднаны агульнасцю псіхалагічных рысаў, сходнымі адносінамі да жыцця, да свету. Складаная палітра карціны, напружаная дынаміка, багацце светлавых прыёмаў існуюць не самі па сабе; колер, рытм, пластыка фігур, нацюрморт на стале, пейзаж горада, інтэр'ер пакоя аб'ядноўваюць усё, што звязана з адзінай думкай жывапісца — адлюстраваць роздум людзей аб пражытым жыцці, іх клопаты пра справы заўтрашнія.

Партрэт дзяўчынкі з Лошыцы напісаны мастаком зусім нядаўна. Сельская дзяўчынка даверліва і здзіўлена глядзіць на ззяючы фарбамі свет, у якім яна жыве. Партрэт «Марыны»— цудоўны вобраз юнацтва. Гаворачы пра лепшыя партрэты Л. Шчамялёва, міжволі збіваешся на слова «карціна». Гэта не партрэты ў традыцыйным разуменні, а хутчэй за ўсё тэматычныя палотны, дзе чалавек паказваецца не на фоне прыроды або рэчаў, а ў арганічнай сувязі з імі. Прырода, прадметы ў карцінах мастака дапамагаюць раскрыць своеасаблівасць людзей, і ў той жа час вобраз чалавека нібы адухаўляе наваколле.

А нацюрморты Л. Шчамялёва, створаныя ў творчых паездках, сведчаць аб тым, што з дапамогаю гэтага жанру можна вобразна вырашаць самыя складаныя тэмы. Такі нацюрморт «Прылуцкія яблыкі».

А вось пейзажы — яскравыя, маляўнічыя, звонкія. Вязынка і Валожын, Дукора і Прылукі, Крыжоўка і Радашковічы...

Наперадзе ў нас радасць новых сустрэч і новыя адкрыцці, якія прыносіць нам хвалюючы і цудоўны свет Леаніда Шчамялёва.

Б. КРЭПАК.

Карэлія, край суровы...

На будаўніцтве Серабранкі.

НА СЛУЖБЕ НАРОДУ

ШТОГОД 10 лістапада падраздзяленні гарнізона мінскай міліцыі ўскладаюць вянкі да помніка У. І. Леніну, Ф. Э. Дзяржынскаму, М. В. Фрунзе, абеліска Перамогі. У гэты дзень лепшыя супрацоўнікі і ветэраны міліцыі беларускай сталіцы, абласных і раённых цэнтраў ускладаюць кветкі на магілы і да мемарыяльных дошак, устаноўленых у гонар салдат правапарадку, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў. Наша міліцыя ў гэты дзень разам з усім савецкім народам адзначае сваё свята.

Будні міліцыі — гэта не толькі напружаная, часам кругласутачная праца, не толькі інтэлектуальны паядынак з праціўнікам. Гэта іншы раз і ўзброеныя сутычкі, рызыка і самаахвяраванне ў імя бяспекі і дабрабыту грамадзян, у імя іх спакойнай працы і адпачынку.

З году ў год расце інтэлектуальны ўзровень кадраў міліцыі, удасканальваецца кіраўніцтва, шырока выкарыстоўваюцца дасягненні навукі і тэхнікі.

Зараз у міліцыі працуюць кваліфікаваныя юрысты, педагогі, інжынеры, сацыёлагі, палітработнікі, эканамісты — людзі самых розных спецыяльнасцей. Усе яны шчодра аддаюць свае веды і вопыт справе ўмацавання правапарадку. Іх рады пастаянна папаўняюцца пасланцамі працоўных калектываў, дэмабілізаваных воінаў.

Партыя патрабуе ўзмацнення барацьбы з правапарушэннямі, адхіленнямі ад норм сацыялістычнага супольнага жыцця, ажыццяўляе комплекс маштабных мерапрыемстваў, якія забяспечваюць гарманічнае развіццё нашага грамадства, дзе значнае месца адводзіцца ўмацаванню савецкай міліцыі.

Вядома, што поспех любой справы залежыць ад ідэйна-палітычнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі работнікаў. Кожнаму супрацоўніку органаў унутраных спраў неабходны не толькі глыбокія веды па сваёй спецыяльнасці, але і ідэйная перакананасць, шырокі культурны кругагляд, уменне дыялектычна думаць, пэўныя педагагічныя і псіхалагічныя навыкі і многае іншае.

У гэтым плане неацэнную дапамогу кіраўніцтву органаў і падраздзяленняў унутраных спраў, палітработнікам аказваюць прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі рэспублікі. Мы ганарымся тым, што ў ліку выдатнікаў міліцыі значацца прозвішчы такіх вядомых у рэспубліцы і за яе межамі людзей, як народны мастак СССР Заір Ісакавіч Азгур, лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола, вядомы кампазітар Ігар Міхайлавіч Лучанок, народны артыст БССР Мікалай Мікалаевіч Яроменка, паэт Генадзь Мікалаевіч Бураўкін, пісьменнік Аляксандр Яўгенавіч Міронаў, скульптар Акім Рыгоравіч Курачкін і іншыя.

Супрацоўнікі органаў унутраных спраў нашай рэспублікі пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх органаў, у цесным узаемадзеянні з шырокай грамадскасцю дабіліся добрых вынікаў у справе аховы грамадскага парадку і ў барацьбе са злачынасцю.

Новы прыліў творчай энергіі, палітычнай і працоўнай актыўнасці ў супрацоўнікаў органаў унутраных спраў рэспублікі, як і ва ўсіх працаўнікоў нашай Радзімы, выклікалі рашэнні Пленума ЦК КПСС, які адбыўся нядаўна, і пятай сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

Партыя заклікае паляпшаць якасныя паказчыкі работы, шырэй разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва. Адказваючы на гэта справай, супрацоўнікі беларускай міліцыі ва ўзаемадзеянні з грамадскасцю дабіваюцца далейшых поспехаў у прафілактыцы правапарушэнняў.

Б. МАЗАЛЕЎСКІ,
капітан міліцыі, старшы інструктар аддзела палітыка-выхаваўчай работы МУС БССР.

На здымку: выдатнікі міліцыі ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкома лейтэнант В. Стрык і капітан А. Германенка.

ТЭАТР

З вялікім задавальненнем успрыняла наша грамадскасць пастанову ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю». Партыя зноў праявіла бацькоўскі клопат аб далейшым лёсе нашай літаратуры і мастацтва, аб выхаванні высокакваліфікаваных, ідэйна ўзброеных маладых майстроў, якім трэба будзе яшчэ доўгія гады развіваць, узбагачаць лепшыя здабыткі айчыннай і сусветнай культуры, плён дзейнасці сваіх старэйшых сяброў па творчасці.

У гістарычным аспекце прафесіянальнае мастацтва Беларусі, перш за ўсё музычнае, — вельмі маладое. У многіх жанрах яно з'яўляецца равеснікам Савецкай улады ў нашай рэспубліцы і пачыналася амаль «з нуля». Так было, напрыклад, з оперным і балетным выканаўствам, першы плён якога праявіўся толькі ў пачатку 30-х гадоў, калі ўпершыню ў гісторыі Беларусі былі адкрыты Дзяржаўная студыя оперы і балета, а праз некаторы час на яе базе—Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР. Першымі іх выхаванцамі і артыстамі былі вельмі маладыя тады, потым вядомыя майстры Л. Александроўская, С. Друкер, Р. Млодзік, А. Нікалаева, І. Балоцін, М. Дзянісаў, С. Дрэчын, Я. Вяпрынскі і іншыя. У пасляваенны час захавалася традыцыя запрашаць у трупу тэатра маладых артыстаў. Асабліва прыкметна гэты правільны шлях спалучэння ў мастацкім калектыве майстэрства старэйшых выканаўцаў з непасрэднасцю пачуццяў, абаяльнасцю, выгоднымі сцэнічнымі дадзенымі творчай моладзі ў нашым тэатры оперы і балета праявіўся ў апошнія некалькі гадоў. Нездарма ў 1974 годзе Дзяржаўны акадэмічны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета Беларускай ССР быў узнагароджаны першай Усесаюзнай прэміяй Міністэрства культуры СССР за лепшае ў краіне выхаванне творчай моладзі. У жніўні бягучага года, пасля правядзення на базе гэтага ж тэатра Першага Усесаюзнага фестывалю маладых артыстаў і пастаноўшчыкаў тэатраў оперы і балета — пераможцаў агляду работы тэатраў з творчай моладдзю, зноў была дасягнута вялікая перамога. У фестывалі прымалі ўдзел каля ста маладых артыстаў, дырыжораў, балетмайстраў, мастакоў, канцэртмайстраў краіны. Сярод іх — 23 прадстаўніка творчай моладзі нашага тэатра. І ўсе яны былі адзначаны прэміямі Міністэрства культуры СССР, як і іх выхавацелі—галоўны дырыжор тэатра Я. Вашчак, галоўны балетмайстар — В. Елізар'еў, галоўны хормайстар — А. Кагадзееў, дырэктар тэатра — М. Шаўчук і іншыя.

Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» папрасіў Мікалая Панцеляймонавіча Шаўчука расказаць на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», як Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР плануе сваю работу з маладымі выканаўцамі ў святле пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю».

Мікалай ШАЎЧУК:

«ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ— ШЫРОКІЯ ДАЛЯГЛЯДЫ»

—НЯГЛЕДЗЯЧЫ на тое, што ў апошнія гады наш тэатр меў пэўныя поспехі ў рабоце з маладымі салістамі оперы і балета, дырыжорамі, мастакамі, артыстамі аркестра і хору, што гэта работа станоўча адзначана ў загадах Міністэрства культуры СССР, пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю» паказала, што мы робім далёка не ўсё неабходнае, каб выхаваць малады талент. Перш за ўсё, трэба нам вызначыць доўгатэрміновыя планы работы з маладымі артыстамі. Такія планы садзейнічаюць бачанню перспектывы росту мастака, спрыяюць большай адказнасці і выхавацеляў, і выхаванцаў, даюць магчымасць больш грунтоўна рыхтаваць рэпертуар тэатра, кожную партыю маладога выканаўцы, вызначаць тэрміны пастаноўкі, колькасць рэпетыцый з канцэртмайстрам і кіраўнікамі пастановак. Уся гэта работа будзе ўлічваць не толькі вытворчыя інтарэсы тэатра, але і асабістыя пажаданні творчай моладзі, яе пошук сябе ў мастацтве, яе імкненне да найбольш яркага раскрыцця індывідуальнасці.

Складанне пяцігадовых індывідуальных творчых планаў для моладзі прадугледжвае своеасаблівую ва ўмовах мастацтва сістэму настаўніцтва. Справа гэта вельмі складаная і дзлікатная, бо ў тэатрах маладыя часам не прызнаюць вопыту, дасягненняў старэйшых артыстаў, а гэтыя апошнія не заўсёды шукаюць творчыя кантакты з маладымі, добразычліва ставяцца да іх творчых пошукаў. Таму мы плануем вечары сустрэч-успамінаў артыстаў абодвух пакаленняў, сумесную работу іх над тымі ж партыямі, абмеркаванні лепшых творчых дасягненняў і да т. п.

Сталая сістэма павышэння акцёрскага майстэрства моладзі — гэтае патрабаванне таксама вынікае з пастановы ЦК КПСС. Заняткі па грыму, дыкцыі, рытма-пластыцы, сцэнічнаму руху, танцу, фехтаванню стануць у практыцы тэатра штодзённым абавязкам кожнага маладога выканаўцы. Тут нам добрую дапамогу аказвае Беларускае тэатральнае аб'яднанне, вылучаючы за свой кошт выкладчыкаў і кансультантаў. На жаль, нашы кансерваторыі звяртаюць на гэтыя галіны падрыхтоўкі сваіх выхаванцаў вельмі малую ўвагу.

Моладзь трэба не толькі вучыць, трэба і прапагандаваць яе творчыя дасягненні. Гэта ўзнімае яе мастакоўскую адказнасць перад калектывам і грамадскасцю, стымулюе актыўнасць. Мы ўвялі практыку спецыяльных афіш з партрэтамі дэбютантаў. Гэтак былі ўжо адзначаны Л. Колас і М. Жылюк (Разіна і Фігара ў спектаклі «Севільскі цырульнік»), Т. Яршова і А. Мартынаў (Адылія-Адэта і прынц у спектаклі «Лебядзінае возера»), П. Паўлава (спектакль «Стварэнне свету»).

Для лепшых дэбютантаў мы плануем ганаровыя граматы, падрыхтоўку матэрыялаў для публікацыі ў перыядычным друку, перадач па тэлебачанню і радыё. Мяркуем выпуск спецыяльных тэатральных бюлетэняў аб падрыхтоўцы да наступных Усесаюзных аглядаў і фестываляў творчай моладзі. Акрамя запрашэння буйных майстроў краіны для творчых кансультацый, нашы маладыя пройдуць стажыроўкі ў вядучых тэатрах Савецкага Саюза. Пад новым выхаваўчым ракурсам мы павінны весці стажыраванне студэнтаў кансерваторыі на нашай оперыай сцэне.

Усе гэтыя жыццёва патрэбныя мерапрыемствы па сапраўды творчай падрыхтоўцы маладых выканаўцаў неадрыўныя ад палітыка-выхаваўчай работы з імі. Сістэма партыйнай асветы, семінары па філасофіі і эстэтыцы, па бягучай палітыцы і вывучэнню матэрыялаў XXV з'езда КПСС, прамоў таварыша Л І. Брэжнева па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі нашай партыі ахапілі ўсіх маладых выканаўцаў нашага тэатра. Яны маюць шырокія магчымасці працаваць і ў грамадскіх арганізацыях, і ў камітэце камсамола, і ў мясцовым прафсаюзным камітэце тэатра, і займацца шэфскай дзейнасцю на прадпрыемствах, у калгасах, воінскіх часцях, з якімі стала сябруе наш калектыў. І трэба сказаць, што тэатральная моладзь шчыра адказвае на гэтае давер'е, зацікаўлена ставіцца да шэфскіх канцэртаў, да выканання грамадскіх абавязкаў.

Мы па праву ганарымся, што ў нашым тэатральным калектыве столькі маладых, таленавітых выканаўцаў, такіх, як народная артыстка БССР Л. Бржазоўская, як лаўрэаты ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў А. Дзедзік, М. Зданевіч, Б. Кучынскі, А. Рудкоўскі, В. Саркісьян, Л. Сінельнікава, Л. Шамчук, Т. Яршова і іншыя, чые імёны ўжо вядомы далёка за межамі рэспублікі і краіны. Дзяржаўны акадэмічны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета Беларускай ССР прыкладзе ўсе намаганні, каб творчая моладзь і надалей мела шырокія мастацкія далягляды. Гэта будзе дастойным адказам калектыву тэатра на акрыляючую пастанову Цэнтральнага Камітэта КПСС.

ПРЭМ'ЕРА РАДЫЁТЭАТРА

«МОЙ РОДНЫ КУТ...»

У ЭФІРЫ з'явіўся новы спектакль і пачаў свой шлях да сэрца слухачоў. Напэўна, ужо ідуць у рэдакцыю водгукі, пісьмы, і ёсць у іх роздум, заўвагі, заяўкі...

Калі я ўпершыню слухала спектакль, успрымала ўсё як штосьці першароднае. І доўга потым захоўвалася нейкая радасць у душы. Я жыла пачуццём удзячнасці. Удзячнасці Паэту! Яго Сэрцу. Яго Дабру. Яго Надзеям.

Удзячнасць...

Я не крытык і таму не бяру на сябе смеласць рэцэнзаваць работу маіх калег і сяброў. Я проста сама многа працую на радыё і ведаю складанасць увасаблення спектакля такой формы і такога зместу. Бо трэба аб'яднаць у адно цэлае паэтычнае слова і музыку. Радыётэатр мае свае законы. Мы — артысты тэатра — любім сваю прафесію за магчымасць сёння вось тут, зараз весьці размову з глядзельнай залай, адчуваць подых, увагу, хваляванне, настрой залы... Радыё дае магчымасць выказацца як бы сам-насам: артыст нібы прыходзіць да слухача ў яго дом і вядзе размову з ім, вось з гэтым чалавекам, расказвае яму пра героя і пра час.

Для такога выканання і рабілася драматургія паводле паэмы Я. Коласа «Новая зямля», увасаблялася ў вобразы. Першы клопат аўтараў спектакля — захаваць першаснову паэтычнага, філасофскага і эмацыянальнага ладу паэмы. Алесь Петрашкевіч надзвычай уважліва і ўлюбёна рабіў інсцэніроўку, рэжысёр Соф'я Гурыч, дакладна адчуўшы сутнасць п'есы, трапна размеркавала ролі (гэта вельмі важна — ўгадаць выканаўцаў!), артысты ўвасобілі задуму з вялікім тактам. Мне здаецца, што ўдзельнікі спектакля правільна вызначылі ідэйную сутнасць твора і стылістыку аўтара. Знойдзена дакладнае гукавое дыханне і вобразны ход вакальнага ўвасаблення. Дарэчы, гэты ход тут вельмі ўдалы: тэма роднага кута.

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!

І ў раскрыцці вобраза роднага кута вялікую ролю адыгрывае голас спевака, тэмбр, каларыт выканання музыкі, за якую трэба сказаць дзякуй кампазітару. У арганічным перапляценні паэтычнага слова, музычнай мовы і характараў — сіла гэтага гучання. Ігар Лучанок і яго музыка — дзейная асоба радыёспектакля «Новая зямля».

У спектаклі заняты акцёры-купалаўцы, і гэта таксама разумна, бо ансамблевая цэласнасць і адзіная творчая манера надзвычай важная ўмова ўзаемаразумення выканаўцаў.

Віктар Тарасаў чытае тэкст «Ад аўтара». Мне падалося, што калі б дзядзька Колас пачуў у яго выкананні свае думкі, ён быў бы вельмі задаволены. З першага слова, з першай карціны, з першых разважанняў паэта артыст бярэ нас у палон, вядзе за сабой, прымушае слухаць поўную эмацыянальнага хараства мову.

Зварот пары, знікненне лета...
То—водгулле душы паэта,
То смутны вобраз развітання,
То—струн дрыгучых заміранне,
Натхнёнай песні жаль сардэчны,
Жыцця і смерці—сымбаль вечны!..

Нельга такое слухаць абыякава! Гэта — камертон твора, і хочацца паглыбіцца ў плынь маляўнічай мовы, хочацца мысліць гэтымі катэгорыямі.

Ролю Міхала выконвае Генадзь Гарбук. На маю думку, гэта адна з лепшых работ артыста пасля Васіля («Людзі на балоце» І. Мележа). У новай якасці праявіла сябе Марыя Захарэвіч: мацярынская туга і боль, трывога і радасць, надзея і вера, жаночая сіла і абаяльнасць дадзены ў цесным сплаве слова і пачуцця. Для мяне было цікава чуць Антося (Павел Дубашынскі), бо яснымі рабіліся яго роздум, разважанні, свет яго веры. Хітрынка, якая звініць у Антося, гэта ў пэўнай ступені хітрынка самога аўтара: ён, Якуб Колас, не толькі паэт у паэме, ён у кожным характары адлюстраваны сваім розумам і пачуццём.

У паэме, а значыць і ў спектаклі, вельмі пераканальна гучыць кожная метафара, кожны вобраз. Родная зямля — гэта і родны кут, і надзея, гэта мара і вечнае імкненне да лепшага, да ўдасканалення жыцця. Родная зямля — гэта любоў да радзімы, гэта нешта кроўнае, вялікае, чалавечнае. Родная зямля — гэта вечна жывы працэс, вечна жывая тэма, шматзначная, шматгранная, аб'ёмная...

Спектакль «Новая зямля»—хвалюючая, па-сапраўднаму сучасная пастаноўка, бо радыётэатр тут вядзе з намі, з людзьмі 70-х гадоў, размову, якая дае магчымасць сучаснаму чалавеку абдумаць мінулае, па - грамадзянску ацаніць рэальнасць, адлюстраваную паэтам, як і высокую эстэтычную вартасць паэмы.

Ой вы, дарожанькі людскія,
Пуцінкі вузкія, крывыя!
Вы следам цьмяным снуяцеся
І ўсё блукаеце, бы ў лесе...

Так, нялёгкія былі шляхі-дарогі чалавека, і не ўсё проста ў складанасцях жыцця той пары. Каб новы свет жыцця спаткаць, трэба ведаць глыбіню пошукаў, трывогу і радасць, трэба ўслухацца ў сваё ўласнае сэрца і там знаходзіць водгук на боль людскі...

Радыёспектакль прымушае задумацца, прымушае хвалявацца, а гэта — галоўнае. Людзі таму і людзі, што ім уласціва ўглядацца ў саміх сябе, і паэма Якуба Коласа дапамагае нам гэта зрабіць. А значыць яна — сучасная і па-грамадзянску вельмі патрэбная.

Зінаіда БРАВАРСКАЯ,
народная артыстка БССР.

50

Фрагмент здымка сярэдзіны 20-х гадоў. На ім мы бачым народных артыстаў СССР А. Ільінскага і П. Малчанава (першы справа ў другім радзе і трэці справа ў трэцім радзе), заслужаных дзеячаў мастацтваў БССР Л. Мазалеўскую і М. Міцкевіча (чацвёртая злева ў трэцім радзе і другі злева ў другім радзе), народных артыстаў БССР С. Станюту, Р. Кашэльнікаву, А. Радзялоўскую і І. Матусевіч (першая злева ў другім радзе, першая таксама злева ў трэцім радзе, першая справа ў трэцім радзе і другі справа ў першым радзе), заслужаных артыстаў БССР А. Лагоўскую і Л. Шынко (трэцяя злева ў першым радзе і трэцяя злева ў трэцім радзе), вядомага пазней цымбаліста заслужанага артыста БССР С. Навіцкага (першы справа ў першым радзе).

З архіўнага фота.

21 лістапада 1926 года адкрылася заслона тэатра, які тады меў назву Другога БДТ (цяперашні купалаўскі быў пазначаны як Першы БДТ). І вось паўстагоддзя мінае з таго ўрачыстага і незабыўнага дня, калі грамадскасць рэспублікі вітала пачатак дзейнасці другога ў гісторыі нашай культуры прафесіянальнага драматычнага тэатра. Старонкі творчай біяграфіі калектыву зіхацяць імёнамі дарагімі для ўсіх, хто разумее і цэніць значэнне сцэнічнага мастацтва ў ідэйна-эстэтычным выхаванні працоўных мас. Ветэранаў трупы Другога БДТ (Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра імя Якуба Коласа) ведае краіна, ім нададзены высокія ганаровыя званні, іх творчыя здабыткі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.

Гэта ім, выхаванцам Беларускай тэатральнай студыі, што на пачатку 20-х гадоў былі накіраваны на вучобу ў Маскву, належаў гонар быць першымі выканаўцамі на беларускіх падмостках твораў Шэкспіра і Пагодзіна, Горкага і Коласа, Лаўранёва і Чорнага, Мальера і Шылера, п'ес, якія ніколі раней не гучалі на мове нашага народа. Гэта яны, засвоіўшы прагрэсіўнае вучэнне Станіслаўскага аб мастацтве артыста рэалістычнай школы, фарміравалі аблічча самабытнага і мабільнага творчага калектыву артыстаў-аднадумцаў, паплечнікаў, здатных дэманстраваць дасканалы ансамбль выканаўцаў адзінай ідэйна-творчай задумы спектакля.

Перад намі фрагмент здымка першага складу трупы Другога БДТ сярэдзіны 20-х гадоў. Мы бачым некаторых прадстаўнікоў студыйцаў, што былі заснавальнікамі тэатра. Многія з іх пазней праславіліся як выдатныя майстры сцэнічнага пераўвасаблення і самастойнай трактоўкі класічных вобразаў і партрэтаў сучаснікаў. Карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» папрасіў народнага артыста БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Цімоха Мікалаевіча Сяргейчыка падзяліцца сваімі думкамі, якія абуджае ў яго архіўны здымак.

Цімох СЯРГЕЙЧЫК,
народны артыст БССР:

ПАЧЫНАЛІ З «КОЛАСАЎЦЫ ПОШУКАЎ...»

—ВЯСНОЙ дваццаць шостага года мы развіваліся з Масквой і адчувалі нейкі светлы сум. Здавалася, што яшчэ штосьці застаецца нам пачэрпнуць з глыбіняў навукі аб тэатры, што варта было б яшчэ параіцца з педагогамі. І адначасова было зразумела, што патрэба маладога артыста ў кантактах з настаўнікамі, мабыць, ніколі не можа быць канчаткова задаволена, бо з кожным новым спектаклем нашы ж настаўнікі пад кіраўніцтвам самога Станіслаўскага ці яго паплечнікаў — таго ж Вахтангава або Міхаіла Чэхава — самі ідуць далей. Працэс ўзбагачэння акцёрскага вопыту бясконцы!

Наўрад ці ўсе, хто пазней атрымаў права называць сябе артыстам-коласаўцам, тады здагадваліся, што Віцебск—гэта не часовая гавань такога карабля, як тэатр, а наш жыццёвы і творчы лёс: тут нам наканавана было выпрацоўваць адзіны метад і свой адметны стыль, гартаваць прафесіянальныя здольнасці. Помню, што горад, які і раней даволі інтэнсіўна жыў культурным жыццём, прыняў калектыў добразычліва. І нам патрэбна была такая атмасфера — даверу, зацікаўленасці ў нашым росце, патрабавальнасці. Бо пачыналі мы з творчых пошукаў.

Масква паказала нам узоры акцёрскіх паглыбленняў у драматургічны свет Горкага і Чэхава, Астроўскага і Луначарскага,мы былі далучаны да некаторых «таямніц» сістэмы Станіслаўскага, бачылі, без перабольшання магу сказаць, шэдэўры на сцэне... Ды нашы настаўнікі катэгарычна патрабавалі, каб мы не пераймалі нават самыя спакуслівыя ўзоры. «Захавайце вернасць самім сабе, і ваш талент паслужыць узбагачэнню нацыянальнай скарбніцы мастацтва, а інакш ваша дзейнасць звядзецца да эпігонства», — так прыблізна пераконвалі нас і Смышляеў, і Гіяцынтава, і Афонін. Быць самім сабой акцёру не так лёгка, як гэта можа здавацца, бо мы ж звязаны з рэжысурай спектакля, уваходзім у ансамбль вялікай часам групы калег, і тут артыста падсцерагае многа розных перашкод.

Практыка паказала, што мы прыслухоўваліся да парад нашых настаўнікаў, што ў трупе панаваў настрой высокай патрабавальнасці. Прыгадваю спектаклі «Разлом», «Першая конная», «Байцы», «Гібель эскадры». Другі БДТ ставіў некаторыя з гэтых п'ес пасля таго, як на рускай сцэне ім была дадзена арыгінальная і яскравая трактоўка, прызнаная гледачамі і крытыкай. Нашы спектаклі мелі адзнаку творчага пошуку і ніколі не паўтаралі таго, што было адкрыта Малым тэатрам або ленінградцамі, вучнямі Мейерхольда ці Дзікага.

Аляксандр Ільінскі і Мікалай Міцкевіч, Раіса Кашэльнікава і Алена Радзялоўская, Павел Малчанаў і Стэфанія Станюта, Кастусь Саннікаў і Марыя Сянько... Я мог бы называць імёны амаль кожнага з заснавальнікаў тэатра, дадаючы да яго эпітэты «яскравы», «тэмпераментны», «узруша н ы», «палымяны», «дасціпны», «вынаходлівы», але, спадзяюся, што гэта да юбілею зробяць крытыкі і аўтары спецыяльных выданняў (доктар мастацтвазнаўства У. Няфёд выдае кнігу, прысвечаную дзейнасці коласаўцаў за пяцьдзесят гадоў, БТА выпусціла спецыяльны нумар бюлетэня «Т э а т р а л ь н ы Мінск»). Заўважу толькі такую акалічнасць. Трупа Другога БДТ не адразу «адарвалася» ад сваіх настаўнікаў: Валянцін Смышляеў і Барыс Афонін яшчэ доўга назіралі за нашымі першымі самастойнымі крокамі, ставілі з намі спектаклі, кансультавалі акцёрскія і рэжысёрскія работы, ды зрэшты—проста «былі» пры нас у Віцебску. А супольная дзейнасць, нават размовы аб тым, што і як было на сцэне ўчора, для людзей тэатра маюць вялікае значэнне.

Таму, прыгадваючы пачатак дзейнасці коласаўцаў, перш-наперш я хачу ад імя сваіх калег выказаць шчырую падзяку нашым настаўнікам. Яны навучылі нас і фактычна заклалі традыцыі заўсёднага пошуку і грамадзянскай незадаволенасці зробленым, без чаго рух наперад у мастацтве немагчымы. Вядома, у дзень прэм'еры, адчуваючы хваляванне, коласаўцы часта віншавалі і віншуюць адзін аднаго з творчым поспехам, а ў некаторых выпадках і з творчай перамогай. І гэта справядліва. Ды доўга жыць адчуваннем дасягнутых вяршыняў мастаку шкодна! І коласаўцы, як усе мы памятаем, пасля дружных апладысментаў залы і пасля высокіх ацэнак на старонках прэсы зноў і зноў вярталіся і вяртаюцца да спектакляў, каб іх удасканаліць, дамагчыся гармоніі і суладдзя. Так было, калі мы іграли «Вайну вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Чалавека з ружжом» М. Пагодзіна, і «Гамлета» Шэкспіра, «Несцерку» В. Вольскага і «Мяшчан» М. Горкага, «Дзяцей Ванюшына» С. Найдзёнава і «Раскіданае гняздо» Я. Купалы... Зноў жа я не хачу стамляць спісам. Лепшыя спектаклі тым і вызначаліся, што яны не былі раз і назаўсёды скамянелым варыянтам сцэнічнага ўвасаблення. Як ззяла імправізацыйнае майстэрства А. Ільінскага ў «Рэвізоры»! Колькі знаходак бывае ў Ф. Шмакава, калі ён стварае вобраз сучасніка ў «Снежных зімах» або ў «Таблетцы пад язык»!..

Вось і ў гэтыя дні, святкуючы юбілей, коласаўцам варта, на маю думку, прыгадаць і перадаць, як эстафету, новым пакаленням пачуццё адвечнага творчага неспакою, імкненне шукаць самыя лепшыя мастацкія сродкі для служэння вялікай мэце — выхаванню людзей у духу камуністычных ідэалаў. Як адзін з першых коласаўцаў, мушу сказаць, што патэнцыяльна наша трупа сёння мае такі запас энергіі. Дык жа хай і яе «заўтра» будзе новым крокам у мастацтве!

Сучасная тэматыка заўсёды была і застаецца ў цэнтры творчай увагі коласаўцаў. Бывае, яны ставяць арыгінальную п'есу першымі і даюць ёй пуцёўку ў жыццё на сцэне, бывае, выступаюць пасля прэм'еры ў Мінску або Маскве, як гэта здарылася з камедыяй «Таблетку пад язык» А. Макаёнка, але і тады знаходзяць адметнае рэжысёрскае і артыстычнае вырашэнне. Гастролі ў Маскве сёлета пацвердзілі рэпутацыю тэатра як смелага шукальніка ў мастацтве. Асабліва высока быў ацэнены гэты спектакль, пастаўлены А. Смеляковым (сцэнаграфія А. Салаўёва, музыка Б. Насоўскага). Гледачы і крытыка адзначылі яскравыя работы народнага артыста БССР Ф. Шмакава (Уладзімір Каравай), народных артыстаў БССР І. Матусевіча, А. Труса і З. Канапелька (дзед Цыбулька, Крандзялёў, Аксана Смятанкіна), заслужаных артыстаў БССР Т. Кокштыса, Т. Шашкінай і іншых удзельнікаў спектакля.

На здымку—народны артыст СССР Фёдар Шмакаў і артыстка Любоў Нісневіч (Тамара) у спектаклі «Таблетку пад язык».

Фота Ул. КРУКА.

З пошты «ЛіМа»

З выстаўкай на БАМ

Маладзечанцы добра памятаюць выстаўку «Айчыны верныя сыны», прысвечаную 150-годдзю паўстання дзекабрыстаў, якая дэманстравалася ў канферэнц-зале Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэкі імя Н. К. Крупскай. Арганізатары выстаўкі — кіраўнік бюро тэхнічнай эстэтыкі вытворчага аб'яднання «Маладзечнадрэў» М. Чайкін і аматар фота- і кінасправы А. Фяцісаў сабралі фотакопіі дакументаў таго часу, ілюстрацыі, рэпрадукцыі з выданняў. Сярод іх — успаміны прафесара Белагаловага, які лячыў дзекабрыстаў (1897 г.), кнігі «Вялікая рэформа», «Айчынная вайна 1812 года і рускае грамадства», выдадзеныя Сыціным, «Палярная зорка» і іншыя. Экспанавана на выстаўцы і карціна Я. Раздзялоўскай, прысвечаная гераічным жанчынам Расіі — верным сяброўкам дзекабрыстаў.

Выстаўка дэманстравалася таксама ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Супрацоўнікі музея падказалі аўтарам ідэю паказаць выстаўку ў мясцінах, звязаных са знаходжаннем дзекабрыстаў, менавіта там, дзе зараз будуецца Байкала-Амурская магістраль.

Нядаўна гэтая ідэя была ажыццёўлена. М. Чайкін і А. Фяцісаў у складзе прапагандысцка-мастацкай групы, сфарміраванай ЦК ВЛКСМ, разам з агітпоездам «Комсомольская правда» пабывалі на БАМе. З выстаўкай пазнаёміліся сотні бамаўцаў.

І. ГАЛУБОВІЧ,
супрацоўнік Маладзечанскага райвыканкома.

МАРШРУТЫ АМАТАРАЎ

Далёка за межамі Мсціслаўскага раёна вядомы калектыў мастацкай самадзейнасці Мазалоўскага сельскага Дома культуры. Самадзейныя артысты часта выступаюць перад хлебаробамі суседніх Крычаўскага, Чавускага, Чэрыкаўскага і іншых раёнаў Магілёўскай і Хіславіцкага раёна Смаленскай абласцей.

Вось і нядаўна яны былі гасцямі рабочых саўгаса «Жалезінскі» Слаўгарадскага раёна. Цёпла прынялі гледачы выступленні сясцёр Наташы і Любы Рыжанковых, братоў Анатоля і Пятра Хомчанкаў, Наташы Шаўцовай, Тамары Новікавай, Лены Гурковай, Мікалая Рыжанкова і іншых. У іх выкананні прагучалі беларускія і рускія народныя песні. Доўгімі апладысментамі былі сустрэты танцы «Крыжачок», «Лявоніха», «Гапак» і іншыя.

У. СКУЛЬБЕДАЎ.

Развітанне. Фотаэцюд В. ЗЯНЬКО.

ЗАХАПЛЕННЕ—ПА ЭЗІЯ

За апошні час рэдакцыя штотыднёвіка надрукавала рад праблемных матэрыялаў па выніках другога туру Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных. Былі апублікаваны артыкулы народнага артыста СССР Г. Цітовіча (7 мая), заслужаных дзеячаў культуры БССР М. Солапава (2 ліпеня), А. Лукомскага (11 чэрвеня) і Д. Жураўлёва (28 ліпеня), доктара мастацтвазнаўства Ю. Чурко (9 ліпеня), музыказнаўцы А. Ракавай (18 чэрвеня), выкладчыка інстытута культуры В. Данкюпаса (30 ліпеня), заслужанага артыста БССР А. Майзлера (9 красавіка) і іншых.

Загадчык культурнамасавага аддзела Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў Л. Сушкевіч і дырэктар Рэспубліканскага Дома мастацкай самадзейнасці Т. Курыла паведамілі рэдакцыі, што апублікаваныя матэрыялы абмеркаваны ў аддзеле і Доме мастацкай самадзейнасці. Далей у адказе гаворыцца, што «аўтары артыкулаў закранулі рад актуальных праблем далейшага развіцця народнай творчасці. У артыкулах правільна адзначаюцца недахопы ў рабоце многіх самадзейных калектываў.

Зараз прымаюцца канкрэтныя захады, каб ліквідаваць указаныя ў артыкулах недахопы.

Аўтары большасці артыкулаў адзначалі недахоп высокакваліфікаваных кіраўнікоў харавых, харэаграфічных і музычных калектываў, агітацыйна-мастацкіх брыгад, калектываў бальнага танца. Для падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў аматарскіх калектываў Рэспубліканскі Дом мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа распрацаваў і ажыццяўляе пэўную сістэму вочна-завочнай вучобы кіраўнікоў самадзейных калектываў розных жанраў, і перш за ўсё тых спецыяльнасцей, навучанне па якіх не наладжана ў навучальных установах мастацтва і культуры Беларусі.

Сакратарыят Белсаўпрофа зацвердзіў перспектыўны план падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў работнікаў установаў культуры прафсаюзаў рэспублікі на 1976—1980 гг. Усімі формамі вучобы за пяцігоддзе будзе ахоплена 23.575 клубных работнікаў і кіраўнікоў самадзейных калектываў.

Разам з тым, лічым, што гэта цалкам не вырашыць праблему падрыхтоўкі кіраўнікоў самадзейнасці. На наш погляд неабходна значна пашырыць падрыхтоўку гэтых спецыялістаў у адпаведных навучальных установах сістэмы Міністэрства культуры БССР і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Што датычыцца крытычных заўваг газеты адносна рэпертуару калектываў самадзейнасці — удзельнікаў Усесаюзнага фестывалю, то Рэспубліканскі Дом мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа абмеркаваў гэтае пытанне на пасяджэнні мастацкага савета. Рэкамендавана дамам мастацкай самадзейнасці аблсаўпрофаў у бліжэйшы час ліквідаваць недахопы ў гэтай важнай справе, павысіць адказнасць жанравых секцый і рэпертуарна-бібліяграфічных аддзелаў дамоў мастацкай самадзейнасці за стан рэпертуару, сістэматычна вывучаць і зацвярджаць рэпертуарныя планы, прыём новых канцэртных праграм і спектакляў у самадзейных калектывах.

Рэспубліканскі Дом мастацкай самадзейнасці сумесна з Домам народнай творчасці рыхтуюць да выпуску «Рэпертуарны лісток». Гэта паспрыяе аператыўнаму знаёмству калектываў з навінкамі рэпертуарнай літаратуры. Для павышэння ідэйнай і мастацкай вартасці рэпертуару самадзейных мастацкіх калектываў Белсаўпроф сумесна з Міністэрствам культуры БССР і Дзяржкамвыдам БССР распрацоўваюць сістэму мер. У 1977 годзе, напрыклад, прадугледжваецца выданне спецыяльных рэпертуарных зборнікаў па тэматыцы, зацверджаных Палажэннем аб фестывалі штогадовых традыцыйных святаў: ваенна-патрыятычнай песні і музыкі, духавой музыкі, маладзёжнай песні і музыкі аб працы і дружбе народаў СССР. Акрамя гэтага, на працягу 1977—1980 гг. будуць выдадзены зборнікі твораў беларускіх аўтараў. Мяркуецца сістэматычна выдаваць песні-лістоўкі, праводзіць конкурсы на лепшы твор для самадзейных драматычных, музычных, танцавальных калектываў і агітацыйна-мастацкіх брыгад.

Прымаюцца дзейсныя захады, каб забяспечыць самадзейныя калектывы так неабходнымі музычнымі інструментамі, радыёўзмацняльнай апаратурай і сцэнічным абсталяваннем на 1977—1980 гг.

У артыкуле А. Лукомскага «Калі няма зацікаўленасці» адзначаліся недахопы ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці на некаторых прадпрыемствах і навучальных установах Гомеля. Вынікі першага туру фестывалю на Гомельшчыне абмяркоўваліся на прэзідыуме Белсаўпрофа. Гомельскі аблсаўпроф таксама абмеркаваў гэтае пытанне на пасяджэнні сакратарыята і прыняў неабходныя захады па развіццю самадзейнага мастацтва ў вобласці. Так, у прыватнасці, станцазаводу імя Кірава і заводу сантэхабсталявання выдзелены штатныя адзінкі кіраўнікоў самадзейных калектываў. У Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту (г. Гомель) адкрыты студэнцкі клуб і выдзелена пяць штатных адзінак творчых работнікаў. Сёлета Гомельскі абласны савет прафсаюзаў мяркуе забяспечыць кіраўнікамі самадзейныя калектывы заводаў пускавых рухавікоў, меліяральных машын, філіялаў інстытутаў Беларускага політэхнічнага інстытута і Гіпрасельмаш, машынабудаўнічага тэхнікума».

Яму трыццаць. Пяць гадоў назад скончыў Ленінградскі інстытут дакладнай механікі і оптыкі. Зараз Анатоль Чабаганаў загадвае аддзелам у інфармацыйна-вылічальным цэнтры «Белсельгастэхніка».

Анатоль — зацяты кнігалюб. І сярод некалькіх тысяч друкаваных выданняў яго ўласнай бібліятэкі няма ніводнага лішняга, якое набыта дзеля забавы або ў пагоні за модай.

— Захапляюся паэзіяй са школьных год. Як і многія, у свой час спрабаваў нешта нават пісаць, — нетаропка расказвае ён. — І мая бібліятэка сабрана з улікам гэтай патрэбы. У маёй калекцыі даволі разнастайна прадстаўлена руская паэзія, пачынаючы зд Дзяржавіна і канчаючы паэтамі нашых дзён. Карацей кажучы: паэзія — маё захапленне.

Кніга — крыніца ведаў, крыніца натхнення. Яна вучыць жыць і працаваць, спасцігаць вялікі свет мастацтва. На жаль, у нас нямала і такіх людзей, для якіх прыгожая вокладка выдання — дэталь для інтэр'ера ў кватэры.

І ў гэтым таксама адна з прычын таго, чаму да сапраўднага кнігалюба не заўсёды трапляе тое выданне, якое ён хацеў бы набыць для работы, вучобы, для душы. Ён вымушаны часам купляць кнігі ў надзеі, што пашэнціць абмяняць іх на патрэбныя выданні.

Некалькі сутак мы разам правялі на імправізаваным кніжным кірмашы, які стыхійна ўзнікае ля магазіна «Букіністычная кніга», што на Ленінскім праспекце ў Мінску. Сустракаліся з рознымі людзьмі. Іншы раз даводзілася бачыць тут унікальныя выданні. Дзіву даешся, як трапляюць сюды гэтыя каштоўныя кнігі: іх жа ніколі не ўбачыш на паліцах кнігарань.

— З магазінаў, вядома, — перакананча сцвярджае Анатоль. — Прадаўцы, відаць, «пакідаюць» кнігі для сваіх знаёмых. А тыя навыперадкі нясуць выданні, якія карыстаюцца павышаным попытам, на гэты кірмаш.

І тут, як мне здаецца, сваё слова павінна сказаць таварыства аматараў кнігі. Бо каму ж, як ні яго членам, даўно варта было зацікавіцца гэтым кірмашом. Можна знайсці ў нашым вялікім утульным горадзе памяшканне, каб людзі не моклі пад дажджом, не мерзлі ў спюжу ў надзеі адшукаць патрэбную кнігу, каб яны ў спакойнай утульнай абстаноўцы, можа, нават за кубкам кавы, маглі б пагутарыць аб навінках літаратуры, кніжным абмене.

Цікава, па якіх каналах камплектуецца ў Анатоля Чабаганава асабістая бібліятэка? Аказваецца, у кнігарнях ён набывае не больш чым дзесяць працэнтаў літаратуры. Больш чым палова — гэта кнігаабмен. Астатняе — заказы таварышам, якія бываюць у камандзіроўках, сваякам з перыферыі. Выходзіць, кнігаабмену не варта даваць адстаўку.

Гэтыя пытанні турбуюць многіх аматараў кнігі. Вырашыць іх — значыць наблізіць кнігу да чытача, не даць ёй згубіцца, паставіць заслон для рознага роду «дзялкоў» ад кнігі.

С. ДАМАРАЦКІ,
студэнт БДУ імя У. І. Леніна.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»

МЕРЫ ПРЫНЯТЫ

НЕКАЛЬКІ «ЧАМУ?»

Помніцца, у Слуцку адбылася канферэнцыя членаў мясцовага аддзялення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. На ёй абмяркоўваўся праект Закона СССР аб ахове помнікаў гісторыі і культуры, выбіраліся дэлегаты на Мінскую абласную канферэнцыю таварыства.

Аднак пакідаў я залу незадаволеным. Па-першае, на канферэнцыі не прысутнічалі загадчыкі гарадскога і раённага аддзелаў культуры. Адсюль бачна, што аддзяленне таварыства не карыстаецца ў мясцовых кіраўнікоў належным аўтарытэтам. Па-другое, уразілі на канферэнцыі многія выступленні. Маўляў, у Слуцку мала помнікаў. Вось у Полацку ці Нясвіжы... Гэта сведчыць пра тое, што нават самі актывісты аддзялення таварыства дрэнна ведаюць свой край. Дык якая можа быць гаворка пра прапаганду помнікаў гісторыі і культуры сярод насельніцтва?

У нашым горадзе і раёне за апошнія гады зроблена шмат па ўвекавечванню памяці воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Але нельга маўчаць і пра тое, што ў Слуцку і раёне занядбаны шматлікія помнікі больш ранніх часоў, многія з якіх маюць не толькі мясцовае, але і рэспубліканскае значэнне.

Прывяду адзін прыклад. Возьмем вуліцу Камсамольскую.

На вуліцы Камсамольскай няма мемарыяльнага знаку на месцы славутай Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў. Згадзіцеся, што гэта месца—помнік агульнабеларускага значэння, калі не болей.

Няма мемарыяльнай дошкі на доме, у якім у 30-я гады жыў камбрыг Г. К. Жукаў, які пазней стаў чатырыжды Героем Савецкага Саюза, Маршалам Савецкага Саюза.

На вуліцы Камсамольскай размешчаны будынак былой Кальвінскай гімназіі (цяпер СШ № 1). На будынку школы ёсць мемарыяльная дошка: «Старэйшая школа Беларусі. Заснавана ў 1617 годзе». Але гэтага мала. Трэба ў актавай зале школы ці на сцэне адзначыць, што тут атрымалі пуцёўкі ў жыццё: асветнік часоў Пятра І Ілья Капіевіч, які ўдасканаліў алфавіт, якім карыстаюцца, бадай, усе народы СССР і некаторыя іншыя славянскія народы: філосаф Ян Белабоцкі; астраном Вітолд Цэраскі, які змераў зоркавую велічыню сонца. Тут вучыліся вядомыя пісьменнікі Адам Плуг, Альгерд Абуховіч, Язэп Дыла. У будынку гэтай школы ў 1923 годзе выкладаў на настаўніцкіх курсах Якуб Колас.

Пералік дактароў навук, генералаў, артыстаў, акадэмікаў і іншых дзеячаў навукі і культуры розных эпох, якія вучыліся ў Кальвінскай гімназіі (СШ № 1) заняў бы цэлую старонку.

Не ўзята на ўлік тэрыторыя былога Троіцкага манастыра, дзе ў XIV — XV стагоддзі працавалі слуцкія летапісцы.

На тэрыторыі манастыра былі пахаваны многія дзеячы беларускай культуры старажытных часоў. Значэнне гэтага помніка выходзіць за межы Беларусі. Тут быў пахаваны ураджэнец Беларусі епіскап Казачынскі, які шмат зрабіў для асветы народаў Югаславіі. Літаральна 2—3 гады назад народная бібліятэка Бялграда прасіла Слуцкі краязнаўчы музей выслаць фотаздымкі Троіцкага манастыра і фота надгробніка Казачынскага...

На тэрыторыі манастыра пісьменнік Дзмітрый Растоўскі каля 300 гадоў назад уласнаручна выкапаў калодзеж, зрабіў зруб, на верхняй дошцы якога і напісаў патрыятычны верш.

Хіба нельга пры мінімальных затратах сродкаў аднавіць калодзеж Дз. Растоўскага і адкрыць да яго доступ турыстам?..

А колькі цікавых помнікаў гісторыі і культуры на слуцкіх гарадскіх могілках яшчэ не ўзята на ўлік?

У цэнтры Слуцка на кургане, дзе некалі стаяў палац слуцкіх князёў, растуць адна каля адной тры слуцкія бэры. Глядзячы на іх, нельга не ўспомніць верш А. Русецкага «Случчына», дзе ёсць словы:

Кажуць, жыў манах,
што страціў веру
У святыя райскія
плады.
Ён на зайздрасць богу
вывеў бэру
І пусціў у слуцкія
сады.

На жаль, гэтыя тры бэры, якім недзе па 150—200 гадоў, не ахоўваюцца. Так што шмат помнікаў гісторыі і культуры захавалася на Случчыне. Іх трэба ахоўваць, прапагандаваць. І рабіць гэта абавязаны, у першую чаргу, актывісты мясцовага аддзялення таварыства. Неабходна толькі пазбавіцца фармалізму ў рабоце, наладзіць трывалы кантакт з мясцовымі партыйнымі і савецкімі кіраўнікамі. Але чаму гэта не робіцца?

Р. РОДЧАНКА.

ПРЫЗВАННЕ

Як толькі вымаўляеш імя — Аляксандра Нікалаева, — ва ўяўленні прыхільнікаў балетнага мастацтва ўзнікае нейкая асаблівая музыка танца — мелодыя пластычных выказванняў пра радасці і пакуты, праякнутыя сапраўднай чалавечнасцю, адзначаныя артыстычнай індывідуальнасцю. Бадай, і дагэтуль балерын такога маштабу па беларускай сцэне больш няма.

У свой час вядомы літаратурны і тэатральны крытык А. Валынскі заўважыў яе яшчэ вучаніцай; ён пісаў: «...Што датычыць Нікалаевай, то трэба адзначыць, што перакідныя скачкі яна выконвае цудоўна. Есць элевацыя. Кожны жэст пластычны... Кожны новы прыём у школу вучаніц — гэта скрынка сюрпрызаў. Нікалаева аказалася каштоўным падарункам».

...Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча. З любоўю і ўдзячнасцю ўспамінае А. Нікалаева свайго педагога — выдатную рускую балерыну Марыю Фёдараўну Раманаву (маці Галіны Уланавай).

Творчае станаўленне будучай балерыны фарміравалася пад уплывам традыцый рускай класічнай харэаграфіі, якая вызначалася ў тыя гады імкненнем да гарманічнага вырашэння праблем традыцый і наватарства.

Выступаючы на канцэртах вучылішча разам з будучым народным артыстам СССР Вахтангам Чабукіані, яна ўпершыню танцуе славутае па-дэ-дэ з «Дон Кіхота», дзе бліскуча выконвае 32 фуэтэ і гран-па з балета «Пахіта». Ёй даручаюць дуэтныя нумары з будучым народным артыстам СССР Канстанцінам Сяргеевым.

У 1933 годзе выпускніцу Ленінградскага харэаграфічнага вучылішча А. В. Нікалаеву запрашае тады яшчэ толькі ствараемы Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР. Тут балерына ўвасабляе цэлую галерэю выдатных вобразаў. Яна першая знаёміць мінчан з лірычнай Адэтай і чароўнай Адыліяй у неўміручым балеце «Лебядзінае возера», з тэмпераментнай Кітры з «Дон-Кіхота», палымянай Зарэмай у «Бахчысарайскім фантане». Здавалася, што для яе няма перашкод у пошуках сродкаў выразнасці: танец яе свабодны, абуджае ў гледачоў захапленне глыбінёй харэаграфічнай споведзі жанчыны. Кожны рух лагічна і дакладна перадае душэўны стан гераіні. Адсюль і ўнутранае апраўданне багатай балетнай тэхнікі, якую з уласцівым ёй майстэрствам артыстка дэманстравала.

Аляксандра Нікалаева — з ініцыятараў пастаноўкі першага беларускага балета «Салавей» М. Крошнера, паводле аповесці З. Бядулі, дзе яна стварыла глыбока лірычны вобраз Зоські. «Таленавітая А. Нікалаева стварае ў «Салаўі» вельмі цэласны і яркі вобраз беларускай дзяўчыны», — пісала «Правда» пасля паказу «Салаўя» ў Маскве.

Гледачы памятаюць, што на сцэне дзейнічала натура зямная і адухоўленая. Зоська А. Нікалаевай не чароўная Сільфіда, не пастаральная пастушка, а звычайная сялянская дзяўчына з народа. Характар артыстка раскрывае, знаходзячы і размяркоўваючы фарбы свежыя і запамінальныя. А за ўдзел у стварэнні беларускага балета «Князь-возера» В. Залатарова А. В. Нікалаева была ўдастоена звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, што само па сабе сведчыць пра яе талент.

Аляксандра Васільеўна — цудоўная танцоўшчыца. Гэта агульнапрызнана. Вялікія яе заслугі як педагога. Працягваючы сваё сцэнічнае жыццё, яна працуе мастацкім кіраўніком, а потым педагогам Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча, выхоўваючы нацыянальныя кадры артыстаў балета.

— Аляксандра Васільеўна Нікалаева — балерына тэмпераментнага і актыўнага плана, — сказала ў інтэрв'ю аўтару гэтых радкоў народная артыстка СССР Галіна Сяргееўна Уланава. — Актрыса, якая ўмела аднолькава пераканаўча ўвасабляць зусім розныя характары, усебакова раскрываючы паэтычную індывідуальнасць, упэўненую тэхніку танца, артыстызм і высакароднасць манеры. Яна ўмее вучыць! А гэта — таксама вялікі талент... Напярэдадні 45-годдзя творчай дзейнасці таленавітай беларускай танцоўшчыцы хочацца перадаць ёй самыя шчырыя віншаванні і пажаданні духоўнай энергіі і вялікіх творчых удач у выхаванні балетнай моладзі.

В. ХАДАСОЎСКІ.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

КІНО І ДЗЕЦІ

У апошнія гады сур'ёзна і настойліва абмяркоўваецца праблема паляпшэння кінаабслугоўвання дзіцячага гледача. Гэтае пытанне пастаянна выносіцца на абмеркаванне самых прадстаўнічых нарад работнікаў органаў кінафікацыі, народнай асветы і кінематаграфістаў. Кінематограф сёння самым актыўным чынам удзельнічае ў духоўным фарміраванні падрастаючага пакалення.

Галоўная задача работнікаў кіно ў рабоце з дзецьмі — правільны падбор рэпертуару, паказ стужак высокамастацкіх, моцнага грамадзянскага гучання. Разам з тым, праблему, **што** паказваць дзецям, нельга адрываць ад праблемы, **як** паказваць. Але перш чым спыніцца на формах і метадах работы з дзіцячай кінааўдыторыяй, мне хацелася б спыніцца на пытаннях, якія займаюць нас, лектараў, тых, хто пастаянна сустракаецца з дзіцячым гледачом у кінатэатрах.

Штодзённа і штогадзінна магутная камунікатыўная індустрыя — прэса, радыё, кіно, тэлебачанне — выпускае разнастайную, шматлікую і далёка не раўназначную прадукцыю. Ці ведаем мы з пэўнай дакладнасцю, якое месца займае, у даным выпадку, кінематограф у жыцці падлетка? Даследаванні ў гэтым аспекце вядуцца, але пакуль яшчэ нясмела. Мы таксама дрэнна ўяўляем сабе і сувязі юнага пакалення з кінаэкранам, механізм поспеху тых або іншых фільмаў, спосабы, якімі фільм пранікае ў духоўную структуру асобы, якая фарміруецца. Сацыёлагі, шляхам даследаванняў, прыйшлі да вываду, што кінематограф у свядомасці юнага пакалення ў асноўным звязаны з адпачынкам. Такое сцвярджэнне нялёгка абвергнуць: тыя, хто часта выступае перад пачаткам фільма (а гэта адна з форм работы з дзецьмі), адчуваюць, як цяжка настроіць залу на ўвагу да лектара, дзеці з нецярпеннем чакаюць самой карціны.

Часта назіраючы дзіцячую аўдыторыю ў час кінасеансаў, становіцца відавочным, што дзецям патрэбна дапамога ў правільным успрыманні кінамастацтва.

Працуючы з дзецьмі і падлеткамі больш чым чатыры гады (была вядучай пастаянных кінаклубаў і ў агульнаэкранных кінатэатрах і ў палацах культуры тэкстыльшчыкаў, будтрэста № 5), я прыйшла да вываду, што трэба шукаць і прымяняць іншыя метады работы, і адзін з іх, на мой погляд, самы эфектыўны — гаварыць з дзецьмі пасля прагляду, асабліва ў падлеткавай і юнацкай аўдыторыі. Трэба сказаць, што надзвычай цяжка зламаць звычны стэрэатып «лектар перад фільмам». Успамінаецца сустрэча з навучэнцамі аднаго ГПТВ. Сустрэча, як гаворыцца, была «разавая»: мне трэба было сказаць некалькі слоў перад фільмам «Шукаю свой лёс». Разам са мною павінен быў выступіць на тэму «Рэлігія і сучаснасць» лектар, кандыдат філасофскіх навук з таварыства «Веды». Атрымалася так, што мы прыйшлі ў палац даволі рана і давялося чакаць прыходу дзяцей у кабінеце арганізатараў нядзельнага «мерапрыемства». Сядзелі і непакоіліся: нядзеля... падлеткі прыйдуць проста паглядзець фільм... Навошта мы?

Быццам бы адгадаўшы нашы думкі, арганізатар — маладая дзяўчына, нас «суцешыла».

— Калі ласка, як мага карацей, а то дзеці пачнуць шумець...

І вось тут нешта ў ва мне ўзбунтавалася і я прапанавала, каб усім разам паглядзець фільм, ён варты таго, каб пагаварыць, разабрацца ў пастаўленых аўтарамі пытаннях. Кандыдат падтрымаў мяне.

— Пасля фільма ўсе пойдуць, — сказала нам дзяўчына.

— Нехта застанецца — парыравалі мы. — Рызыкнем?

Вядома, нейкая частка падлеткаў пайшла. Але большасць засталася. Яны слухалі ўважліва. Але вось надышла хвіліна, калі дзяўчаты і юнакі пачалі размаўляць паміж сабою, спрачацца, нешта даказваць: мы зразумелі — час уцягваць іх у спрэчку. І вось перамога! Юнакі пачалі выступаць: гаварылі запінаючыся і чырванеючы, але гаварылі, а значыць — думалі, слухалі нас.

Гэтую сустрэчу цяжка забыць. Яна прынесла нам велізарнае маральнае задавальненне. На жаль, мне не так ужо часта даводзіцца сустракацца з навучэнцамі прафесіянальных вучылішчаў, а гэта вельмі цікавая аўдыторыя кінагледачоў, якая патрабуе да сябе самай пільнай увагі і павагі. Пастаянна ж я працую з дзецьмі малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту ў клубах па мастацтву кіно ў такіх кінатэатрах сталіцы, як «Партызан», «Кіеў», «Дружба». Мэта кінаклубаў — навучыць дзяцей арыентавацца ў кінатворчасці.

Развіваць мастацкі густ у малодшых школьнікаў вельмі добра пры дапамозе кінаказак. У кінатэатры «Партызан» быў створаны клуб мультыплікацыйнага фільма для малых. І ў тым жа кінатэатры для дзяцей 4—5 класаў — клуб «У свеце казак», дзе паказвалі ігравыя мастацкія карціны.

Пры складанні абанементаў выразна сфармулявалі тэму кожнага занятку. Вось як, напрыклад, абазначаны тэмы кінаклуба «У свеце казак»: «Колькі ў фільма аўтараў?», «Народная казка на экране», «Казкі-быліны А. Птушко», «Сучасныя літаратурныя казкі», «Казкі-экранізацыі» і г. д. Гэта значыць, дзяцей вырашылі настроіць на пэўную размову, каб яны прыходзілі на прагляд не з мэтай забавы, але і каб паназіраць за іграй акцёраў, навучыцца разумець мову кіно, адрозніваць творчасць рэжысёраў — майстроў-казачнікаў — А. Роу, А. Птушко, Р. Быкава і інш.

Форма работы з дзецьмі малодшага і сярэдняга ўзросту — гульня. У гэтай аўдыторыі «ўступнае слова» не мае роўна ніякага эфекту, толькі віктарыны, конкурсы, падарожжы ў чароўную краіну казак — здольныя ўцягнуць дзяцей у атмасферу кінамастацтва.

Напрыклад, у клубе мультфільма я прапаную малым паглядзець адначасткавы фільм, а потым прашу паспрабаваць адказаць на такія пытанні: назваць імя рэжысёра, сумную або смешную гісторыю расказваюць аўтары, чым павучальная яна, ці падобныя персанажы на сапраўдную жывёліну або яны казачныя, ці адпавядае рух іх вобразу і г. д. Гэта значыць, даць ацэнку ўбачанаму.

У канцы мінулага года адбыўся заключны конкурс-спаборніцтва на тэму: «Ці ведаеш ты мультыплікацыю?». Дзеці бойка адказвалі на прапанаваныя пытанні: «Хто быў першым рускім мультыплікатарам - лялечнікам?», «Чыімі галасамі гавораць героі мультфільмаў?». Спаборніцтва дзвюх каманд «Мікі-Мауса» і «Віні-Пуха» працягвалася дзве гадзіны; глядзелі фрагменты, слухалі музыку да мультфільмаў, галасы акцёраў, юныя мастакі малявалі проста на сцэне рэчы персанажаў фільмаў...

Сучаснае кіно ў большай ступені арыентуецца на гледача, здольнага стаць свайго роду «сааўтарам» стваральнікаў карціны. Абуджаць «мастакоў» у людзях трэба з ранняга дзяцінства. Не выпадкова Дзяржкіно СССР, Міністэрства асветы СССР і ЦК ВЛКСМ намецілі шырокае кола мер, якія дазволяць узмацніць ролю кіно не толькі ў ідэйна-маральным, але і ў эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення.

Радасна, што з гэтага навучальнага года ў школах рэкамендавана ўвесці факультатыўны курс «Асновы кінамастацтва». Рэалізацыя намечанага павінна праводзіцца сумеснымі намаганнямі органаў кінафікацыі, кінапракату, народнай асветы, камсамола. Канечне, ёсць маса праблем у гэтым аспекце і адна — найвастрэйшая — хто будзе займацца з дзецьмі? Спецыялістаў накіраваць у кожную школу скажам прама, нерэальна. Хутчэй за ўсё гэтым павінны займацца самі настаўнікі. Гэта зразумелі ў Мінскім гарадскім ўпраўленні кінафікацыі (начальнік А. Г. Жукава), для чаго пры кінатэатры «Піянер» быў арганізаваны кінаўніверсітэт «Экран» для арганізатараў пазакласнай работы і загадчыкаў навучальнай часткі па тэорыі гісторыі кіно.

Лекцыі і практычныя заняткі вядуць самыя вопытныя кіназнаўцы рэспублікі. І ўсё ж такі вырашэнне праблемы «кіно і дзеці» залежыць галоўным чынам ад таго, якія веды пра кіно атрымае студэнт педагагічнага інстытута.

У нас у Беларусі ёсць ужо цікавы вопыт настаўнікаў кіназнаўцаў - энтузіястаў, якія працуюць з дзіцячым гледачом. Глыбокае абагульненне іх вопыту — важнейшая задача.

Э. КОРНЕВА,
рэдактар Дзяржкіно БССР.

Жураўліны мін

НАРЫС

Алесь ШЛЕГ

ВАКОЛ панавала цішыня. Мікола Грышкоўскі з асалодай удыхнуў насычанае жывіцай паветра, выпрастаў шырокую, прыгорбленую спіну і рушыў з месца. Звілістая, зацярушаная ігліцай, сцяжынка абрывалася на ўскрайку лесу, за якім адразу ж пачыналася вялізнае балота.

Чамусьці прыгадалася Міколу колішняя размова са старым Альбінам Цалкам. На поплаве за сваёй хатай дзед шукаў у гудлівым клубку пчол іхнюю матку. Мікола дапамагаў яму, папярэдне нядзеўшы маску. Дзед жа Альбін быў з адкрытым тварам. Стары некалі меў страшную жытку: быў біты, стрэлены, палены. Але любіў усё жывое. Асабліва пчол. «Спусташальнік ты, хлопча, — у роздуме гаварыў дзед, асцярожна разгортваючы скрыўленымі пальцамі пчаліны рой. — Куды? Ну, куды ты, шалёнка малая? Бач, усхадзілася, як тая дзеўка, якую падцыкнулі замужжам. Годзе, супакойся... — стары зняў пчалу са сваёй шчакі.—Дык от я і кажу... Ды цішэй, цішэй ты, мядзведзь. Пчала—яна ласку любіць. Як і ўсё жывое... Дык от што я табе скажу, хоць аніякага навучання ў акадэміі не праходзіў. Розум у чалавека для таго, каб думаць і рабіць карыснае людзям. А цяперака возьмем гэтае вашае асушэнне дрыгвы. З аднаго боку нібыта і непагана—на былым балоце ўжо ўсюды хлеб расце. А калі з другога боку глядзець? Няма балота—няма дзікай качкі. А куды буслам дзецца? Ды што буслы. Возьмем журавіны. Хутка будзе так, што журавінку днём з агнём не знойдзеш. От табе і маеш. З розумам, хлопча, з розумам, да ўсяго падыходзіць трэба...».

Мікола пераскочыў з купіны на купіну і падумаў, што ўся дзедава філасофія, відаць, была толькі дзеля таго, каб падкусіць яго, маладога. З усёй гэтай філасофіі Мікола ўспрымаў толькі адну мудрасць: тое, што робіш, рабі з розумам. «А з гэтага боку, дзед, ты да мяне не пад'ёдзеш,—у думках распачаў са старым гаворку Мікола.—Я калі за што бяруся, спачатку розумам паварушу. Што б ты рабіў, дзед, калі б замест мяне аднойчы трапіў у такое дзела? На рацэ Храпуня трэба было трубу рэгулятара на канал зрабіць. Сабралася начальства, падлічыла, што не менш як тры месяцы спатрэбіцца на гэта. Паслухаў я, памаўчаў, пачухаў патыліцу. І што ж ты, дзед, мяркуеш, я прыдумаў? А зрабіў я проста: як заўсёды для такой справы патрэбны цэментавы раствор. А як яго рабіць? Падводжу я коўш экскаватара, адзін хлопец кідае ў яго рыдлёўку цэменту, другі—рыдлёўку пяску, трэці—шчэбеню. Чацвёрты чалавек усё гэта добра перамешвае. Я асцярожненька падымаю коўш, падводжу яго да апалубкі вакол кальца трубы рэгулятара і высыпаю сухі раствор проста ў ваду. Раблю гэта з такой дакладнасцю, што хлопцы ажно раты паразяўлялі. Ім дзіва, а мне такая дакладнасць ні ў галаве, бо я карабок запалак каўшом вазьму і дзесяць грамаў зямлі не заграбу. Забетанавалі ўсё. Зрабіў сам мантаж рэгулятара. І за які ты, дзед, думаеш, тэрмін? За чатыры дні! А трэба было тры месяцы. Начальства прыехала і аж здзівілася. А тады кінуліся якасць правяраць. Глядзяць—усё як мае быць: я калі за што бяруся, дык за якасць галавой магу паручыцца. От тады начальнік участка Міхась Мікалаевіч Ануфрыенка кінуўся мяне абдымаць... Во як яно, дзед, было. Гэта табе не пчаліную матку шукаць. Га?..»

Мікола задаволена крактануў і ўзяўся закурваць. Зірнуў на неба, што цвіло халодным блакітам, прыжмурыўся ад сонца, якое падымалася над зубістымі вяршалінамі ялін, і наддаў хады. З-за купы вольхаў раптам выткнулася чорная стужка канала, на беразе якога сямтам ляжалі выватныя з пачварнымі шчупальцамі-карэннямі.

Мікола павярнуў улева і ўбачыў свой «Э652». Зірнуў на гадзіннік. Было шэсць гадзін раніцы.

З заклапочаным выглядам абышоў машыну, зазірнуў у матор. Потым уважліва агледзеў рэверсійны механізм. «Не падвядзе,—падумаў.—А два тыдні назад, калі за пень коўш зачапіўся, я ажно збялеў. За гадзіну знялі яго з Эдзікам Бегляком. Двое сутак вачэй не заплюшчылі. На такі рамонт два тыдні даецца, а ў нас на трэці дзень экскаватар працаваў. А ты кажаш «дзікія качкі», дзед... І чаго ты мне ў думкі ўбіўся, стары! Як бы мне няма чаго рабіць без цябе».

— Здароў!—як не ў самае вуха крыкнуў нехта і ашчаперыў ззаду.

Мікола рэзка павярнуўся. Той, хто трымаўся за плечы, грымнуўся на зямлю.

— А каб табе!—засмяяўся Мікола.—Чаго горла дзярэш?

Павел Белы, Міколаў памочнік, задаволена зарагатаў і пачаў падымацца.

— Шэф, у цябе за нівошта гіне талент. А, між іншым, месца Аляксандра Мядзведзя вызвалілася. Падумай,—гаворачы гэта, Павел Белы залез у коўш.—Не будзеш пярэчыць, калі я выкарыстаю твой транспарт?

«Хоча паглядзець, ці няма на тым баку пнёў,—падумаў Мікола, уціскваючы ў кабіну ўсе сто восемдзесят тры сантыметры свайго росту.—Кемлівы хлопец. Будзе з яго толк. Міхась Сазанчук, Юзік Жыгадла, Юрка Дубікоўскі—усе мае вучні. На каго з іх трох падобны Павел? Хутчэй за ўсё на Мішку Сазанчука. Той самы здатны. Хутка трэба Паўла на самастойную выпускаць. Каго ж замест яго сабе ўзяць? Дзед, можа, ты мне падкажаш?... Во навалоч! От даўся мне сёння дзед у знакі!»...

Грышкоўскі ўпарта падціснуў губы. Рукі звыкла рабілі сваю справу. Выбраўшы зручны момант, у кабіну ўсунуў галаву Павел Белы.

— Слухай, Коля Мікалаевіч!—крыкнуў ён. — Мне ўчора Эдуард Бягляк казаў, цібыта ты неяк паспрачаўся з ім, што з завязанымі вачамі экскаватарам загрузіш некалькі машын. І загрузіў. Ці праўда гэта?

— Было такое, — неахвотна адказаў Мікола.

— Во гэта экстра-клас!—заззяў усмешкай Павел. — Чуеш, а што ты такое незвычайнае зрабіў, калі ў вёсцы Нічыпараўка плаціну для падтрымання ўзроўню вады рабілі? Ануфрыенка і цяпер яшчэ спявае табе дыфірамбы. Га?

— Займайся сваёй справай, стрыкун!—як адсёк Мікола.—Не перашкаджай!

— А куды ты так спяшаешся? Усё адно усіх грошай не заробіш! — пакрыўджана азваўся Павел і скочыў на зямлю.

Мікола толькі ціхенька засмяяўся на кола.—Мецей мне аніяк нельга. Усе сем месяцаў па дзвесце дзесяць працэнтаў выпрацоўку даваў, а тут узяць ды знізіць? Не, я сёння да цемначы з кабіны не вылезу, пакуль свайго не дамагуся».

Цішыня ўзарвалася ад вуркатання дызеля. Грышкоўскі пільна прыслухаўся да гуку матора, прабег вачамі па прыборах і паклаў рукі на рычагі. Страла крана павольна папаўзла ўгору, а потым імкліва пайшла ўлева і замёрла на месцы. Павел Белы самавіта вылез з каўша і памахаў Міколу рукой.

Грышкоўскі звёў выгарэлыя на сонцы бровы, пад якімі амаль схаваліся блакітныя вочы, завучаным, дакладным рухам узяў на сябе рычагі. Страла экскаватара, зрабіўшы імклівую дугу, застыла на месцы. Жалезная пашча каўша раптам разышлася ўшыркі і прагна ўгрызлася ў мокрую зямлю. Матор зароў ад натугі, дробна задрыжала кабіна. Страла ўзляцела ўгору, несучы поўны коўш, з якога пурчала чорная вада. Зямля абрынулася ўніз цяжкім вадаспадам. І зноў, холадна пабліскваючы на сонцы зубамі, закрываючыся на хаду, ляціць у трансцэю коўш.

Мікола выхоплівае з пачка цыгарэту і, не зводзячы з каўша вачэй, прыкурвае. Рухі яго надзвычай дакладныя і ў той жа час вольныя, без усялякіх прыкмет напружання. Экскаватар нібыта частка яго істоты. Гэта яднанне ўзнікла за гады самаадданай працы. І машына, адчуваючы гэта, пакорліва-паслухмяная кожнаму руху яго дужых рук.

Балота цягнецца ўздоўж лесу. Рудым бляшаным колерам свецяцца маладыя асінкі. Між іх зрэдку ўспыхваюць чырвоныя рабінавыя вогнішчы. Утыркаюць у сіняе неба свае пікі яліны. Усё гэта, як у каляровым кіно, праплывае, знікае і ў адваротным парадку зноў вяртаецца. «Шэсць кіламетраў канала пракапалі. Застаўся ўсяго адзін кіламетр, але ён, як на ліха, самы цяжкі. Карчы і пні не даюць разгарнуцца. Аднак нічога, я свае дзвесце дваццаць працэнтаў і сёння дам, — вядзе сам з сабою гаворку Мікола.—Мецей мне аніяк нельга. Усе сем месяцаў па дзвесце дзесяць працэнтаў выпрацоўку даваў, а тут узяць ды знізіць? Не, я сёння да цемначы з кабіны не вылезу, пакуль свайго не дамагуся».

Паўлаў выбрык. «Я ў твае гады і не такое ўчмураў, — падумаў ён.—А ў вёсцы Нічыпараўка нічога такога і не здарылася. Плаціна ўжо была насыпана, зроблены быў і схіл да самай ракі. Аднак яго трэба было параўняць, «пагладзіць», як у нас кажуць. Такую справу робіць толькі бульдозер. А бульдазерыст чагосьці ў хамут забіў, нораў свой пачаў паказваць. Маўляў, малавата плаціце. А я такога не люблю. Агледзеў я гэты схіл ды і кажу начальніку ўчастка Ануфрыенку: «Не турбуйцеся, Міхась Мікалаевіч, я сам зраблю».—«Як ты зробіш?»—дзівіцца ён.—Чым?».—Ды экскаватарам сваім, кажу. Не дае ён веры. А я бяру і да каўша падвязваю бервяно. Тады апускаю яго на схіл і цягну на сябе. Ды так добранька зямлю прыгладзіў, што куды таму і бульдозеру. Зрабіў усё ў тры разы хутчэй. Вось і ўся тая нічыпараўская гісторыя...».

Нагадаўшы ўсё гэта, Грышкоўскі задаволена ўсміхнуўся. «Та-ак, багата ж я наварочаў зямлі на Нараўляншчыне. Толькі ў адным калгасе «Бальшавік» трыццаць тры кіламетры канала выкапаў, два возеры,—высыпаючы чарговы коўш зямлі, падумаў Мікола.—Усяго і не ўпомніш».

У кабіну зноў усунуў галаву Павел Белы.

— Цімафееў на трактары прыехаў. Паліва прывезлі,—паведаміў ён.—Спыніся, пагаварыць хоча.

Мікола збавіў абароты рухавіка і вылез з кабіны. Начальнік Нараўлянскай дваццатай перасовачна-механізаванай калоны Барыс Іванавіч Цімафееў ступіў яму насустрач, паціснуў руку.

— Як працуецца, Мікалай Мікалаевіч?—спытаў ён, выціраючы запэцканыя боты аб траву.

— Да дзесятага снежня свае сто пяцьдзесят тысяч кубоў дам.

— А на сённяшні дзень колькі маеш?

— Болей за дзевяноста тысяч нагроб.

— Якасць у цябе на ўзроўні. Адразу ў вочы кідаецца, — Цімафееў штосьці занатаваў у блакноце.—Скаргі ёсць?

— Ёсць. На камароў!—засмяяўся Мікола. — Скажыце ім, Барыс Іванавіч, каб не надта лютавалі.

Мікола нечакана ўспомніў сваю размову з дзедам і вырашыў высветліць тыя пытанні, якія хвалявалі старога.

— Тут, Барыс Іванавіч, адзін чалавек неяк мяне спусташальнікам назваў. Кажа, што мы сваёй меліярацыяй усю дзічыну выведзем. Бедаваў, што і журавін хутка не будзе.

— Перадай свайму знаёмаму, што цяпер меліярацыя вядзецца так, каб не шкодзіць прыродзе. Калі плануюцца работы, то абавязкова ўлічваюцца прыродныя ўмовы і асаблівасці. Так што знаёмы твой ад журавін аскому наб'е,—Цімафееў далонню пацёр шчаку.—А дзічыны столькі развялося, што бяда. Дзікі ў вёскі ходзяць бульбу капаць,—Цімафееў закурыў. — Ты мне лепей скажы, як здароўе жонкі тваёй? Яе, здаецца, Ядвігай Браніславаўнай завуць?

— Ага,—кіўнуў галавой Мікола.—Анічога сабе.

— А дочкі?

— У лялькі гуляюць. Ленды шосты пайшоў, а Людзе—чацвёрты.

Цімафееў пажадаў ім добра расці і развітаўся. Мікола залез у кабіну і прыбавіў абароты матора. Коўш узляцеў ўгору, на імгненне застыў ля асляпляльнага дыска сонца і паляцеў у канаву. «Уважлівы чалавек,—з цяплом падумаў пра Цімафеева Мікола. — Бач ты, нават ведае, як жонку завуць. От такі яшчэ Дзянісаў, сакратар райкома партыі. Той не толькі пра сям'ю распытае, але пацікавіцца нават, колькі карова малака дае. Леанід Карнеевіч, калі мне знак «Ударнік 9-й пяцігодкі» ўручаў, дык шмат добрых слоў сказаў.—Мікола аднаруч прыкрыў цыгарэту і зноў у думках вярнуўся да размовы з дзедам.—Так што, выходзіць, не дарэмна я праз дрыгву прадзіраюся. Я разумна дапамагаю прыродзе мяняць свае аблічча. От яно як выходзіць, дзядуля».

На сонца напаўзла хмара. Дзень, што дагэтуль залацеў і зеляцеў, згусціў фарбы. Неба змрачнела, нядобра супілася. Наляцеў вецер, ледзь не ніцма паклаў асаку і кусты вербалозаў. «Вось табе і маеш!—прымарудзіў хаду стралы Мікола. — Зараз секане».

Нібы пачуўшы яго думкі, неба змеіста ўсміхнулася і аглушальна зарагатала. Пайшоў густы, да крыўды непатрэбны дождж.

Учыгунела спіна. Мікола выпрастаў плечы і рушыў кран наперад, углыб балота. Коўш раз'юшана ўпіўся зубамі ў мокрую зямлю. Побач з Міколам сядзеў і зачаравана сачыў за кожнымі яго рухамі Павел Белы.

Дождж раптоўна суняўся. Па балоце па-ранейшаму разлягаўся гуд матора. Вецер старанна вымятаў неба. Блакітныя дзялянкі разыходзіліся ўшыркі. У адну з іх зянпацку ўскочыла сонца. Азярцы вады сліпуча ўспыхнулі.

Мікола апусціў коўш на вялізную, зарослую сівым мохам купіну. Спрытна зрэзаўшы яе, падняў стралу ўгору. З каўша звісалі і гайдаліся ў вышыні пунсовыя каралі журавін. «Перанясу я гэту купіну на другі бераг канала,—падумаў Мікола. — Хай сабе растуць».

Журавіны віселі ў блакіце неба. Кожная ягада гарэла на сонцы, вабячы вока. Мікола глядзеў на іх і не заўважаў, што стомлены твар яго распагоджвае ўсмешка. Ён пашукаў вачыма, куды лепш прымаспіць купіну, потым асцярожна апусціў коўш на зямлю. Калі павярнуў стралу назад, убачыў у небе журавоў. Касяк ляцеў над экскаватарам. Мікола выключыў матор і высунуўся з кабіны.

«Можа, тыя, што сустрэліся мне ўранні?—з ціхім сумам падумаў. — Добрай вам дарогі... І хутчэй вяртайцеся назад...»

Касяк плыў над балотам маўкліва і ўрачыста.

Нараўлянскі раён.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Беларусь» выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму рэдактару часопіса Міхасю Калачынскаму з прычыны заўчаснай смерці брата Кастуся.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Полымя» выказвае глыбокае спачуванне рэдактару аддзела навукі і мастацтва Лявонаву Л. К. з прычыны напатнаўшага яго гора—смерці брата Міхаіла.

ЗУЛЬФІЯ

Чытачам нашай краіны добра вядома імя народнай паэтэсы Узбекістана Зульфіі — лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, лаўрэата рэспубліканскай прэміі імя Хамзы і міжнародных прэмій імя Дж. Нэру і «Лотас».

Яе першы зборнік «Старонкі жыцця» выйшаў у 1933 годзе. Лірыка Зульфіі прысвечана разняволенай жанчыне Усходу, барацьбе за мір, дружбе народаў. Яна — аўтар шматлікіх кніг паэзіі: «Дзявочыя песні», «Вернасць», «Размова з сяброўкай», «Блізкія сэрцу майму», «Думы», «Сонечнае пяро». Узбекская паэтэса пераклала на родную мову творы Я. Коласа, Э. Агняцвет, Е. Лось і іншых.

У 1967 годзе выдавецтва «Беларусь» выпусціла зборнік лірыкі Зульфіі ў перакладзе Э. Агняцвет, Е. Лось, В. Вярбы, С. Грахоўскага, С. Гаўрусёва, А. Вярцінскага, А. Марціновіча, Хв. Жычкі, А. Лойкі і Ю. Свіркі.

ПРАЦА

Часам мучуся: кепска мне
спіцца
І праз глупства хвалююся я,
Зацямняецца думак крыніца
І нібы я сама не свая.

І зацягвае крыўда, як ціна...
Ды прыпомню хвілінай ліхой
Над жалезам—бацькоўскую
спіну,
І руплівасць матулі маёй.

Як калісьці
мой бацька-рабочы —
Я ізноў насцярожваю зрок,
І працую ад рання да ночы,
І шукаю я кожны радок.

Што ні слова—цалінная скіба,
А страфа, як абвал снегавы.
На шляху затрымаюся, хіба?
Зноў спявае мой сад веснавы!

Праца — жаданняў і думак дзіця,
Гэта—вялікае шчасце жыцця.

НІШТО ГАРАЧАЙ МАРЫ НЕ АСТУДЗІЦЬ...

МАРЫ

Парой здаецца: не ўганюся
я за марай,
Шлях доўгі ад яе —
да справы смелай.
Так мала часу! Мітусні так многа
марнай!
І гэтак мала я ў жыцці паспела!

Я выпіла зямнога шчасця рэкі,
Зямнога гора выпіла я мора.
А ўсё я прагну!
Думка—рэха веку
Ляціць касмічным караблём
угору.

І на Чарвакскай ГЭС гучыць
мой верш галоўны,
Бавоўну сею я ў Талімарджане.
Бялюткая народзіцца бавоўна!
Ці ж гэта не здзяйсненне ўсіх
жаданняў?

Але нішто гарачай мары
не астудзіць!
Яна — наперадзе, як далягляд
дарожны.
Святло жаданняў вечна свеціць
людзям,
І кожны дзень мой—нанава
трывожны.

Калі б здалёк не клікалі агні —
Не дасягнула б шчасце вышыні.

Паэты братніх рэспублік

ДАРЭМНА ПРАЖЫТЫЯ ХВІЛІ ГНЯТУЦЬ...

Ёсць у жыцці і радасці, і страты.
На небе,
на зямлі—жыцця прыбой.
Калі патрэбнай справай
ты заняты, —
Сам упрыгожыш кожны момант
свой.

А дзень, які дарма пражыты
намі,—
Нас уначы грызе, сціскае
абцугамі.

Няхай грызе! Што ж, сцерпім мы
і гэта!
Без нездаволенасці і жыцця няма.
Без хвілі змрочнай — не ацэніш
светлай,
Пусты, самаздаволены—не можа
быць паэтам!

Бо толькі сытасць цешыцца
сабой сама.

Пераклала з узбекскай
Э. АГНЯЦВЕТ.

НАДРУКАВАНА Ў «НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕЦЕ»

У «Настаўніцкай газеце» за 6 лістапада пад загалоўкамі «Пад ленінскім сцягам — да новых перамог» і «Пад сцягам Вялікага Кастрычніка» надрукаваны справаздачы аб урачыстых пасяджэннях, прысвечаных вялікаму святу, што адбыліся ў Маскве і Мінску. Газета змясціла даклад сакратара ЦК КПСС таварыша Ф.Д. Кулакова «Святло Вялікага Кастрычніка азарае шлях да камунізму», з якім ён выступіў 5 лістапада 1976 года ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 59-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Газета змясціла фотарэпартаж А. Сачанкі «Прыгажосць будзённасці», у якім гаворыцца пра выстаўкі лясной скульптуры, жывапісу і графікі, што адкрыліся ў мінскім Доме настаўніка.

У раздзеле «Крытыка і бібліяграфія» надрукаван артыкул Г. Шупенькі «Слова пра нашых пісьменнікаў», у якім ён разглядае зборнік артыкулаў «Пра таварышаў па пяру», які выйшаў у выдавецтве «Народная асвета».

«Зорнымі шляхамі» — так называецца перадавы артыкул «Настаўніцкай газеты» за 7 лістапада. Чытачам прапануюцца публіцыстычныя артыкулы Ул. Карпава «Чалавек — галоўная наша каштоўнасць» і М. Жыгоцкага «Імя Кастрычніка», вершы П. Пранузы, В. Шымуна, А. Зэкава, Я. Далецкай і Р. Круглова.

Заслужаны настаўнік БССР В. Арлоў у артыкуле «Крокі кампазітара» піша аб шасцігадовай дружбе калектыву Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3 з заслужаным дзеячам мастацтваў БССР кампазітарам І. Лучанком.

Спаўняецца дзесяць гадоў з дня прыняцця пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах далейшага паляпшэння работы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы». З гэтай нагоды газета пад рубрыкай «Клопат партыі, клопат народа» змясціла шэраг матэрыялаў. З артыкуламі «Магістральным курсам», «На шляху здзяйснення», «У імя будучыні», «Ключ да пазнання», «На ўзбраенне — лепшае», «Маладзеюць кадры» на старонках газеты выступілі першы сакратар Гродзенскага абкома КПБ Л. Кляцкоў, дырэктар Рэспубліканскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў Р. Румянцаў, арганізатар пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы Жыцькаўскай школы Барысаўскага раёна А. Ясяновіч, дырэктар Ламашэўскай сярэдняй школы Глыбоцкага раёна І. Носаў, загадчык Віцебскага аблана Б. Яроцкі, дырэктар саўгаса «Друць» Бялыніцкага раёна І. Ільюшын.

Змешчан фотарэпартаж І. Крупені і П. Ніціна «Шчаслівае дзяцінства», у якім расказваецца пра дзіцячы сад саўгаса «Рассвет» Мінскага раёна.

Гарнаская газета

МАНУМЕНТАЛЬНЫ ПОМНІК

НІБЫТА КАЗКА

Дзейнічаюць:

Удовін Сын.

Дванаццацігаловы Змей.

Дванаццацігаловы Змей спыніўся ў цэнтры скверыка, дзе растуць высокія ліпы, любуецца, азіраючыся па баках. Ідзе Удовін Сын. Змей заўважыў яго.

ЗМЕЙ. Гэй! Удовін!

УДОВІН СЫН. Што табе трэба?

ЗМЕЙ. Хадзі сюды!

УДОВІН СЫН (*падыходзіць да Змея*). Што табе прыспічыла? Які клопат маеш?

ЗМЕЙ. Ты паглядзі навокал. (*Круціцца на месцы, стрыхэ вачыма*). Прыгажосць адна!

УДОВІН СЫН. Сапраўды, тут прыгожа.

ЗМЕЙ. І месца людное.

УДОВІН СЫН. Шмат людзей тут бывае штодня.

ЗМЕЙ. Да таго ж і аўтобусны прыпынак насупраць.

УДОВІН СЫН. І што з таго?

ЗМЕЙ. Слабачок! Не разумееш ты яшчэ нічога. (*Пасля паўзы*). Многім вялікім творцам пастаўлены манументальныя помнікі ў самых людных, самых прыгожых месцах. Іх імёнамі названы вуліцы, паркі, тэатры, аўтобусныя прыпынкі і гэтак далей. На магілах геніяльных мысліцеляў ніколі не вянуць жывыя кветкі, а творы іх том за томам пастаянна перавыдаюцца, перакладаюцца з адной мовы на другую.

УДОВІН СЫН. Гэта заканамерна.

ЗМЕЙ (*уздыхнуў*). Вядома, заканамерна. (*Уздыхнуў*). Калі мне будуць рабіць помнік, то я хацеў бы, каб ён стаяў вось тут, дзе я цяпер жывы стаю. Тады і аўтобусному прыпынку маё імя прысвоілі б. Уяві сабе: кожны раз вадзіцелі, везучы пасажыраў, па мікрафоне аб'яўлялі б: «Прыпынак Дванаццацігаловага»...

УДОВІН СЫН. Многа ты хочаш.

ЗМЕЙ. А мне слава ніколі не шкодзіць. (*Уздыхае зноў*). Ці прынясе ж хоць хто на маю магілу жывыя кветкі? Носяць жа букеты іншым.

УДОВІН СЫН. Гэта вельмі проста можна высветліць.

ЗМЕЙ. Што высветліш?

УДОВІН СЫН. Ці будуць насіць на тваю магілу кветкі.

ЗМЕЙ. Як гэта зрабіць?

УДОВІН СЫН. Трэба спачатку памерці.

ЗМЕЙ. І што тады будзе?

УДОВІН СЫН. А тады паглядзіш, і хто табе помнік паставіць, і хто на магілу кветкі панясе.

ЗМЕЙ. Не шукай дурнейшых за сябе (*схаваў рукі ў кішэні, бліснуў вачыма, пайшоў і не развітаўся*).

Літаратурны запіс
Р. ЯУСЕЕВА.

ГЭТЫ МАЛАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

Азон — дылетант.

Баласт — абітурыент.

Балістыка — здача экзаменаў.

Бумеранг — шумная кар'ера.

Глянец — моднік.

Дантыст — даследчык творчасці Дантэ.

Латашыць — працаваць на латку.

Літраж — разгневаны пісьменнік.

Папуры — выгнанне.

Стратасфера — пазбаўленне ўлады.

І. КУРБЕКА.

ВУЧЫЦЕСЯ... СМЯЯЦЦА!

Смех — справа добраахвотная ...Гэта як быццам аксіёма, аднак і тут не абыходзіцца без выключэнняў. Што гэта сапраўды так, з малых гадоў пераканаўся і Яраслаў Пархута. Пачалося ўсё з таго, як ён неяк пажартаваў на ўроку, а настаўнік па-свойму зразумеў гэту дасціпнасць і прапанаваў пакінуць клас. Праўда, ва універсітэце, дзе яму неўзабаве давялося вучыцца, жылося крыху «вальней».

Лягчэй было, калі працаваў у рэдакцыях раённых газет. Тут ужо «емейся» колькі хочаш, толькі матэрыял своечасова ў нумар рыхтуй. І ўжо зусім вольна стала ў часопісе «Вожык», дзе ў апошнія гады Я. Пархута працуе рэдактарам аддзела фельетонаў.

Але ж нездарма кажуць — пусці толькі шчупака ў раку... Я. Пархута так пачаў смяяцца, што многім сапраўды стала не да смеху. А смех—справа добраахвотная: пачалі скардзіцца «пакрыўджаныя».

Параіліся ў рэдакцыі, што рабіць далей і аднагалосна на адной з рэдкалегій вырашылі Я. Пархуту «пакараць». Маўляў, паглядзім, як ты засмяешся, калі фельетончыкі твае, гумарэскі, апавяданні асобнай кніжкай выдадзім. Сяброў новых паспрабуй знайдзі, а старыя...

На ўсё гэта аўтар толькі ветліва ўсміхнуўся, калі ўбачыў свой зборнік «Мудрая цялушка» ў чарговым выпуску «Бібліятэчкі «Вожыка», бо не паспеле кніжка з друку выйсці, як у Я. Пархуты з'явілася шмат добрых сяброў-чытачоў

В. САЕНКА.

ФРАЗЫ

Калі ў начальніка няма пачуцця гумару, то падначаленым яно таксама не патрэбна.

Іншы раз для таго, каб выйсці ў людзі, трэба ведаць, куды перад гэтым увайсці.

Калі ваш муж за сталом у рот нічога не бярэ, то ўпаўне верагодна, што ён ужо... набраўся.

Ул. ДАНІЛАЎ.

Працы з яго імем прыеліся. Трэба было нешта рабіць — прыдумаў псеўданім.

Д. НАХАМКЕС.

Без слоў.

Малюнкі М. ШЫШЛОВА.

СУСТРЭЧЫ ПОШУКІ АДКРЫЦЦІ.

ПАДАРУНКІ АСЕЦІНСКІХ СЯБРОЎ

•

НОВАЯ ПРАГРАМА НА МАНЕЖЫ

•

ЗНАХОДКА КРАЯЗНАЎЦЫ

На мове Хетагурава

Асецінскі паэт Коста Маргіты зазначыў:

Могуць вершы з сэрцам
гаварыць,
Свет увесь перад табой
адчыняць.
Могуць вершы крылы
падарыць,
Несці да блакітных далячыняў.

Прадстаўніча сучасныя паэты Паўднёвай Асеціі загаварылі з беларускім чытачом у 1975 годзе, калі выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў серыі «Паэзія народаў СССР» выпусціла зборнік «Трубіць алень» у перакладзе Г. Кляўко. І нашы каўказскія сябры не засталіся ў даўгу.

Сёлета ў паўднёва-асецінскім выдавецтве «Ірыстон» выйшла своеасаблівая анталогія беларускай паэзіі. Творы сарака двух нашых аўтараў сустрэліся ў кнізе, якая называецца «Песня, абпаленая вайной». Беларускае мастацкае слова загучала на мове Коста Хетагурава — класіка асецінскай літаратуры.

Зборнік адкрываюць паэтычныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, К. Буйло, П. Глебкі, М. Лужаніна, А. Русецкага, А. Бялевіча, А. Астрэйкі, А. Вялюгіна і іншых. Шырока ў зборніку прадстаўлены паэты сярэдняга і малодшага пакаленняў.

Прадмову да кнігі напісаў Н. Гілевіч.

В. САВІЧ.

ПУЛЬС НЕСПАКОЙНАГА ЧАСУ

«Апавяданні аб жывых героях» — такі падзагаловак кнігі Мікалая Родзічава «Не ближний свет» носіць не выпадкова. У зборніку, што выйшаў у выдавецтве «Современник» у серыі «Новинки «Современника», змешчаны мастацка-дакументальныя апавяданні пра герояў дзевятай пяцігодкі.

Пісьменнік з натхненнем расказвае пра тых, з кім меў магчымасць сустракацца ў апошнія гады ў час творчых камандзіровак. Ён піша пра перадавікоў вытворчасці Маскоўскага металургічнага завода, пра канструктараў, якія ствараюць новыя машыны, пагранічнікаў, што днём і ноччу абараняюць мірны спакой савецкіх людзей.

Асобны раздзел кнігі прысвечаны жодзінскім аўтамабілебудаўнікам. Называецца ён «Отец богатырей». Аўтар расказвае пра выпрабавальніка Мікалая Чарнапійскага, зваршчыка Сцяпана Курсевіча, тэхніка Анатоля Сініцына, інжынера-даследчыка Юрыя Малышкіна і іншых. У нарысе ўзнімаюцца надзённыя пытанні, звязаныя з сённяшнім жыццём завода і яго далейшым сацыяльным развіццём.

«ЛіМ» у тэатральна-мастацкім інстытуце

Вечарам, пасля заняткаў, у адной з самых вялікіх аўдыторый сабраліся студэнты і выкладчыкі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута на канферэнцыю чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва».

Канферэнцыю адкрыў сакратар партбюро інстытута А. Казлоўскі. Супрацоўнікі рэдакцыі — загадчык аддзела культуры М. Замскі і карэспандэнт аддзела выяўленчага мастацтва Р. Бакуновіч расказалі прысутным аб тым, як асвятляе газета літаратурнае, мастацкае і культурнае жыццё рэспублікі, над якімі праблемамі працуе калектыў рэдакцыі, аб яго творчых планах.

Потым завязалася ажыўленая гаворка пра здабыткі і недахопы газеты, пра тое, якімі яе выступленнямі аўдыторыя задаволена, якія б матэрыялы хацела ўбачыць.

Старшы выкладчык Я. Громаў выказаў пажаданне, каб на старонках газеты больш пісалася аб выхаванні творчай моладзі. Яго думку падтрымаў студэнт Р. Сітніца.

Студэнты У. Мурашка і Л. Дарбінян прапанавалі прыцягваць да афармлення газеты маладых мастакоў, даваць больш ілюстрацый.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі канферэнцыі выступленні паэтаў Р. Барадуліна і В. Тараса, якія прачыталі вершы, расказалі пра сваю літаратурную працу, адказалі на шматлікія пытанні прысутных.

А. КІМ.

ДЗЯКУЙ ТАБЕ, ЦЫРК!

Мінчане, відаць, ужо звыкліся з тым, што праграмы, якія ідуць на арэне сталічнага цырка, амаль заўжды складаюцца з нумароў высокага класа. Можна ўпэўнена сказаць, што толькі за апошнія два-тры сезоны мы змаглі ўбачыць ледзь не ўсё лепшае, што мае і чым ганарыцца савецкі цырк.

Вось і сёлета. Не паспела паехаць у турнэ па Францыі і Бельгіі праграма «Зоркі манежа», гастролі якой на працягу двух месяцаў адбываліся ў Мінску, яшчэ свежыя ў памяці нумары выдатных майстроў манежа, якія ўваходзілі ў яе склад, а афішы зноў запрашаюць на навіну. «Народжаныя цыркам» — так называецца цяперашняя праграма. Калі параўноўваць яе з папярэдняй, не цяжка адзначыць, што на гэты раз аматары цырка не ўбачаць (за выключэннем двух-трох) знаёмых і агульнавядомых аэтыстаў. Але, здаецца, ад гэтага новая праграма нікольні не прайграе, а, можа, нават і выйграе, бо сустрэча з новым заўсёды прыемная.

У двух аддзяленнях даволі вялікай праграмы багата прадстаўлены бадай, усе цыркавыя жанры. Разнастайнасць і колькасць нумароў не ідзе тут за кошт якасці. Кожнае выступленне ў праграме «Народжаныя цыркам» своеасаблівае і цікавае.

Паветраныя нумары нават знаўцы адносяць да ліку найбольш рамантычнага цыркавога жанру. Як грацыёзныя белыя матылі, якія зусім згубілі пачуццё зямнога прыцягнення, лётаюць пад самым купалам дзяўчаты з калектыву пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі РСФСР Антаніны Хазавай. Лёгкасць, з якой яны выконваюць складанейшыя трукі, прымушае забыцца пра тую вышыню, на якой актрысы знаходзяцца. Вельмі ўражвае нумар «Палёт на ракеце» ў выкананні дыпламантаў усесаюзнага конкурсу новых твораў цыркавога мастацтва Эмы і Марыі Біруковых. «Які прыгожы чалавек, колькі ў ім мужнасці, спрыту, агню!» — зноў і зноў думаюць гледачы, калі выконваецца гэты цудоўны нумар. Поўны сілы, дынамізму, энергіі паветраны дуэт Людмілы і Аркадзя Сакаловых (праўда, адчуваецца, што яшчэ трэба папрацаваць, каб павялічыць тэмп і запоўніць іграўымі момантамі паўзы). Больш па-рэжысёрску прадуманым выглядае дынамічны жывы нумар «Камічны батуд» у выкананні сям'і Маскалёвых.

Радуюць усіх, хто збіраецца ў амфітэатры, «Музычныя эксцэнтрыкі» з удзелам мядзведзяў, дрэсіраваных братамі Біруковымі. Мядзведзі не толькі, як гэта часта здараецца, «прысутнічаюць» у нумары, — яны актыўна ўдзельнічаюць у вясёлай і дасціпнай гульні, якую наладзілі ў манежы артысты. Нязграбныя мішкі «нібы забыліся», што ім «належыць» быць нязграбнымі: такія яны рухавыя і так жвава танцуюць, іграюць на музычных інструментах, быццам удзельнічаюць у нейкім спаборніцтве з людзьмі.

Пра нумар з дрэсіраванымі сабачкамі Яны Кудраўцавай можна было б і не гаварыць, бо ён вельмі ж блізкі да дзесяткаў такіх жа. Нумар у многім выйграў бы, калі б замест шаблоннага «сабачага футболу» было ўнесена нешта новае, своеасаблівае. Менавіта пошук, імкненне знайсці штосьці адметнае, арыгінальнае вылучае выступленні майстроў манежа. У якасці прыкладу такога па-сапраўднаму таленавітага нумару, дзе ўсё — ад выхаду артыстаў на манеж да фінальных пасажаў — прадумана, можа служыць выступленне народных артыстаў Дагестанскай ССР Магамедавых («Усходняя рапсодыя»). І справа тут не толькі ў складанейшых трунках, якія выконваюць на канаце артысты: вабіць лёгкасць, грацыёзнасць, нават элегантнасць, з якой гэтыя трукі выконваюцца. «Усходняя рапсодыя» — нумар, у якім ёсць і жарт, і лірызм, і летуценнасць. Усё гэта надае выступленню артыстаў Дагестана непаўторны характар.

Амаль усё другое аддзяленне займае атракцыён Барыса Бірукова «Берберскія львы». Атракцыён гэты яшчэ толькі крышталізуецца, бо арганізаваны нядаўна, але і цяпер яго можна разглядаць, як самастойны і дастаткова своеасаблівы твор цыркавога мастацтва з арыгінальнай падачай кожнага фрагмента.

За кулісамі цырка вісіць насценная газета, яную пакінулі пасля сябе артысты папярэдняй праграмы «Зоркі манежа». Адзін з артыкулаў, аўтар якога заслужаны артыст Армянскай ССР Р. Акапян, мае назву: «Дзякуй табе, Мінскі цырк!». Ёсць у ім такія радкі: «Хочацца ад усяго сэрца падзякаваць дырэкцыю, партбюро, аркестр, электрацэх, уніформу — увесь персанал цырка за іх вялікую ўвагу і дапамогу. Мы, артысты, заўжды рады працаваць у такім цудоўным цырку». Гэта сказана артыстам, ды толькі пры невялікай перапрацоўцы, такія ж словы могуць належаць любому з тых тысяч і тысяч гледачоў, якім сталічны манеж дае радасць сустрэчы з любімым мастацтвам. Дзякуй, табе, цырк!

Р. АЛЯКСАНДРАЎ.

Музычныя эксцэнтрыкі з мядзведзямі Барыс і Стуар Біруковы.
Фота А. ЛАБАДЫ.

ДОМ НА ЎСПЕНСКАЙ ГОРЦЫ

У час Айчыннай вайны 1812 года адразу пасля вызвалення Віцебска ад французаў у горадзе быў створаны буйны ваенны шпіталь. З-за адсутнасці ў Віцебску адпаведнага памяшкання, ён быў размешчаны на другім паверсе губернскай гімназіі. У 1813 годзе ў шпіталі з'явілася новая партыя параненых. Сярод іх быў адзін вельмі прыгожы і стройны афіцэр. Звалі гэтага чалавека Юрый Пятровіч Лермантаў. Яму суджана было стаць бацькам вялікага рускага паэта.

Ю.П. Лермантаў аказаўся ў Віцебску ў знамянальныя для яго дні — у гэты час ён быў жаніхом Марыі Міхайлаўны Арсеньевай. Закончыўшы кадэцкі корпус, Юрый Пятровіч пайшоў на ваенную службу, але не дасягнуўшы вялікага поспеху ў ёй, у 1811 годзе падаў у адстаўку. Пасяліўшыся ў глухой вёсачцы Кропатаўцы, якая дасталася яму ў спадчыну ад бацькі, Юрый Пятровіч часам заязджаў у госці да суседзяў па маёнтку. Аднойчы тут ён пазнаёміўся з 16-гадовай Машай Арсеньевай, якая гасціла ў сваякоў бацькі. Нясмелая і сарамлівая, яна з першага погляду занахалася ў 24-гадовага адстаўнога капітана, які пакарыў яе сваімі прыгожымі свецкімі манерамі і ваеннай выпраўкай. У Тарханы, дзе Марыя Міхайлаўна пражывала пастаянна са сваёй маці (бабуляй паэта), яна вярнулася ўжо нявестай. Вяселле было прызначана на лета 1812 года, але не адбылося — пачалася Айчынная вайна. Ахоплены ўсеагульным патрыятычным пачуццём, капітан Лермантаў ідзе ў народнае апалчэнне. Пра ваенны лёс Юрыя Пятровіча вядома вельмі мала. Відаць, ён прымаў ўдзел у бітвах не толькі на рускай зямлі, але і ў заграніччных паходах рускай арміі. Менавіта гэтым і тлумачыцца яго прысутнасць у Віцебскім ваенным шпіталі ў канцы 1813 года. Пасля выздараўлення Юрый Пятровіч з Віцебска паехаў да сваёй нявесты, і ў пачатку 1814 года адбылося іх вяселле.

Будынак, дзе з 1808 па 1876 гады знаходзілася Віцебская александраўская гімназія, з якой звязана знаходжанне ў нашым горадзе Ю. П. Лермантава, захаваўся да нашых дзён. Ён быў пабудаваны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя амаль адначасова з Успенскім саборам, які знаходзіўся непадалёк. У 1799 годзе гэты будынак быў перададзены свецкім уладам і з 1804 года тут размяшчалася народнае вучылішча, а з 1808 года — гімназія.

А. ПАДЛІПСКІ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня Выдавецтва ЦК КП Беларусі

Індэкс 63856 АТ 01538

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-83, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН,
Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ,
Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ,
Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА,
Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара),
Уладзімір НЯФЁД, Віктар ПРАТАСЕНЯ,
Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ,
Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар),
Рыгор ШЫРМА.